№ 34 (392) 17 верасьня 2004 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

## Навуковая сэнсацыя

Менскі матэматык Віктар Карпаў вырашыў праблему Гольдбаха—Эйлера.

старонка 9



## Дзяржынава, 11 верасьня

На радзіме Жалезнага Фэлікса ў дзень ягонага нараджэньня.

старонка 8

## Уладзімер Караткевіч

на абароце часу. Успаміны Навума Цыпіса.

старонка 15



КАЛЁНКА РЭДАКТАРА

### Лукашэнка можа страціць усё

Трэба аддаць належнае кіраўніку дзяржавы. У адрозьненьне ад папярэдніх рэфэрэндумаў, яму хапіла сумленьня не спалучаць з цэнтральным пытаньнем рознага хлуду. 10 гадоў і яму не прайшлі без навукі, і ён вырас разам з усёй нацыяй.

17 кастрычніка мы станем сьведкамі, а нехта нават і ўдзельнікам рэдкага моманту ў палітыцы. Апазыцыя, абвясьціўшы аб акцыі 18 кастрычніка, паказвае: яна гатовая той момант славіць, яна не абмяжоўваецца ламаньнем галавы, як бы прызнаць рэфэрэндум незаконным.

**Старонка 2.**

ВЫБАРЫ-2004

### Рэфэрэндум дадаў напругі

Абвяшчэньне рэфэрэндуму зьмяніла характар выбарчай кампаніі. Дэмакратычныя кандыдаты вылучылі супольны дэвіз «Скажы Лукашэнку НЕ!». З выбаркамаў даходзяць весткі, што ўлады рыхтуюць масавую нерэгістрацыю кандыдатаў ад апазыцыі.

На думку лідэра АГП Анатоля Лябедзькі, рэфэрэндум робіцца прыярытэтнай задачай.

**Старонка 10.**

### Дык падпісвайцеся на чацьверты квартал!

Да 20 верасьня падоўжаная падпіска на чацьверты квартал. «Наша Ніва» — незалежная крыніца інфармацыі і грунтоўны аналітык беларускага жыцьця на 16 старонках без чужога слова штотыдзень. Падпісны індэкс 63125. Цана падпіскі на месяц — 2700 рублёў на поштах або 1500 рублёў на шапікі «Белсаюздруку» ў Менску.

# Не кажы «так»




**Гэтая задума прыйшла да мяне нечакана. У рукі трапіў здымак 50-х гадоў. Прапаганда, ці, як сказаў бы дарагі наш Рыгор Барадулін, прапаганьба мела на мэце паказаць, зь якім энтузіязмам галасавалі вяскоўцы за блёк беспартыйных і камуністаў. Дзеля гэтай мэты нейкі шустры фотакарэспандэнт прыехаў у мястэчка Лужкі (Заходняя Беларусь) на выбарчы ўчастак, расставіў, як яму захацелася, актывістаў — і манумэнтальны твор пад назвай «Усе на выбары» абышоў амаль усе старонкі тагачаснай прэсы. І сёньня ў Лужках жывуць людзі, якія пазнаюць тых, хто на гэтым здымку выконваў ролю статыстаў.**

**Дык што ж зьмянілася за гэты час? Ці пачувае сябе чалавек вольным і незалежным ад мясцовай улады, якая дыктавала і дыктуе, каго выкрэсьліваць у бюлетэні, а каго пакідаць? Многія думаюць, што ад яго асабіста нічога ня зьменіцца. Вяскоўцы адбываюць выбары, як радоўку. Пра гэткую выбарчую кампанію тады гаварылі ёмка: галасуй не галасуй, усё роўна палучыш х...**

**Але як бы там ні было, часы зьмяніліся. За вокнамі — XXI ст. Нягледзячы ні на што, другая Беларусь праз забароны і паклёпы сьвежым паветрам урываецца ў наша жыцьцё. Час праветрыць памяшканьне, вымесьці сьмецьце з роднае хаты. Сваёй задумай нешта стварыць на аснове гэтага здымку я падзяліўся з Рыгорам Барадуліным. Крыху падумаўшы, ён прапанаваў назву для карціны: «Будзем — калі разбудзім!»**

**Алесь Марачкін**

# Пуцін запаволенага дзеяньня

Віталь Сіліцкі

**Расея губляе свой фэдэратыўны характар. У шматнацыянальнай і поліканфэсійнай Расеі гэта фактычна паварот да імпэрскага ладу палітычнага жыцьця.**

Самай вялікай хлусьнёй Уладзімера Пуціна было цьверджаньне, нібыта яго палітыка прывядзе (ці, як яшчэ некалькі месяцаў таму гаварылася, ужо прывяла) да перамогі над тэрарызмам і міру ў Чачэніі. Пасьля трагедыі ў Бэслане хлусіць больш немагчыма. Апошнія спробы — замоўчваньне маштабу ды абставін бойні ў асецінскай школе — патанулі ў інфармацыйным патоку. Высьветлілася, што «мачыць у сарціры» і абараняць сваіх грамадзян — дзьве розныя і несумяшчальныя рэчы.

Іншая хлусьня, аднак, яшчэ далёкая ад разьвянчаньня, нават носіць характар калектыўнага самападману.

Па-першае, Расея лёгка паверыла ў тое, што ёй супрацьстаіць міжнародны тэрарызм, заплюшваючы вочы на чачэнскі (а цяпер яшчэ і інгускі) характар узброенага супраціву на Каўказе. Ваяваць прыходзіцца амаль з цэлым народам (кажу аб гэтым, не надаючы ніякай вартаснай ацэнкі слову «народ»: забойства дзяцей — гэта злачынства, нават калі б за яго прагаласавалі ўсе; гэта, дарэчы, адносіцца і да тысяч чачэнскіх дзяцей, што загінулі з 1994 г.)

Па-другое, ані ўлада, ані грамадзтва яшчэ не гатовыя прызнацца самі сабе, што бездапаможнасьць Расеі вынікае з самой будовы і аўтарытарнага характару яе ўлады, найперш сілавых структур. Яе безадказнасьць перад грамадзтвам і карумпаванасьць робяць закладнікамі ўсё насельніцтва краіны.

**Працяг на старонцы 10.**

## 1939—2004

Ужо 65 гадоў беларусы жывуць у адной дзяржаве. Праўда, без старой сталіцы Вільні. 17 верасьня — дзень яднаньня і страты.

## З Новым годам!

Ёсьць нагода пачаць сьвяткаваньне Новага году. Увечары 15 верасьня пачаўся габрэйскі Новы год — Рош-Хашана (у перакладзе «галава году»). У навагоднюю ноч у габрэяў прынята есьці яблыкі, мачаючы іх у мёд, цёртую моркву і гранат, бо гранат мае 613 зернетак — столькі запаветаў даў Бог юдэям.

# Лукашэнка можа страціць усё

Працяг са старонкі 1.

Я ўсюды гавару па-беларуску, і часта людзі рады разгаварыцца на мове. Проста таму, што такую магчымасьць у сталіцы яны маюць нячаста.

На наступны дзень па выступе прэзыдэнта мне давялося завітаць у паліклініку па даведку для наведваньня басэйну — пасьля пераабраньня ў ПЭН-цэнтры зьявілася трохі вольнага часу. І пакуль мяне запісвалі ў чатыры рэгістры, завязалася размова пра абвешчаны плебісцыт.

Сястрычка: «Што мог, тое зрабіў, цяпер хай бы й другому даў».

Доктар: «Гэты раз ён павінен трымацца жалезна. Калі ён прайграе цяпер, дык, бадай, і ўлады не захавае. Тут усё канкрэтна. Гэта не 1996-ы і не 1999-ы».

Сястрычка: «Пра які вы пройгрыш гаворыце? Напішуць яму зноў 70%! Нават 53 не напішаш — засьмяюць, ніхто не паверыць».

Доктар: «Напісаць не паможа. Людзі ж будуць ведаць».

Дарэчы, з даведкай мяне чакаў сюрпрыз. За шматочак паперы з кангеніяльным штампам «Агледжаны на пэдыкулёз» — цяпер трэба плаціць. Такая вось бясплатная мэдыцына і клопат пра фізкультуру. У чарговы раз згадаў клясыка: і як ні кляў я гэту п'яўку, а мусіў даць рубель за спраўку. Назваць п'яўку па прозьвішчы не магу, бо засудзяць, ды вы і так ведаеце, каго я маю на ўвазе.

Вось што думаюць пра абвешчаны рэфэрэндум людзі.

Прапанаваная зьмена ў Канстытуцыю ўскладняе мэханізм дэмакратычнага абнаўленьня ўлады — якому беларусы абавязаны пазытыўным пераменам 90-х, выхадам з эканамічнага крызысу, нізкай карупцыяй. Таму яна непрымальная, і «НН» не хавае свайго адмоўнага стаўленьня да яе.

Сам факт рэфэрэндуму выяўляе слабасьць рэжыму. Замены Лукашэнку няма, безь яго рэжым ня здольны функцыянаваць. Уласна, няма сыстэмы, ёсьць рэжым. Прычым якая псыхічная нагрузка на чалавека! Выйграе Лукашэнка ў кастрычніку — яму прыйдзецца даказваць тое самае ў 2006 г., толькі яшчэ ў супраць рэальнай альтэрнатывы.

Як Лукашэнка ні цягнуў, а такі мусіў, ліхаманкава хапаючыся за нагоду тэрактаў у Расеі, абвясьціць рэфэрэндум у сытуацыі, калі ён разгромна прайграе ў розумах выбарцаў. Паводле зьвестак сацыёлягаў, большасьць грамадзянаў маюць намер адказаць «не» або праігнараваць рэфэрэндум.

У выпадку пройгрышу Лукашэнку нядоўга застанецца цешыцца новым «Боінгам». Ні Захад, ні Ўсход, ні новаабраны парлямэнт на ратунак не пабягуць.

А калі выбарцаў гвалтам зьмусяць або проста запішуць у пратаколах ад балды 70%? Нікога гэта не падмане. Не былі б мы беларусамі, калі празь дзень пра ўсе фальшэрствы ня стала вядома ад самых сябровў камісій і міліцыянтаў.

Улада легітымізуецца дваяка — легітымнасьцю юрыдычнай, адпаведнасьцю літары закону і легітымнасьцю ў розумах людзей, адпаведнасьцю прынятым уяўленьням пра справядлівасьць і законнасьць улады. Апазыцыя надта зважала на першую, але хто, калі ня сам Лукашэнка, даказаў, што галоўнае — другое?

Калі 18 кастрычніка нацыя зразумее падман, Лукашэнку прыйдзецца крута. Любая нечаканасьць можа зьмяніць сытуацыю.

Акадэмік Вайтовіч прызнаецца ў «Arche» — гэта будзе надрукавана ў чарговым нумары, — што галасаваў у 2001 г. супраць Лукашэнкі. Такіх Вайтовічаў на вяршыні ўлады многа. Гэта Чыгір у 1996-м пайшоў у адстаўку ў знак пратэсту. Іншы зможа і цьвёрдасьць праявіць, застаўшыся на пасадзе. Карацей, ідэя «Хай бы другому даў» можа знайсьці нечаканых прыхільнікаў.

Лукашэнка пунктуальна выконвае напрацоўкі паліттэхнолягаў. І пытаньне замаскаваў, і рыторыку падфарбаваў. Апазыцыя загнана ў падполье і выбарцу не знаёмая. Нібыта апазыцыйныя выданьні прапагандуюць нявер'е ў апазыцыю. Дзяржаўныя СМІ пасьпяхова вярнуліся на ўзровень 1973 году. Прэзыдэнту няма на што скардзіцца. Ад гэтага кампаніі не стае інтрыгі. «Ад дабра дабра не шукаюць» — вось і ўся катрынка. Лукашэнка бяжыць па дарожцы без суперніка. Ня стаць кумірам таму, хто на арэне змагаецца ў адзіноце. Калі ворага няма, замест яго выстаўляюць пудзіла — пачалі з тэлесэрыялаў пра апазыцыю.

Ня варта ашуквацца наконт адпорнасьці грамадзтва на абалваньваньне: галасавалі ж выбарцы і за папатаньне роднае мовы, і супраць кантролю за дзяржаўнымі грашыма. Ня варта цешыцца ілюзіямі наконт здольнасьці разагнанае апазыцыі прынесьці свае ідэі ў кожную хату. Але цяпер супраць Лукашэнкі выступаюць нябачныя гульцы, мацнейшыя за ўнутраных і замежных ворагаў. Гэта дакука, абывацельская любоў да перамен, а таксама раскоша. Пры такім росьце дабрабыту, як цяпер, людзі ня маюць больш патрэбы ў крызысным кіраўніку, якім па тэмпарамэнце ёсьць Лукашэнка. Супраць Лукашэнкі гуляе сам час, у якога шчэ ніхто не выйграваў.

У кастрычніку Лукашэнку чакае самае рызыкоўнае прадпрыемства за 10 гадоў. …І нашчадкі напішуць на камені: «Ён любіў уладу больш за Айчыну і жыцьцё».

**Андрэй Дынько**

СЬМЕХ




**Сам ты сасуд! Старонка 16.**

## Беларускі калегіюм

Прапануе дадатковае навучаньне па спэцыяльнасьцях:
— журналістыка;
— найноўшая гісторыя;
— філязофія/літаратура.

Запрашаюцца студэнты старшых курсаў альбо асобы з вышэйшай адукацыяй. У асобных выпадках прымаюцца й студэнты малодшых курсаў. Навучэнцам БК можа быць толькі той, хто на час навучаньня пражывае ў Менску.

Навучальныя праграмы БК арыентаваныя на выкладаньне найноўшых фрагмэнтаў сучасных ведаў і не дублююць існых праграм дзяржаўных і недзяржаўных унівэрсытэтаў. Сэртыфікат Калегіюму не замяняе дыплёму аб вышэйшай адукацыі. Навучаньне ў БК бясплатнае.

Пачатак заняткаў — з 1 кастрычніка 2004 г.

Запіс на сумоў'е — да 24 верасьня. Абавязковай умовай запрашэньня на сумоўе зьяўляецца падача да пазначанай вышэй даты аднаго альбо некалькіх уласных тэкстаў памерам ня меней як 5000 знакаў. Тэкстамі лічацца як друкаваныя, так і недрукаваныя матэрыялы (журналіцкія, паэтычныя ці празаічныя тэксты, тэксты дасьледчыцкага, рэфэратыўнага ці іншага характару, эсэ на вольна абраную тэму і г.д.). Фармуляваная ўмова ня тычыцца спэцыялізацыі «Найноўшая гісторыя».

Даведкі і запіс праз тэл. 220-29-75 з 14.00 да 18.00 штодня акрамя суботы і нядзелі. Дадатковую інфармацыю пра БК можна знайсьці на сайце http//bk.baj.ru.

## Старое Палесьсе

**Калі параўноўваеш духоўную культуру старога і новага Палесься, заўважаеш нязводнае ў жыцьці палешукоў: атамізаванасьць вёскі і масавае бытавое зладзейства. Чытачоў уразіць у гэтай кнізе і багацьце «ненарматыўнае» лексыкі, што існавала ў беларускай мове, пакуль зь ёю не папрацавалі майстры яе «ўшляхотненьня».**

**Старонка 6.**

## Іншадумцаў выганяюць і звальняюць

6 верасьня з Акадэміі МУС выключылі актывіста «Маладога фронту» **Сержука Савіча**, які ўдзельнічаў улетку ў акцыі пратэсту супраць разьмяшчэньня расейскай радыёлякацыйнай станцыі пад Ганцавічамі.

На пачатку верасьня з працы звольнены выпускнікі ўдзельнікі вылучэнцы ў кандыдаты ад ПБНФ настаўнік гісторыі **Аляксей Сюдак** (Вялейскі раён), пэдагог-псыхоляг **Вольга Лагвіновіч** (Маладэчна), а таксама сябар ініцыятыўнай групы З.Салаўёва энэргетык **Мікола Пратасевіч** (Вушацкі раён), звальненьне пагражае **Алесю Меху** (Кобрынь).

Старшыня Агульнарэспубліканскага страйкаму прадпрымальнікаў **Валер Леванеўскі** і ягоны намесьнік **Аляксандар Васільеў** 7 верасьня асуджаны на два гады калёніі агульнага рэжыму кожны за абразу гонару і годнасьці прэзыдэнта і арганізацыю масавай вулічнай акцыі, 9 верасьня Леванеўскі абвясьціў галадоўку, бо яму няма дзе спаць у камэры.

**Хроніка супраціву — старонка 11.**

ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

### Песьня і паэзія ў Горадні

28 верасьня а 18-й у майстэрні мастака Зьмітра Іваноўскага (вул.Будзённага, 48а) адбудзецца вечарына песьні й паэзіі, прысьвечаная 15-годзьдзю Таварыства беларускай мовы.

### «Індыга», «Тарпач» у Баранавічах

18 верасьня ў клюбе «New Sound Land» у Баранавічах адбудзецца выступ гуртоў «Indiga» і «Тарпач», пераможцаў «Басовішча».

### Пратэст пратэстантаў

У нядзелю 18 верасьня а 14-й хрысьціяне эвангельскіх цэркваў правядуць мітынг пратэсту на плошчы Бангалор супраць Закону аб свабодзе сумленьня.

IN MEMORIAM

## Алесь Асташонак

Адны жывуць розумам і таму ўспрымаюць жыцьцё як камэдыю. Другія жывуць пачуцьцямі, і для іх жыцьцёвы шлях — трагедыя. Алесь Асташонак належаў да другіх.

Мы называлі адзін аднаго сябрамі, і доўгі час у гэтым не было перабольшаньня.

З Алесем бывала ўдумна, бывала весела, бывала нясьпешна, але ніколі не бывала сумна.

Кім толькі ён ні працаваў — перакладчыкам у Альжыры, выхавальнікам у прафтэхвучэльні, выкладчыкам францускае мовы, рэдактарам упраўленьня тэатраў і музычных установаў, інспэктарам па працы з замежнымі студэнтамі, рэдактарам выдавецтва «Беларуская энцыклапэдыя» й рэдактарам часопісу «Крыніца», асыстэнтам псыхіятра й асыстэнтам нарколяга... Але на сваім месцы Алесь быў адно за пісьмовым сталом, дзе нараджаліся таленавітыя апавяданьні, «настроі», п'есы, кінасцэнары — рамантычна-ўзьнёслыя й брутальна-бязьлітасныя, але нязьменна інтэлектуальныя, псыхалягічна дакладныя, філязафічныя. А яшчэ ён перакладаў з францускай і ангельскай — максімы Ларошфуко, «Плянэту малпаў» П'ера Буля, «Востраў скарбаў» Стывэнсана...

Ён цікава й імкліва пачынаў. Прадмову да ягонай першай кнігі прозы «Фарбы душы» (1989) напісаў Алесь Адамовіч. Асташонка ўжо ведалі як аўтара пастаўленых у некалькіх тэатрах п'есаў «Іскры ўначы» і «Камэдыянт, ці Ўзьнёсласьць сумнае надзеі». «Камэдыянт» неўзабаве зьявіўся ў вэрсіі мастацкага тэлефільму, а іншы фільм паводле Алесевага сцэнару — «Сон» — атрымаў першую прэмію на міжнародным конкурсе ў Гішпаніі.

Ён быў ня з тых літаратараў, што хаваюцца пад пісьмовым сталом ад падзеяў у краіне. Ягонае адметнае аблічча памятаюць удзельнікі гістарычных «Дзядоў» 1988-га, дзе Асташонак апынуўся ў самым эпіцэнтры й потым доўга ачуньваў ад хрыбеталомнага ўдару прафэсіянала ў цывільным. Я быў сьведкам Алесевых пакутаў, бо пасьля тых падзеяў на мяне палявала міліцыя і дом Асташонка стаўся на некалькі тыдняў маім прытулкам.

Аднак нязьмерна цяжэйшымі для Алеся заўсёды былі пакуты душы, якая на ўсё жыцьцё засталася ў яго па-дзіцячаму даверлівай, наіўнай і безабароннай.

Аднойчы, начытаўшыся сьвежых газэтаў, ён прыйшоў у бар Дому літаратара і прапанаваў мне й астатнім прысутным абвясьціць бестэрміновую галадоўку пратэсту ў адказ на нейкую заяву прэм'ера Кебіча. Быў пачатак 1990-х, часы, якія цяпер шмат каму згадваюцца як багаславёныя.

Што б прапанаваў Алесь, начытаўшыся сёньняшніх газэтаў?

Але ён не чытаў іх. Амаль дзесяць гадоў таму ён мусіў пакінуць Беларусь. Зусім не з палітычных прычынаў, аднак без магчымасьці вяртаньня. Прынамсі так лічыў сам Асташонак.

Нітка лёсу небясьпечна напялася й зазьвінела.

Навіны з радзімы ня лекавалі душу. Апрача ўсяго іншага, у 1996-м у «Мастацкай літаратуры» спынілі даведзены да карэктуры другі зборнік Алесевай прозы. Новае, добранадзейнае кіраўніцтва выдавецтва насьцярожыла ўжо назва — «П'яная кніга, або Жоўты колер белага сьнегу». Ад кніг патрабавалася быць цьвярозымі, ад сьнегу — белым.

Мне няпроста ўявіць, як Асташонак жыў у савёй недалёкай эміграцыі. Ці то абставіны не дазвалялі прымаць сяброў, ці то ён баяўся такіх сустрэчаў, ашчаджаючы душу, бо ў нас, няхай і з прыгодамі, выходзілі кнігі, а ён адгукаўся толькі рэдкімі дзёньнікавымі запісамі й перакладамі.

Сёлета яму споўнілася пяцьдзясят. Дзень 7 верасьня стаў у ягоным жыцьці апошнім.

Я стаю ля акна, нібы герой апавяданьня, што дало назоў нявыдадзенай Алесевай кнізе, і ўяўляю, як недзе *там*, можа, зусім побач, ён, Алесь, таксама стаіць зараз ля акна і, магчыма, чуе, як я ціха прамаўляю ягонае ўлюбёнае: «Vita brevis, patria aeterna».

**Уладзімер Арлоў**

P.S. Пасьля крэмацыі прах Алеся Асташонка прывезены на радзіму і будзе пахаваны на Кальварыйскіх могілках у Менску.



«Ці ж думаў ты калі-небудзь, што ўсё вось так атрымаецца? Што будзе ранак — сьветлы, чысты, празрысты, што сонечна будзе на дварэ, што ўсё існае па-за жытлом тваім будзе клікаць цябе да жыцьця, сьляваць будзе... — а ты захутаешся з галавою ў коўдру й будзеш пакутаваць ад наступу дня, будзеш маліць, каб ён затрымаўся ў сваёй дарозе, будзеш уздрыгваць ад аднаго ўжо сьвятла, бо ня толькі не пацягнешся да ўсяго таго, што абяцае табе абуджэньне жыцьця, але й будзеш баяцца гэтага абуджэньня — і свайго, і ўсяго сьвету, зь якога ты выпадаеш...»

*Алесь Асташонак*
**«Жоўты колер белага сьнегу»**



Маўчаньнем сустрэлі абвяшчэньне рэфэрэндуму менчукі, што сабраліся на антытэрарыстычны мітынг 7 верасьня. Лукашэнка зьявiнуўся да іх проста зь вялізнага манітора, усталяванага на Кастрычніцкім пляцы. Праз некалькі хвілінаў маўчаньне разарвуць выгукі «Ганьба!» і АМАП кінецца вылоўліваць незадаволеных.

PHOTO.BYMEDIA.NET

# Асноўны інстынкт-3

Віталь Тарас

**Незарэгістраваныя кааліцыі працягваюць высьвятляць адносіны паміж сабой — дзе й каго трэба вылучаць, каго падтрымліваць, БТ прадаўжае паліваць усю апазыцыю брудам. Усё гэта можна было б назваць домам вар’ятаў, калі яно б ня сталася звыклай руцінай.**

Беларускі рэфэрэндум быў абвешчаны, як вядома, на другі дзень жалобы ў Расеі. А на 9-ы дзень пасьля крывавай трагедыі ў Беслане, 11 верасьня (!) у Менску адбылося сьвята гораду. Адныя ўбачылі ў гэтым тонкі псыхалягічны разьлік, другія — грубы палітычны выклік. Шмат увагі надавалася той акалічнасьці, што беларускія ўлады пайшлі на падман, калі склікалі людзей на Кастрычніцкую плошчу ў Менску нібыта на мітынг салідарнасьці з ахвярамі тэракту ў Расеі, а паказалі ім выступ Лукашэнкі, тым самым стварыўшы ілюзію цікавасьці народных масаў да рэфэрэндуму.

Шмат увагі надавалася й таму, як будуць успрыняты падобныя маніпуляцыі ў Крамлі ды ў Вашынгтоне. Адным словам, рэакцыя незалежнай прэсы была звычайнай у такіх выпадках. (Гаварыць аб рэакцыі афіцыйнай прэсы ўвогуле няма сэнсу.) Цікавасьць журналістаў выклікаў ня столькі сам факт абвяшчэньня рэфэрэндуму (якога нібыта ўсе даўно чакалі), колькі спадарожныя акалічнасьці. Напрыклад, абвесьціць ці не абвесьціць Эўрапейскі Зьвяз санкцыі супраць вышэйшага кіраўніцтва Беларусі? І якімі могуць быць гэтыя санкцыі? Іншымі словамі, апазыцыю, а разам зь ёй і прэсу, сам факт абвяшчэньня рэфэрэндуму пакінуў амаль абыякавай. Гэтага кроку Лукашэнкі, відаць, так даўно чакалі (прынамсі, аб гэтым заяўляла апазыцыя), што, калі ён стаўся фактам, яму не надалі належнай увагі.

Праўда, сама фармулёўка ўсенароднага апытаньня: «Ці не пярэчыце Вы супраць удзелу Аляксандра Лукашэнкі ў прэзыдэнцкіх выбарах?» — дала падставы для сарказму («так, не пярэчу» — «не, не пярэчу»). А вось той факт, што прэзыдэнт парушыў прынятую зь ягонай жа ініцыятывы Канстытуцыю, выклікаў зусім млявыя эмоцыі. Урэшце, ня першы — трэці раз запар, пачынаючы з 1995 г., над Асноўным законам Беларусі ўчыняюць экзэкуцыю. І трэці раз запар грамадзкасьць — ня будзем ускладаць усю адказнасьць толькі на палітычную апазыцыю — задаецца рытарычным пытаньнем: хто нам дапаможа?

Нядаўна адзін расейскі навуковец-усходазнавец у інтэрвію «Новой газете» параўнаў сваё грамадзтва з дэбільным хлопчыкам, які ўвесь час паўтарае «У попа была собака…», не заўважаючы заганнага, у гэтым «вершы» закладзенага. Параўнаньне падаецца слушным ня толькі ў дачыненьні да расейскага грамадзтва. Айчынная апазыцыя, а разам зь ёй і «прагрэсіўная грамадзкасьць», рэгулярна трапляе на вуду ўлады, якая прапануе згуляць зь ёй у шахматы (г.зн. паўдзельнічаць у выбарах), а потым б’е шахматнай дошкай (указам) па галовах «грасмайстраў». У кожнага шахматыста, ня кажучы пра грасмайстра, павінна быць у галаве стратэгія гульні. У нашым выпадку гэтага, на жаль, не назіраецца.

Калі палітычныя партыі — ад сяброў кааліцыі «5+» да «Народнай Грамады» Статкевіча — прымалі рашэньне ўдзельнічаць у сёлетніх парлямэнцкіх выбарах, яны, відаць, зусім ня ўлічвалі магчымасьці рэфэрэндуму, хоць увесь час голасна гаварылі аб такой пагрозе. Бо ўдзел апазыцыі ў выбарах, якія адбудуцца паралельна з рэфэрэндумам, аўтаматычна надае яму выгляд легітымнасьці. Апазыцыя тым самым трапляе, мякка кажучы, у двухсэнсоўнае становішча.

Зразумела, тут няма размовы аб тактыцы й стратэгіі байкоту. Палітыкі ня могуць дазволіць сабе падобнай тактыкі, калі яны ня ўпэўнены ў падтрымцы значнай часткі грамадзтва. Размова ідзе пра тактыку наагул. Магчыма, яна ёсьць, але хаваецца ў сакрэце ад шырокай публікі? Звычайнаму чалавеку цяжка меркаваць, бо пасьля абвяшчэньня рэфэрэндуму ў паводзінах партый і грамадзкіх арганізацый не адбылося якіх-небудзь заўважных зьмен. Працягваецца збор подпісаў, ідзе вылучэньне патэнцыйных кандыдатаў у працоўных калектывах, кагосьці з дэмакратычных прэтэндэнтаў вылучаюць, большасьць топяць з дапамогай розных бюракратычных хітрыкаў. Незарэгістраваныя кааліцыі працягваюць высьвятляць адносіны паміж сабой — дзе й каго трэба вылучаць, каго падтрымліваць, БТ прадаўжае паліваць усю апазыцыю брудам.

Усё гэта можна было б назваць домам вар’ятаў, калі яно б ня сталася звыклай руцінай…

Кожная партыя можа мець сваю палітычную стратэгію. Гэтая стратэгія можа быць сакрэтнай ці нават суперсакрэтнай. Партыі могуць весьці закулісныя перамовы з хаўрусьнікамі, праціўнікамі, замежнымі ўрадамі, айчыннымі ўладамі, нават з д’яблам — з кім хочуць і як хочуць доўга. Але надыходзіць момант, калі ад партый патрабуецца публічная палітыка. Гэты «момант ісьціны» называецца выбарамі альбо рэфэрэндумам. Калі пасьля абвяшчэньня рэфэрэндуму ў публічнай стратэгіі партый нічога не мяняецца, узьнікае падазрэньне, што ў іх у запасе няма іншай стратэгіі. Значыцца, усе яны, без выключэньня, не былі гатовыя да такога павароту, нягледзячы на досьвед апошніх гадоў, і гэтым тлумачыцца ўсеагульная млявасьць, ці адсутнасьць адэкватнай рэакцыі на ініцыятыву прэзыдэнта.

У такім становішчы апазыцыя, і ўсё грамадзтва ўсьлед за ёй, нагадвае трусіка, які гатовы сам залезьці ў пашчу ўдава. Трусік адно толькі здольны больш-менш голасна віскатаць.

Але ёсьць і добрая навіна. Лукашэнка, упершыню за апошнія гады, зрабіў памылку. Ён пасьпяшаўся й раскрыў карты за два гады да прэзыдэнцкіх выбараў. (Зь іх назначэньнем магчымы, як кажуць, «варыянты», але сутнасьці справы гэта не мяняе). Надта ж карцела. Разьлік, калі тут увогуле можна гаварыць пра палітычны разьлік, а не пра біялягічную катэгорыю інстынкту, робіцца на тое, што грамадзяне будуць заставацца ў паралюшы страху ды гіпнозу, як тыя трусікі. І гэты разьлік апраўданы, калі ўсё зноў будзе разьвівацца паводле сцэнару, адпрацаванага за апошнія 8—10 год.

Не адчуваючы супраціву, кіраўнік дзяржавы страціў глебу пад нагамі й пачуцьце рэальнасьці. Для яго ў палітыцы засталася цяпер адзіная альтэрнатыва — усё альбо нічога. Калі зло вымушана адкрыта называць сябе злом і адкрыта дэманструе свае інтэнцыі, гэта ўжо само па сабе добра. Магчыма, дэмакратычная апазыцыя, а разам зь ёй і грамадзтва, усё даўно прайгралі. Але калі не спрабаваць змагацца да апошняга, дык як можна праверыць — ці так гэта насамрэч?

НАВІНЫ

## Скандал зь Несьцярэнкай

Алімпійская чэмпіёнка Юлія Несьцярэнка абвяргае чуткі пра допінг (кленбутэрол) у ейных тэстах на спаборніцтвах у Белай Падляскай два гады таму. Нібыта, да скандалу маглі спрычыніцца былыя польскія спонсары Ю.Несьцярэнкі, зь якімі яна больш не супрацоўнічае. Перагляду вынікаў Алімпіяды ня будзе ў кожным разе.

## КДБ не аддаў рэчаў

Суд адмовіў Міхалу Землякову ў яго патрабаваньнях да КДБ («НН» №33). Суд вырашыў, што бракуе доказаў таго, што рэчы належаць Юрасю Землякову, бо на іх прэтэндаваў і «краёвец» Андрэй Жарнасек. Рэчы далучаны да справы Жарнасека, абвешчанага, паводле слоў КДБіста, у вышук па лініі Інтэрполу.

## Дзьвінскае піва

У красавіку 2005 г. пачне працу беларуска-нямецкі «Дзьвінскі бровар» (Віцебск). Нямецкая кампанія «Эвімэкс» мае 39% акцыяў. Заснавальнікі зь беларускага боку — завод «Марка» (31%) і аблвыканкам (30%). Праектная магутнасьць — 2 млн дэкалітраў за год.

## $500 млн укладаюць у Менск

У квартале між вуліцамі Варвашэні, Кісялёва, Чырвонай на месцы тралейбуснага дэпо зьявіцца гандлёва-гатэльны комплекс. Расейская кампанія «Манолiюм-працэсынг», якая выйграла конкурс, пачала падрыхтоўчыя працы. Праект каштуе паўмільярда даляраў. Забудова пачнецца ў 2006-м.

## Шэсьце бяздомных студэнтаў

16 верасьня а 17.20 безінтэрнатныя студэнты сталіцы пастанавілі выйсьці на шэсьце. «Студэнты без прапіскі» маюць прайсьці з спальнікамі, каструлямі й лыжкамі ад вакзалу (прытулак бяздомных) побач фізфаку БДУ да Міністэрства адукацыі (вул.Савецкая, 9).

## Ланцуг неабыякавых

16 верасьня а 18-й на Кастрычніцкай плошчы Менску зьбіраюцца неабыякавыя на «Ланцуг» да 5-х угодкаў зьнікненьня В.Ганчара й А.Красоўскага.

## Сматрычэнка — кіраўнік ПЭНу

На сходзе Беларускага ПЭН-Цэнтру намесьнікам старшыні абраны Сяргей Сматрычэнка. Апрача таго, ПЭН вылучыў Вацлава Гаўла на Нобэлеўскую прэмію міру. За гэта прагаласавалі ўсе сябры ПЭНу, акрамя Ігара Бабкова.

## Жанчына — найлепшы касец

У Польшчы ў Бебжанскім нацыянальным парку адбыўся III чэмпіянат па касьбе касой. Ад Беларусі былі дзьве каманды — з суполкі «Ахова птушак Беларусі» і зь Бярэзінскага запаведніку. У спаборніцтве сярод жанчын галоўны прыз — чыгуннага «Вялікага касца» атрымала Натальля Парэчына з АПБ.

## Аўтаматы ў свабодным продажы

У панядзелак у ЗША скончылася 10-гадовая забарона на продаж аўтаматычнае зброі прыватным асобам, уведзеная Клінтанам пасьля масавага забойства супрацоўнікаў аднае юрыдычнае фірмы ў Сан-Францыска. Асабліва папулярныя ў ЗША — АК-47, «Узі», «FN-FAL», «Кольт AR-15» і паляўнічы варыянт «М-16».

## Казахская апазыцыя не байкатуе

Партыі «Ак жол», «Дэмакратычны выбар Казахстану» і Кампартыя ня будуць байкатаваць выбары ў ніжнюю палату парлямэнту — мажыліс. Яны, аднак, назвалі ўмовы выбараў несправядлівымі й заявілі, што не прызнаюць выбары, калі яны пройдуць несумленна.

## Развод Бэкхемаў?

Славутая сям’я Бэкхемаў на мяжы разводу: футбаліста і экс-вакалістку «Spice Girls» не ўтрымала разам нават цяжарнасьць Вікторыі. Жонка не даруе Дэвіду ягоных раманаў, Дэвід не даравае абраньніцы, што яна не схацела пакідаць Лёндан, калі ён падпісаў кантракт з «Рэалам». Але фармальна шлюб можа захавацца: «Бэкхемы» — гэта ня проста сям’я, а фірмовая марка зь мільённымі прыбыткамі.

**АВ; БелаПАН, радыё «Свабода»**

# Жнём і сеем, а ніяк не забагацеем

**Беларусь змалацiла рэкордны за апошняе дзесяцiгодзьдзе ўраджай. Паводле Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчаваньня, было сабрана больш як 7 мільёнаў тон хлеба. За часы незалежнасьці гэты вынік другі пасьля 1993 г. «Някепскі год!» — так ацэньвае Васіль Старавойтаў, легенда беларускай сельскай гаспадаркі. Праўда, гучныя заявы пра «найвялікшы ўраджай у гісторыі Беларусі» зусім не карэктныя. У камуністычным 1987-м паказчык быў 7804 тыс. тон, а ў незалежніцкім 1993-м — 7508 тыс. тон. Аднак нават пры такім ураджаі сельская гаспадарка застаецца нерэнтабэльнай.**


PHOTO.BYMEDIA.NET

Дынаміка збораў паказвае, што посьпех беларускіх вяскоўцаў залежыць найперш ад надвор’я, а не ад уменьня: у 1994—97 ішоў уздым (максымум — 6420 тыс. тон), у 1998—99 — рэзкі спад да 3600 тыс. тон, а пасьля — зноў пад’ём. Гэты год быў пятым у шэрагу тых, калі справы ідуць угару.

Зьмяняецца структура сельскай гаспадаркі. Калі ў сярэдзіне 90-х вядучай культурай было жыта, то летась — ячмень. Яго доля — амаль 30% ад унутранага валавога збору. Жыта летась складала 21% ад агульнага аб’ёму. Расьце доля ўрадлівага трытыкале (да 16,3% летась) і пшаніцы (у 2003-м — 14% ад валавога збору ва ўсіх гаспадарках краіны).

Адной з эканамічных прычын няроўнага разьвіцьця постсавецкай сельскай гаспадаркі Беларусі можна назваць мізэрныя заробкі вяскоўцаў. Заробак у гэтай галіне ніколі не перавышаў 49% ад агульнарэспубліканскага ўзроўню. І гэта нягледзячы на тое, што з 1985 да 2002 г. колькасьць занятых у аграсэктары людзей зьменшылася з 1081 да 472 тысяч чалавек. У два разы скарацілася колькасьць уношаных мінэральных угнаеньняў, у тры разы — арганічных. Колькасьць збожжаўборачных камбайнаў на 1000 га зьменшылася амаль удвая, трактароў — на траціну (дадзеныя Мінстату на 2002 г.).

Колькасьць загадаў зьверху расьце, але на справе яны выконваюцца хіба перад прыездам прэзыдэнта ў пэўную гаспадарку. Напрыклад, пакуль дзяржава патрабуе новай тэхнікі айчыннай вытворчасьці, старая замежная выходзіць са строю.

## Як будзем жыць?

Тры шляхі разглядаліся як магчымыя выхады з крызысу для беларускай сельскай гаспадаркі — дзяржаўная падтрымка галіны, фэрмэрства і замежныя інвэстыцыі. Найбольш зьдзейсьнены на сёньня — шлях дзяржаўнай падтрымкі. Да кожнай пасяўной кампаніі прымаюцца спэцыяльныя загады па забесьпячэньні гаспадарак тэхнікай, палівам. Пры ўмове аб’яднаньня зь нерэнтабэльнымі гаспадаркамі прадпрыемства атрымлівае падатковыя льготы на першы год пасьля ўзбуйненьня. Сярод іх — зьмяншэньне падаткаў на нерухомасьць, прыбытак, землі.

Што датычыць фэрмэрства, дык 84% сельскагаспадарчых земляў знаходзяцца ў карыстаньні дзяржаўных прадпрыемстваў і арганізацый, 15,5% — у асабістым карыстаньні грамадзян, а на сялянскія (фэрмэрскія) гаспадаркі прыпадае менш за адзін працэнт. Для фэрмэраў ёсьць пэўныя дзяржаўныя гарантыі: яны могуць атрымаць 100 га зямлі з правам перадачы ў спадчыну, набыць у раздроб вольныя памяшканьні і тэхніку ў дзяржаўных гаспадарак, атрымаць пазыкі і крэдыты. Толькі гэтага мала, пакуль на іх ня робіцца стаўка.

Казаць пра шырокае распаўсюджваньне замежных інвэстыцый у сельскую гаспадарку не даводзіцца. На цяперашні момант у прыцягненьні замежных інвэстыцый у форме крэдыту ці стварэньня СП маюць патрэбу 72 арганізацыі АПК Беларусі. Сярод іх — менскі хлебазавод №4, берасьцейскі, полацкі і аршанскі малочныя заводы, каля 20 калгасаў. Сярэдняя акупнасьць усіх праектаў — 2—3 гады, а неабходная для рэалізацыі сума замежных інвэстыцый у сукупнасьці складае 76,5 млн даляраў. Інвэстары не сьпяшаюцца. Адпалохваюць дзяржаўны кантроль над вёскай і імклівае згаршэньне якасьці працоўных рэсурсаў.

Нават Васіль Старавойтаў не рашаецца прапанаваць шлях выхаду зь цяперашняе сытуацыі. Сельская гаспадарка, нягледзячы на ўсе парадныя рэляцыі ўраду, застаецца ў глыбокім крызысе, калі нават рэкордны ўраджай ня робіць прадпрыемствы рэнтабэльнымі, а сяляне вымушаныя ўсё жыцьцё стаяць перад выканаўчай уладай на каленях з працягнутай рукой.

**Сяргей Трафілаў**

Першы закон аб падтрымцы АПК быў прыняты Вярхоўным Саветам яшчэ 29 траўня 1991 году. Гэты дакумэнт дэкляраваў наступнае: колькасьць прадукцыі, прададзенай дзяржаве па фіксаваных цэнах, штогод мусіць зьмяншацца на 10%. У параграфе, прысьвечаным сацыяльнаму разьвіцьцю, гаворыцца: цягам 10 год завяршаюцца газыфікацыя, водазабесьпячэньне, электрыфікацыя і тэлефанізацыя вёскі, а да 1995 г. завяршаецца будаўніцтва мясцовых дарог зь цьвёрдым пакрыцьцём. Такі вось аптымістычны закон канца савецкай эпохі.

**Валавы збор збожжавых і зернебабовых у БССР і РБ, тыс. тон**




Крыніца — Нацыянальны статыстычны зборнік Міністэрства статыстыкі за 2003 г.

**Падзел сельскагаспадарчых земляў між прадпрыемствамі рознай формы ўласнасьці**




# «Дажынкі». Справаздача 1996—2004

**За восем гадоў «Дажынкі» наведалі ўсе вобласьці Беларусі, а сярод прызоў героям жніва дасталіся аўтамабілі, матацыклы, халадзільнікі і будзільнікі. Сёлета дораць DVD-прайгравальнікі і кампутары.**

Першае сьвята-кірмаш працаўнікоў сяла «Дажынкі» прайшло ў 1996 г. у Століне. Асабліва запомніліся цырымонія ўзнагароджваньня «Жыгулямі» пераможцаў жніва і канцэрт. Уласна, з гэтага плюс аграмаднага кірмашу і складалася ўсё сьвята, калі глядзець збоку. А пасьля таго, як у 1997 г. сьвята пераехала ў Масты, яно стала традыцыйным элемэнтам сельскай гаспадаркі лукашэнкаўскага тыпу. Найлепшае ў іх, што кожны горад — сталіцу «Дажынак» адмыслова да сьвята прыводзяць да ладу.

Ініцыятарам першых «Дажынак» былі Мінсельгасхарч, міністэрствы фінансаў і эканомікі. Чыгіроўскі Кабінэт Міністраў выдзеліў 1298 млн рублёў на набыцьцё халадзільнікаў, тэлевізараў і матацыклаў для пераможцаў, а вось на аўтамабілі міністры прасілі знайсьці грошы прэзыдэнта, які і стаў сапраўдным тварам сьвята. На першых «Дажынках» узнагародзілі амаль 220 чалавек.

«Дажынкі-98» праводзілі ў Нясьвіжы. Тады, на Меншчыне, узнагародзілі рознай вартасьці прызамі і дыплёмамі 450 чалавек. А ў 1999 годзе «Дажынкі» ў Шклове сарваліся праз рэкордна нізкі ўраджай (узровень 1965—1970 гадоў), хаця арганізатары запэўнівалі яшчэ за два тыдні, што сьвяткаваць будзем ды яшчэ і з расейскімі зоркамі ў канцэрце.

У 2000 г. «Дажынкі» адбыліся ў Койданаве (ён жа Дзяржынск). На ўзнагароджаньне выдзяляліся 242 дыплёмы за дасягненьні ў збожжаўборцы, а таксама 28 — за ўборку льну. На кожную вобласьць давалася па адным аўтамабілі для службовага карыстаньня і па 1 млн 200 тыс. рублёў (на тагачасныя грошы). Было і «гран-пры» — 3 млн 500 тыс. рублёў на вобласьць. Такая ж схема была для абласных гаспадарак: 6 дыплёмаў і аўтамабіляў за першае месца, па 6 дыплёмаў і прэмій — за другое-трэцяе. Самім героям жніва ўручалі аўтамабілі, матацыклы, халадзільнікі, тэлевізары і грашовыя прэміі. А яшчэ за першае, другое і трэцяе месцы камбайнэрам, вадзіцелям і кіраўнікам гаспадарак, што занялі прызавыя месцы ў спаборніцтве ня першы раз, дарылі будзільнікі.

У 2001 г. «Дажынкі» сьвяткавалі ў Мазыры. Была ўведзена спэцыяльная намінацыя для маладых камбайнэраў і кіроўцаў машын, што перавозяць жыта. Прызы засталіся тыя ж, а вось грашовыя ўзнагароды вырасьлі праз інфляцыю амаль утрая. Налета яны павялічыліся яшчэ ў 2,5 разу, аднак вартасьць узнагарод засталася ранейшай. Калі ў 2000 «гран-пры» вобласьці-пераможцы складала 3 млн 500 тыс. рублёў, у 2001 — каля 9 млн, то ў 2002 у Полацку — 22 млн рублёў.

Летась у Пружанах амаль напалову ўзрасла колькасьць прызэраў «Дажынак» за кошт увядзеньня намінацыі «за ўборку кармавых культур». Грашовыя выплаты ў параўнаньні з полацкімі павялічыліся ў два разы.

Сёлетнія ваўкавыскія «Дажынкі» яшчэ больш павысяць колькасьць ляўрэатаў. Іх звыш за 500. Наагул, на сьвяце чакаюць дваццаць тысяч чалавек, зь іх хлебаробаў і артыстаў — па тры тысячы. З новых прызоў — кампутары і DVD-прайгравальнікі. Самае ж прыемнае, што інфляцыя выплат склала ўсяго 25% ад узроўню мінулага году.

**СТ**

**Традыцыя «Прэзыдэнцкіх дажынак» існуе і ў Польшчы. Аляксандар Квасьнеўскі ўпрыгожвае жонку Іяланту.**


AG

# Ад званка да званка

**У гэтую школу новыя вучні паступаюць кожны аўторак, пасьля прыходу чарговага *этапу*, а на дзьвярах клясаў — акенцы. У Бабруйскай выхаваўчай калёніі для падлеткаў, так званай «малалетцы», 1 верасьня — таксама сьвята.**



ВАСІЛЬ МАЗАЕЎ

Для таго каб стаць настаўнікам у гэтай школе, трэба прайсьці спэцправерку (давесьці, што ў цябе няма судзімасьцяў, што не крымінальныя сваякі).

У актавую залю ўваходзяць па атрадах, апранутыя ва ўсё чорнае. Самы маленькі ростам забягае ў залю са званочкам. Выступаюць дырэктар школы, начальнік калёніі, нампаліт зычыць навучэнцам цярплівасьці ў новым навучальным годзе. Паміж выступамі сьпяваюць выхаванцы музычнага гуртка. Тут словы песьні «Детство, детство, ты куда летишь» упершыню для мяне набылі нейкі зьмест.

Заняткі ў школе пачнуцца толькі 2 верасьня, пасьля кляснай гадзіны «Беларусь — наша Радзіма». Але спачатку адбудзецца разьбіўка на клясы: сёлета склад вучняў абнавіўся на 90% пасьля вялікай амністыі, прысьвечанай 60-годзьдзю Перамогі. Першыя тыдні верасьня — праверка ведаў вучняў. Звычай аказваецца, што яны ня ведаюць амаль нічога. Многія ў 16—17 гадоў маюць толькі па тры клясы адукацыі, ня ўмеюць пісаць і чытаюць толькі па складах (30—40 слоў у хвіліну). Многія зь іх не хадзілі ў школу на волі.

Начальнік калёніі, палкоўнік унутранай службы Сяргей Пяркоўскі, кажа, што большасьць выхаванцаў тут кіраваныя і паслухмяныя, але, калі пасьля вызваленьня яны вяртаюцца ў былое асяродзьдзе, усё можа пачацца спачатку. У многіх выпадках непаўналетнімі злачынцамі робіцца з вымушанай нэндзы: 50% тых, хто сядзіць за крадзяжы, проста ня мелі чаго есьці. Большасьць дзяцей у калёніі зь «непасьпяховых» сем'яў.

Паводле слоў Пяркоўскага, падлеткавая злачыннасьць найбольш цынічная і жорсткая. Часта гэта групавыя злачынствы, калі спрацоўвае статкавы інстынкт. Лідэры групы, дарослыя, часта падбіваюць маладзейшых брацць усю адказнасьць на сябе: падлеткам вышэйшая мера пакараньня прадугледжана да 15 гадоў, няма «вышкі» — пажыцьцёвага зьняволеньня. Так многія апынаюцца ў калёніі праз няправільна зразуметае пачуцьце салідарнасьці. Многія вяртаюцца ў калёнію па некалькі разоў.

Для таго каб стаць настаўнікам у гэтай школе, трэба прайсьці спэцправерку (давесьці, што ў цябе няма судзімасьцяў, што не крымінальныя сваякі). Большая частка настаўнікаў застаюцца тут на доўгія гады. З аднаго боку, працаваць за калючым дротам ня вельмі прыемна. З другога — калі ў звычайнай школе «дрэнных» дзяцей 2—3 чалавекі ў клясе, дык тут такія ўсе, а таму няма перад кім паказваць сваё «я». Яшчэ адна асаблівасьць — у калёніі ёсьць іншыя меры ўзьдзеяньня, акрамя пэдагагічных. Тут вядзецца працоўнае спаборніцтва, узнагародай у якім пасылка з дому ці сустрэча са сваякамі, таму вучыцца ёсьць дзеля чаго. Акрамя школьных настаўнікаў, дзень і ноч з навучэнцамі займаюцца выхаванцы. Важдаюцца зь імі, як з уласнымі дзецьмі.

Дырэктарка школы Ларыса Чарняк лічыць, што сакрэт посьпеху — у бесьперарыўнасьці навучальнага працэсу. Калі на волі многія са зьняволеных школу прапускалі, дык тут паспрабуй не прыйдзі. З 307 вучняў толькі 4 засталіся на другі год. Настаўнік францускай мовы Валер Багдановіч ганарыцца, што адзін зь яговых выпускнікоў пасьля вызваленьня зьехаў у Францыю: яговых ведаў хапае, каб жыць у Парыжы.

Увогуле, многія зьняволеныя марацьпра тое, каб паехаць за мяжу. Таму ўрокі замежнай мовы — адны з самых папулярных. Вывучыць яшчэ адну замежную мову часам просяцца нават тыя, хто скончыў школу і атрымаў атэстат.

Папулярнасьцю карыстаюцца таксама курсы на выбар (этыка і псыхалёгія сямейных адносін), урокі правазнаўства. З улікам спэцыфікі ўстановы тут асаблівую ўвагу надаюць вывучэньню папраўчага, выканаўчага, крымінальнага кодэксаў. Вучні часта пытаюцца кансультацый. Пры жаданьні можна авалодаць спэцыяльнасьцю токара ці сьлесара і атрымаць разрад. Яшчэ ў калёніі, маючы багата вольнага часу, многія пачынаюць займацца мастацтвам. У школе выстаўлены работы вучняў. Маю ўвагу прыцягвае фігурка, падобная да японскіх статуэтак нэцке. Аказваецца, такія вырабы з хлебнага мякішу — вельмі папулярнае рамяство. Хлебны мякіш зьмешваюць з тытунём і лепяць мініятурныя скульптуркі, якія потым фарбуюць.

Самі вучні на пытаньні адказваюць неахвотна і аднаскладова. На пытаньне «Што зьбіраешся рабіць пасьля вызваленьня?» пацiскаюць плячыма. Хлопец, зь якім я размаўляю, адседзеў чатыры гады, засталося два. Я адчуваю, што далейшыя пытаньні не да месца.

Сама калёнія выглядае як піянерлягер — пляц з флягштокам пасярэдзіне, лінейкі, страявы паход у сталоўку. Каб ня чорная форма тутэйшых жыхароў, іх цалкам можна было б прыняць за піянераў. Наагул калёнія аказалася не такой страшнай, як я ўяўляла. Мне нават знайшлі там майго цёзку паводле прозьвішча, а я з радасьцю ўбачыла ў радах адзін чорны твар — усё як на волі, з захаваньнем дэмаграфічнай структуры насельніцтва РБ. Але ўсё ж такі з пачуцьцём палёгкі я выйшла на КПП, дзе мне вярнулі мабільнік і за мной захлопнулася брамка з надпісам: «Для нас яны — проста дзеці».

**Вераніка Дзядок**

ДАРЭЧЫ

У 2003 годзе былі ўнесены зьмены ў Крымінальны кодэкс, паводле якіх зьмяніўся максымальны тэрмін зьняволеньня для непаўналетніх. Калі раней гэты тэрмін ня мог перавышаць 10 гадоў, дык цяпер вырас да 15. Такі тэрмін можна атрымаць за асабліва цяжкія злачынствы, зьвязаныя з наўмысным замахам на жыцьцё чалавека (арт. 115 ч.2 п.4 КК).

## Ціхая ракіроўка

На пачатку восені зусім ціха ў Гомелі зьмянілі бурмістра. Датулешняе чало гораду Лявон Барабанаў быў пераведзены на пасаду абласнога аб'яднаньня прафсаюзаў. Бурмістрава месьцейка заняў яго першы намесьнік Аляксандар Бяляеў. Прычыны фактычнага паніжэньня ў пасадзе спадара Барабанава гомельскі афіцыёз уцямна не тлумачыць.

## Мармэлядны Кірыла

Дзень гораду ў Гомелі сёлета быў прывязаны да Дня беларускага пісьменства. Дзеля таго ў горадзе крышку паболела беларускамоўных афіш і шыльдаў. Аднак праграма сьвяткаваньня, як паглядзець, засталася традыцыйнай — спартовыя выступы, выставы народнага мастацтва, канцэрты самадзейных калектываў, дыскатэкі і фаервэрк. Строгай ідэалягічнай вытрыманасьці ў мерапрыемствах не было. На розных пляцоўках можна было пачуць і «Белая Русь ты мая!» і «Мой мармеладный, я не права!», а ў майстроў — набыць і даматканыя рэчы, і сакослкі з Чэ Геварам. На сьвята былі адкрытыя адрэстаўраваныя корпус Гомельскага палацу ў парку і помнік Кірылу Тураўскаму ў сквэрыку ля драмтэатру.

## Як стаць ганаровым?

Яшчэ адным ганаровым грамадзянінам у Гомелі зрабілася болей. Пачэснае званьне гарадзкая рада надала спартоўцу Ігару Макараву, што бліскуча выступіў на апошняй алімпіядзе.

## Бедаловы

У Жыткавіцкім раёне два дзядзькі ўзяліся лавіць рыбу пры дапамозе дынаміту. Аднак апроч бяды небаракі нічагуткі не злавілі: аднаму ад выбуху вырвала корх правіцы, другому — кавалак левага сьцягна. Гэта ня першае здарэньне такога кшталту, але вучыцца на чужых памылках яшчэ багата хто не навучыўся.

**Сяргей Балахонаў, Гомель**

## Удзячныя нашчадкі

У Віцебскай вобласьці добра вядомы посьпехі ў краязнаўчай працы вучняў Ветрынскай школы на чале з настаўнікамі Алінай Красновай і Віктарам Карасёвым. Асабліва старанна вучні зьбіраюць матэрыялы пра жыцьцё і грамадзкую дзейнасьць земляка ветрынцаў Браніслава Эпімах-Шыпілы. Усе гэтыя матэрыялы беражліва захоўваюцца ў школьным музэі. Увогуле ў Ветрынскай школе за апошнія гады было створана ажно чатыры музэі — этнаграфічны, ваенна-гістарычны, літаратурна-краязнаўчы і гісторыка-краязнаўчы.

## Не старэюць вэтэраны

У аднаго з найстарэйшых сяброў полацкага літаб'яднаньня «Надзьвіньне» Зьмітрака Куніцкага, які сёлета ў верасьні адзначае сваё 75-годзьдзе, выйшла трэцяя кніга — зборнік паэзіі і перакладаў «У цянётах часу». У новай кнізе акрамя ўласных вершаў зьмешчаны перакладаы зь Ясеніна, Блока, Ахматавай, Высоцкага.

**ВК, Полацак**

## Мэгаквэтнікі замест камяніцаў

Фонды Галоўчынскага краязнаўчага музэю знаходзяцца ў небясьпецы. Прычынай таму — дзіравы дах вясковага Дому культуры, у якім месьціцца музэй. Падчас нядаўняга дажджу заліло сьцены, пашкоджаны некаторыя экспанаты. Тым часам, на месцы зруйнаванай летась старой камяніцы ў гістарычным цэнтры Бялынічаў узьведзены кветнік-гігант з лавамі і пасыпанымі гравіем сьцежкамі.

**Базыль Ліцьвіновіч, Бялынічы**

## Старшыні лепей відаць

Насуперак дэклярацыям кіраўніцтва краіны аб канкурэнтаздольнасьці беларускай сельгастэхнікі старшыня калгасу «Бель» Мікалай Сапранецi да камбайна замежнай вытворчасьці набыў і новы трактар маркі «Fendt-926». Тэхніка ў некалькі разоў пераўзыходзіць беларускія аналягі. Трактар мае магутнасьць ажно 300 конскіх сіл і можа без праблем цягнуць дзевяцікорпусны плуг.

## Крычаўцы жнуць на Смаленшчыне

Некалькі дзясяткаў экіпажаў збожжаўборачных камбайнаў з Крычаўшчыны накіраваны ў суседнюю Смаленскую вобласьць. Ураджай сёлета выдаўся багатым, а жаць збожжавыя на Смаленшчыне ды Браншчыне няма каму.

**Андрэй Пархоменка, Крычаў**

# Старое Палесьсе

Часлаў Пяткевіч. Рэчыцкае Палесьсе. Менск: Беларускі кнігазбор, 2004.

**Калі параўноўваеш духоўную культуру старога і новага Палесься, заўважаеш нязводнае ў жыцьці палешукоў: атамізаванасьць вёскі і масавае бытавое зладзейства. Чытачоў уразіць у гэтай кнізе і багацьце «ненарматыўнае» лексыкі, што існавала ў беларускай мове, пакуль зь ёю не папрацавалі майстры яе «ўшляхотненьня».**



З усіх рэгіёнаў Радзімы ў мяне найбольшая цікавасьць да таго, які пачынаецца ад Парычаў, Любані, Старобіна і — пішуць — ад Чудзіна. Гэта Ўсходняе Палесьсе. Нарадзіўшыся ў паўночна-заходнім яго кутку, дзе сыходзіцца мазырскія, слуцкія і гарадзенска-баранавіцкія гаворкі, дзе, як лічыў Яўхім Карскі, праходзіць мяжа паміж уласна беларускім абшарам і краем, які мы называем Заходнім Палесьсем, я, на свой сорам, мала ведаў пра астатнія часткі Ўсходняга Палесься. На тое былі дзьве прычыны: адзделенасьць цяперашніх Ганцавіцкага і Лунінецкага раёнаў ад рэшты этнаграфічнага рэгіёну адміністрацыйнаю мяжою і адсутнасьць грунтоўнае працы пра рэгіён.

Пра тое, што ёсьць кніга Часлава Пяткевіча пра Ўсходняе Палесьсе, я (і ня толькі я) толькі чуў. І вось цяпер гэтая кніга выйшла па-беларуску. І яшчэ раз пераканала мяне ў далучанасьці майго роднага кутка менавіта да гэтага рэгіёну. Ня толькі звычкі і завядзёнкі рэчыцкіх палешукоў падобныя да нашых — шмат агульных лексэм, якіх больш нідзе не сустрэнеш.

Кніга Ч.Пяткевіча дапаможа чытачом, асабліва моладзі, зазірнуць у мінуўшчыну не адно Палесься — усяе Беларусі. Як чалавек, які чытаў свае першыя кніжкі і рабіў урокі пры лучыне і лямпе, я здагадваюся, што асобныя мясьціны гэтае кнігі могуць гэтага чытача шакаваць. Хоць бы разьдзел «Гігіена»… Але лазьняў не было і на багатай Случчыне, і на ня менш багатай Наваградчыне, і за хлеў хадзілі паўсюдна.

Чытачоў уразіць у гэтай кнізе і багацьце «ненарматыўнае» лексыкі. Але і тое трэба сказаць, што ў беларускай мове (сьледам за расейскаю) шмат папрацавалі майстры яе «ўшляхотненьня». Напрыклад, у нямецкай ці польскай мовах на словы «Scheise» і «gowno», «Arsch» і «dupa» не наклалі табу, а «гаўно» і «срака» апынуліся пад забаронай. Праўда, Ч.Пяткевіч усё ж не да канца пасьлядоўны. Мы ведаем, што нашы бацькі і дзяды-прадзеды ўголас сваімі імёнамі называлі таксама й «інтымныя» часткі свайго цела (як, прыкладам, немцы кажуць «Schwanz», а ня «чэлес»). У кнізе ж Ч.Пяткевіча няма ніводнае згадкі нават пра «цыцкі», «курыцу» і «яйцы». А яны ж фігуруюць у жартах, прыпеўках і прыказках. Мы, вясковыя дзеці, хадзячы ў кашулях і гуляючы ў пяску, выдатна ведалі, што яны выглядаюць. Ад бацькоў і дзядоў мы штодзень чулі і «мацнейшыя» словы, хоць бы тое, што на літару «б», якога не саромеліся Скарына з Авакумам, якое, як сьведчыць Аляксандар Купрын, ужыла Царква, калі пракляла «блядословно отвергающего святые тайны» Льва Талстоя, і якое я чытаю ў кнігах польскіх аўтараў.

Зрэшты, магчыма, я грашу на Ч.Пяткевіча: не забудзьма, што амаль цэлы разьдзел ягонае кнігі — «Грамадзкая культура» — прапаў падчас вайны. Грашу й таму, што ў працах іншых этнографаў і таго не сустрэнеш.

І ўсё ж — цёмная, ня вельмі мытая, завашыўленая (перакладчыкі чамусьці пішуць «заўшыўленасьць»), наша вёска ведала меру: нельга лаяцца *кацапскаю, рускаю* лаянкаю — *па матушцы,* бо так лаяліся толькі *рускія брадзягі.* І гэта адзначае Ч.Пяткевіч. У нашым кутку мужчынская лаянка заканчвалася звычайна або пляваньнем («цьху на цябэ»), або бойкаю, справакаванаю гэтым пляваньнем. Бойку маглі справакаваць і словы «пацалуй мяне ў сраку». А жанчыны агольвалі гэтую частку цела ды ляскалі па ёй рукою (у рэчыцкім Палесьсі ў XIX ст., занатаваў Ч.Пяткевіч, жанчына паказвала сваёй спрэчніцы і пярэдніцу). Далей за «насяру тваёй матары» нашы вяскоўцы ня йшлі. Але гэтая лаянка лічылася празьмернаю.

Чытаючы пра матэрыяльную культуру Рэчыцкага Палесься, чытач убачыць, што за мінулыя 125 гадоў мы недалёка прайшлі па шляху прагрэсу: наша вёска і цяпер адной нагою стаіць у XIX ст., у натуральнай гаспадарцы.

Калі ж параўноўваеш духоўную культуру старога і новага Палесься, заўважаеш нязводнае ў жыцьці палешукоў і тое, што мінулася. Нязводнае — атамізаванасьць вёскі і масавае бытавое зладзейства. І калі ў параўнаньні з XIX ст. палешукі пэўны час менш кралі адзін у аднаго, дык, мусіць, толькі таму, што на тое былі калгасы й саўгасы. Цяпер зноў адзначаны рост бытавога зладзейства. Пяткевіч застаў той час, калі ганьбаю для роду было, калі хто-небудзь трапляў у турму. І ўжо за царом гэта пераставала быць ганьбаю…

Калі чытаеш, што жаночага п'янства ў палешукоў не было, дык ня можаш гэтага сказаць пра цяперашнюю вёску. Яшчэ ў мой час толькі тэарэтычна існаваў у палешукоў такі грэх, як забойства. І міжволі канстатуеш: ужо ня толькі тэарэтычна.

Як бачым, кніга Ч.Пяткевіча правакуе на параўнаньні, прымушае думаць. І ў гэтым немалая яе карысьць. А наагул, кніга Ч.Пяткевіча — унікальная: я не магу назваць іншае этнаграфічнае працы, у якой бы так дэталёва разглядалася матэрыяльная, духоўная і грамадзкая культура нейкага куточка Беларусі. У ёй апісаны невялікі абшар, які ахоплівае Бабчын, Вялікі Бор, Гарошкаў, Хвайнікі і Юравічы — мясьціны, адкуль Іван Мележ, Барыс Сачанка і Барыс Пятровіч (ці не нашчадкі яны знахара Сачанкі, пра якога піша Ч.Пяткевіч?), Ала Канапелька, Анатоль Сыс…

Кніга Ч.Пяткевіча напісана па-польску. Пачуваючыся палякам, аўтар стаяў трохі збоч ад народу, але і ад засьцянковае шляхты — таксама. Таму каштоўныя ягоныя моўныя занатоўкі. Цікава бачыць, як шляхта вымучвала зь сябе польшчыну, калечыла яе разам зь беларушчынай, як, не знаходзячы ў вострай сытуацыі часу на пошук польскіх і перайначваньне беларускіх слоў, пераходзіла на мову натуральную (с.544).

Хоць я і маю пэўныя (дарэчы, нешматлікія) прэтэнзіі да перакладу (прыкладам, сьвятар *высьвячвае* або *сьвяціць*, а не *высьвечвае*), не магу не адзначыць працу ўкладальніка, аўтара прадмовы і перакладчыка Ўладзімера Васілевіча ды перакладчыц Ліі Салавей, якія зрабілі працу Ч.Пяткевіча даступнаю беларускаму чытачу. А таксама тое, што выданьню кнігі паспрыяў прэзыдэнт Акадэміі навук Міхаіл Мясьніковіч.

**Анатоль Сідарэвіч**

## НАВІНЫ

### Вечарына Ўласава

Вечарына, прысьвечаная 130-годзьдзю першага рэдактара «Нашай Нівы» Аляксандра Ўласава, прайшла ў музэі Янкі Купалы. Доктар філялёгіі Арсень Ліс адзначыў ролю Ўласава ў арганізацыі беларускай эміграцыі — праблеме, актуальнай і сёньня.

### Усе Паўлінкі Купалаўскага

У Купалаўскім тэатры традыцыйнай пастаноўкай «Паўлінкі» пачаўся 85-ы сэзон. Сёлета спэктакль адзначае сваё 60-годзьдзе, таму была падрыхтавана адмысловая тэатралізаваная пастаноўка з удзелам акторак, якія гралі раней і выконваюць цяпер загалоўную ролю, — Алы Доўгай, Зоі Белахвосьцік, Сьвятланы Зеляхкоўскай, Юліі Міхневіч, Юліі Шпілеўскай.

З навінак, якія купалаўцы рыхтуюць у новым сэзоне, пастаноўкі Мікалая Пінігіна «Сымон-музыка», Уладзімера Савіцкага «Дзікае паляваньне караля Стаха».

### Яўтуховіч у Менску

Менск з творчым візытам наведаў кампазытар Зьміцер Яўтуховіч, які ўжо 11 гадоў жыве ў ЗША. Ён запіша дыск «Новыя беларускія песьні», а таксама правядзе шэраг канцэртаў — у Саюзе кампазытараў, Доме літаратара. Адбудуцца таксама ягоныя выступы на Беларускім радыё і БТ. Яўтуховіч напісаў такія песьні, як «Калыханка» (гучыць на радыё), «Усе мы родам зь дзяцінства», «Даставай, Язэп, гармонік».

### Новыя альбомы

У Менску адбылася прэзэнтацыя альбомаў «Музэй старажытнабеларускай культуры» і «Менск. Гісторыя пасьляваеннага аднаўленьня. 1944—1952», выпушчаных выдавецтвам «Беларусь». У першым альбоме — фатаграфіі музэйных калекцыяў жывапісу, скульптуры, разьбы, мэталічных вырабаў, тканін, народных касьцюмаў, керамікі. Альбом выйшаў у беларускай, ангельскай і расейскай мовах накладам 3000 ас.

У другі альбом аўтар-складальнік Віталь Кірычэнка ўключыў 297 здымкаў паваеннага Менску. Кніга выйшла з тэкстам па-беларуску і па-расейску накладам 2000 ас.

### Гран-пры для беларускага кіно

На II кінафэстывалі «Маскоўская прэм'ера» Гран-пры атрымалі стужкі беларускіх кінэматаграфістаў «Дунечка» (рэж.Аляксандар Яфрэмаў) і «Бальная сукенка» (рэж. Маргарыта Касымава і Ірына Волах). Кінакарціны былі паказаны ў праграме дзіцячага кіно.

### Біблія па-ўкраінску

У Кіеве выйшла поўнае выданьне Бібліі па-ўкраінску. Тэкст з расейскага сынадальнага выданьня XIX ст. пераклаў кіраўнік Украінскай праваслаўнай царквы Кіеўскага патрыярхату Філарэт. У выданьне ўвайшлі ўсе кнігі Старога Запавету, у тым ліку і некананічныя.

### «9/11» — на «Оскар»

Кінарэжысэр Майкл Мур будзе вылучаць свой скандальна вядомы фільм «9/11 паводле Фарэнгейта» на «Оскар-2004» у намінацыі «найлепшы фільм». З намінацыі «найлепшы дакумэнтальны фільм» ён вырашыў зьняць свой твор, каб падтрымаць калег, якія займаюцца дакумэнталістыкай.

### Каэльё ва Ўкраіне

Ва Ўкраіну на XI форум выдаўцоў у Львове мае прыехаць бразыльскі пісьменьнік Паоле Каэльё. Пісьменьнік мае наведаць Кіеў, дзе дасьць прэс-канфэрэнцыю, а ў Львове будзе цягам 4 гадзін падпісваць свае кнігі. Падчас форуму адбудзецца прэзэнтацыя ўкраінскага перакладу ягонага раману «11 хвілін».

### Кіно пра Папу

У Польшчы пачаліся здымкі двухсэрыйнага тэлефільму пра Караля Вайтылу — «Караль. Гісторыя чалавека, які стаў Папам». Рэжысэр Джакома Бат'ята здымае кіно пра Караля Вайтылу ад часоў ягонай маладосьці да выбару Папам. Прэзэнтацыя фільму заплянаваная на мяжу травень 2005 г.

### Музэй індзейскага Галакосту

21 верасьня ў Вашынгтоне адчыніцца Дзяржаўны музэй амэрыканскіх індзейцаў. Музэй разьмесьціцца ў 5-паверховым доме і будзе распавядаць пра «індзейскі Галакост», а таксама пра культуру індзейцаў ЗША, Канады і Паўднёвай Амэрыкі.

**АВ; БелаПАН, Gazeta.pl**

# Заняпад у гандболе, уздым у хакеі

**Зь верасьнем у Эўропу прыходзіць новы спартовы сэзон. Футбольная матухна-Эўропа адпачыла ад чэмпіянату кантынэнту ды Алімпіяды і 4 верасьня пачала кваліфікацыйны адбор да чэмпіянату сьвету-2006.**

Беларусы стартавалі 8 верасьня гасьцявой нічыёй з нарвэжцамі. Каб трапіць на мундыяль у Нямеччыну, трэба як мінімум заняць другое месца ў сваёй групе. З наймацнейшай і найслабейшай зборнымі падгрупы — Італіяй і Малдовай — згуляем якраз у кастрычніку. Дарэчы, у кваліфікацыі да Эўра-2004 мы занялі апошняе месца, прапусьціўшы наперад менавіта Малдову. Беларуская фэдэрацыя футболу, каб заахвоціць «дарослых» гульцоў, паабяцала выплаціць нацыянальнай зборнай пры ўмове выхаду на мундыяль-2006 1 млн 200 тыс. даляраў.

Грошы і спорт — рэчы непадзельныя. Вось перад гульнёй са зборнай Грэцыі прэм’ер-міністар Альбаніі паабяцаў сваім футбалістам у выпадку перамогі 500 тыс. даляраў. Альбанцы перамаглі чэмпіёнаў Эўропы — 2:1. Праўда, перамога над адвечнымі палітычнымі супернікамі была азмрочана грэцкімі зьзятарамі. Яны ўчынілі ў раёнах, дзе пражывае альбанская меншасьць, пагромы.

Каб у нас дбалі яшчэ пра клюбны футбол! Калі ў вышэйшай лізе яшчэ нейкі парадак, то ў першай — суцэльныя праблемы. Возьмем, напрыклад, «Маладэчна». Летась клюб чакана выбыў у першую лігу. З сыходам з гораду ў пачатку 90-х Генадзя Карпенкі пачаліся пэрманэнтныя фінансавыя праблемы. Так і цяпер. У міжсэзоньне частка гульцоў з каманды разьбеглася. Пачалі зьбірацца непатрэбных іншым клюбам футбалістаў. Першы круг у гэтым сэзоне «Маладэчна» скончыла на трэцім месцы. Але пачаліся затрымкі з выплатай заробку: у ліпені футбалістам не заплацілі нават за травень. Паўтара дзясятка гульцоў сышлі з каманды, і давялося заяўляць 16-гадовых юнакоў са спартшколы. Хатнія паядынкі каманда праводзіць у вёсцы Чысьць, што за 20 км ад Маладэчна, таму пахварэць за ўлюбёны клюб могуць зьезьдзіць самыя апантаныя. Трэніруецца каманда ў вайсковай часьці, з пачатку сэзону не набыла ніводнага мяча і мае толькі адзін камплект формы. Пра якія тады дасягненьні можа ісьці гаворка? Тут бы ў другую лігу ня вылецець. Атрымалі пяць запар паражэньняў з буйным лікам.

Падобная сытуацыя ў жаночым гандболе. Летась у жаночым айчынным першынстве бралі ўдзел чатыры каманды! Ды што клюбны гандбол, калі на нацыянальную зборную мала хто зважае. Валер Пяўніцкі, трэнэр нацыянальнай жаночай зборнай і чэмпіёну Беларусі БНТУ, пасьля таго як вывеў каманду на чэмпіянат Эўропы, перайграўшы ў плэй-оф азэрбайджанак, нечакана пакінуў нацыянальную зборную, падпісаўшы кантракт з… Азэрбайджанам. На пытаньне журналістаў, чаму ён так зрабіў, адказаў пытаньнем: «А як вы ставіцеся да 43-гадовага мужыка, які пазычае грошы ў маці-пэнсіянэркі?» Фэдэрацыя гандболу Азэрбайджану проста прапанавала заробак, у 10 разоў вышэйшы. Калі няма чаго есьці, гаворкі пра патрыятызм — у сьнежні старт чэмпіянат кантынэнту — заліш-нія.

Ня лепшае становішча і ў мужчынскім гандболе. Так што папулярная песенька «Мы ўсе хворыя на гандбол» не пра нас.

У Беларусі ў фаворы «прэзыдэнцкі» від спорту — хакей. І тут ёсьць якасныя зрухі. Тыдзень таму стартаваў 13-ы чэмпіянат Беларусі ў вышэйшай лізе, ды не абы-які, а адкрыты. Апрача дзевяці беларускіх клюбаў — «Кераміну», «Юнацтва», «Дынама-Менску», «Нёману», «Хіміка-СКА», «Гомелю», «Берасьця», «Хімвалакна», «ХК Віцебск» — упершыню бяруць удзел і тры дружыны з-за межаў Беларусі: «Ліепаяс Мэталюрг», «Рыга-2000» ды кіеўскі «Сокал». Прычым менавіта латышы і ўкраінцы доўга ўгаворвалі беларусаў дазволіць далучыцца да нашага першынства. Ад гэтага чэмпіянат несумненна выйграе, дый беларускім клюбам ня трэба будзе распыляцца на ўнутранае першынство і чэмпіянат Усходне-эўрапейскае лігі. Ёсьць зрухі і на міжнароднай арэне. Нездарма Беларусі давярылі правядзеньне ў Менску юніёрскага чэмпіянату сьвету ў красавіку і супэрфіналу Кантынэнтальнага кубку ў студзені ў Гомелі.



AP

Засталося пераканаць кіраўніка дзяржавы заняцца гандболам ды баскетболам. Да чацьвертых прэзыдэнцкіх выбараў ёсьць шанец узьняць гэтыя віды.

**Алег Раявец**

# Спорт на роднай мове

**У Францыі 19 з 20 футбольных калектываў вышэйшай лігі (95%) маюць назвы родных гарадоў. У Беларусі — толькі «Гомель» плюс «Нёман».**

На дварэ быў пачатак 90-х. Вестка аб зьяўленьні на мапе сьвету новых незалежных дзяржаваў абляцела ўсю плянэту. У самой Беларусі адбываліся падзеі ня менш эпахальныя. Праз 200 гадоў няволі беларускае чынавенства нарэшце загаварыла роднай мовай. Адраджэньне нацыянальных традыцыяў набыло масавы характар. Сфэрай, што засталася вольнай ад узьдзеяньня Беларушчыны, быў спорт. Чаму так адбывалася?

## Вытокі расейскасьці

Масавае разьвіцьцё спорту ў Беларусі пачалося за саветамі. Партыйныя бонзы ад пачатку зразумелі: нішто лепей за спорт ня здолее арганізаваць расхістаных народныя масы.


PHOTO.BYMEDIA.NET

**Максім Мірны — першы айчынны спартовец, які паўдзельнічаў у стварэньні беларуска-моўнага поппраекту, запісаўшы разам з Алесяй песьню «Салавей».**

23 чэрвеня 1923 г. УЦВК РСФСР прыняў рашэньне аб стварэньні Вышэйшае рады фізкультуры. Амаль праз месяц пры Саўнаркаме БССР была створаная Вышэйшая рада фізычнае культуры Беларусі. Спорт стаўся адным з прыярытэтаў дзяржаўнае палітыкі. Па ўсёй краіне фізкультурныя гурткі перайшлі пад кантроль прафсаюзаў, будаваліся спортпляцоўкі, ладзіліся спаборніцтвы рознага кшталту, ствараліся аддзелы Ўсесаюзнага фізкультурна-спартовага таварыства «Дынама».

Прыгадайма, што ўсплёск спартовага разьвіцьця ў Беларускай рэспубліцы супаў з пэрыядам, вядомым кожнаму школьніку пад назвай «беларусізацыя». Але лягічнага пранікненьня нацыянальна-культурных здабыткаў у спорт так і не адбылося. Партыйнае кіраўніцтва бачыла ў спорце выключна інтэрнацыянальную зьяву, унівэрсальную прыладу прапаганды.

## Назвы — найлепшыя паказьнікі

З 16 камандаў Вышэйшай футбольнай лігі толькі тры ўтрымліваюць у сваіх візітоўках сувязь з роднай глебай: «Нёман» (Горадня), «Гомель» ды «Дняпро-Трансмаш» (Магілёў). Тапанімічны паказьнік у нас проста «выдатны» — 6,25%. І так ва ўсіх відах спорту. Затое спрэс «дынамы», «лякаматывы», «тарпэды», «шахцёры», а яшчэ адмысловыя абрэвіятуры накшталт «БАТЭ», «МТЗ», «Белшына».

Адкуль ёсьць пайшлі гэтыя назвы? У 1951 г. газэта «Фізкультурнік Беларусі» паведамляла: «На бегавую дарожку і ў сэктары стадыёну «Дынама» выйшлі прадстаўнікі 12 зборных калектываў гораду па першай групе — лёгкаатлеты СКІФ, АДА, «Дынама», «Навука», «Іскра», «Спартак»; у другой групе — ДСТ «Праца», «Працоўныя рэзэрвы», «Харчавік», «Чырвоны сьцяг», «Энэргія». Як кажуць, no comments.

Сёньня Беларусь справядліва можна назваць галоўнай пасьля Расеі пераемніцай савецкае спартовае анамастыкі. Бо ніводная суседняя з намі краіна ня мае столькі адпаведных назваў. У Латвіі — адзін «Мэталюрг», ва Ўкраіне — 6 савецкіх найменьняў з 16, у Літве іх няма зусім!

## Дык Byelorus, Belorussia ці Belarus?

З абвяшчэньнем незалежнасьці Беларусі перад заходнімі журналістамі паўстала новая праблема: як правільна называць новую суверэнную краіну? Як нас толькі ні звалі! І «Byeloros», і «Byelarus», і «Belorussia». Асабліва часта гэтая блытаніна мела месца ў сувязі з дасягненьнямі айчынных атлетаў на міжнароднай арэне, бо ў выніковых пратаколах назва краіны пазначаецца агульнапрынятым скарачэньнем: Расея — RUS, ЗША — USA... Беларусь з прычыны аднолькавасьці трох першых літар блыталі з Бэльгіяй (BEL замік BLR). У выніку нашы спартоўцы станавіліся бэльгійцамі, а бэльгійцы — беларусамі. Апошнім часам, праўда, гэтыя памылкі сустракаюцца радзей. Цалкам можна сьцьвярджаць, што за гэтыя 13 гадоў сусьветная супольнасьць хоцькі-няхоцькі, а пра Беларусь даведалася, няхай нават шмат у чым «дзякуючы» аднаму толькі чалавеку.

Вынікі векапомнага рэфэрэндуму 96-га года адчулі на сабе і за «бугром». Адразу па ім даволі пашыранай сталася сытуацыя: прыяжджаюць, скажам, беларускія гандбалісты на спаборніцтвы ў Аўстрыю, займаюць там месца на п’едэстале, а ў іх гонар угору ўздымаюць замік новага-старога чырвона-зялёнага бела-чырвона-белы сьцяг, які ўжо і не дзяржаўны. Словам, скандал. Міжнародная маштабу.

Цікава, што гэткія «падкопы капіталістаў» часам выходзяць на паверхню й цяпер. Так, у афіцыйным выданьні Міжнароднай тэнісной фэдэрацыі (МТФ), прысьвечаным Кубку Дэвіса, апісаньне супрацьстаяньня Беларусі й Расеі суправаджалася нацыянальнай сымболікай, дзе побач з расейскім трыкалёрам упэўнена пачуваўся й наш бела-чырвона-белы сьцяг. Праўда, функцыянэры з МТФ пасьпелі й расчараваць, цягам двух менскіх матчаў называючы краіну-гаспадыню ў афіцыйных пратаколах са статыстыкай не інакш як «Belarussia».

## Адсотак беларускасьці

Беларускі спорт сёньня на 99,9% дэнацыяналізаваны. І выяўляецца гэта ня толькі ў адсутнасьці нацыянальных атрыбутаў на спаборніцтвах ды браку атлетаў, што ўжываюць на афіцыйных прэс-канфэрэнцыях родную мову. Дастаткова зьвярнуцца да спэцыялізаваных СМІ, якія мусяць быць галоўнымі распаўсюднікамі прагрэсіўных ідэяў, каб убачыць, што сувязь паміж спортам і беларушчынай у нас фармальная.

Найстарэйшая ў краіне спартовая газэта «Фізкультурнік Беларусі» (цяпер — «Спортивная панорама»), заснаваная ў далёкім 51-м як орган Камітэту па справах фізычнай культуры і спорту пры Савеце Міністраў СССР, толькі на самым пачатку выдавалася на дзьвюх мовах: частка накладу — на расейскай, частка — на беларускай. Але хваля антыбеларускай палітыкі хутка паглынула беларускамоўны варыянт. Другое знакавае ў гісторыі айчыннага спорту выданьне «Прессбол» на роднай мове беларусаў аніколі й не выдавалася, хаця па сваёй уплывовасьці й прафэсіяналізьме на айчынной мас-мэдыйнай прасторы ня мае канкурэнтаў. Што да тых беларускамоўных СМІ, якія так ці інакш аглядаюць спорт, іх мова ёсьць чыстым калькаваньнем расейскамоўнай лексыкі. А ў дачыненьні да адмысловай спартовай тэрміналёгіі гэтая трасянка выглядае прыкрэйшай удвая.

Можна, канечне, крыўдаваць на замежнікаў за памылкі ў напісаньні назвы краіны і блытаніну з сымбалямі: маўляў, мы ж Францыю Нямеччынай не называем. Але ў тым, што адбываецца, вінаватыя толькі мы самі. Пакуль цяперашняя краіна Беларусь ня стане беларускай, айчынны спорт будзе дэнацыяналізаваным.

**Кастусь Лашкевіч**

# Дзяржынава, 11 верасьня

**Завітаўшы ў Івянец 11 верасьня, я здагадалася пра беларускі сьлед у тэрактах 2001 году: 11 верасьня — дзень народзінаў галоўнага чырвонага тэрарыста Фэлікса Дзяржынскага. У гэты дзень у Івянецкім музэі Дзяржынскага па традыцыі адзначаюць яго дзень народзінаў. Ня тое каб супрацоўнікі музэю былі аматарамі тэрарызму, проста гэта гісторыя, якую «таксама трэба берагчы».**

Алег Раманоўскі, дырэктар музэю, кажа: «Адны ім захапляюцца, іншыя лічаць яго злодзеем, але ўсё гэта наша гісторыя, яе таксама трэба зьберагаць. Як нашы людзі кажуць, хаця б асфальт дзеля яго праклалі. Адразу пасьля незалежнасьці людзі неахвотна цікавіліся камуністычнымі ідаламі, але цяпер цікавасьць ізноў вярнулася».

Алег Раманоўскі найбольш увагі ў экспазыцыі надае шляхецкаму побыту, а таксама славутым івянецкім мастацтвам і рамёствам. І цяпер у цэнтры рамёстваў пры музэі ткацтву, кавальству, ганчарнаму мастацтву навучаюць дзяцей. Народны майстар разьбяр па дрэве Апалінарый Пупко дасылаў допісы ў першую «Нашу Ніву» і арганізаваў беларускі тэатар.

Але калі раней Івянец ганарыўся перш за ўсё сваімі мастацтвамі, дык у кантэксьце ідэалёгіі сучаснай беларускай дзяржавы самы час зьвярнуцца да брэнду Дзяржынскага. Дзіўна, чаму дагэтуль дзяржава не здагадалася стварыць у Івенцы парк накшталт дысnэеўскага з атракцыёнамі кшталту «допыт у Фэлікса», «падарожжа ў засьценкі ГПУ», «у краіне вампіраў», «забі сястру сваімі рукамі». Добрым гідам па такім парку мог бы стаць трылер Сержука Сокалава-Воюша «Крывавы памол».




**Надпіс «Жыве Беларусь!» на даху УП «Івянецкая крыніца», выкладзены з дахоўкі ўласнае вытворчасьці.**

У кнізе Фэлікс — крывасмок, жыцьцём якога кіруюць вупары, нашчадкі графа Дракулы. У сёньняшнім Івянцы ўсё, што нагадвае пра іншасьвет, — гэта драўляныя ўніяцкія скульптуры нячысьцікаў XVIII ст., косткі каталіцкіх сьвятароў, раскіданыя пры пабудове праваслаўнай царквы (прынамсі, так кажуць месьцічы), ды падваеньне кандыдатаў у дэпутаты. Дакумэнты на рэгістрацыю кандыдатамі ў Івянцы падалі два Дубоўікі. Адзін зь іх ужо два тэрміны адбыў дэпутатам ад Івянецкай акругі.

У астатнім Івянец застаецца крэпасьцю беларушчыны. Гэта тое месца, дзе вы можаце зьбіць дыванкі з выявай Пагоні, калі раптам ваша фабрыка здуру вырабіла на зары незалежнасьці занадта шмат. Пагоню і герб гораду з выявай ільва тут пабачыш на брамах прыватных дамоў.

На даху ўнітарнага прадпрыемства «Івянецкая крыніца» проста на ўезьдзе ў горад зь Менску красуецца надпіс «Жыве Беларусь!», зроблены з сваёй прадукцыі («Крыніца» вырабляе дахоўку). А кіраўнік мясцовай суполкі БНФ Вінцэсь Солтан у сьвяты ўздымае ў двары бел-чырвона-белы сьцяг. Мне паказваюць дом, дзе кватараваў Зянон Пазьняк, калі працаваў над музэйнай экспазыцыяй. На беларускую імшу ходзіць больш людзей, як на польскую, а самым вялікім сьвятам апошніх гадоў стала запусканьне ў мясцовае возера таўсталобіка, які павінен ачысьціць яго ад багавіньня. Нядаўна ў Івянец прыяжджала пілігрымка з былых акоўцаў, жылі на хатах.

Першая ж гаспадыня, якую мы вырашылі распытаць пра Фэлікса, аказалася пакаёўкай у Альдоны Дзяржынскай, сястры Фэлікса.

Юзэфа Лобач зь вёскі Пятрылавічы, бабулька з гаматнымі залатымі завушніцамі, падрабязна расказвае, як два леты працавала ў пані і што ўваходзіла ў яе абавязкі. Паноў узгадвае як вельмі добрых людзей: «кажнага зачэпяць, слова скажуць». Брат Фэлікса Ўладыслаў, доктар, прымаў у летнім адпачынку хворых. Падчас вайны ён у складзе польскага войска трапіў у палон і расстраляны фашыстамі за адмову ставіць мэдыцынскія экспэрымэнты на людзях. Адна сястра была рэпрэсаваная. Яшчэ адзін брат з жонкаю забітыя фашыстамі падчас вайны за ўдзел у антыфашысцкім руху ў Івянцы. Яшчэ адна сястра жыла ў Маскве і прыяжджала ў Івянец на стагодзьдзе брата расказваць пра яго піянерам.



> У Дзяржынаве рыхтуюцца да прыезду гасьцей. У кастрычніку там чакаюць сустрэчу ў рамках СНД з магчымым удзелам А.Лукашэнкі.

Фэлікс жыў у Дзяржынаве да 14 гадоў, пакуль ня зьехаў вучыцца ў Вільню. Маёнтак належаў Дзяржынскім больш за 300 гадоў. Дзяржынскія лічылі сябе палякамі, хаця маці Фэлікса, народжаная Янушэўская, паходзіла з чыста беларускай шляхты, яе бацькі і дзяды бралі ўдзел у паўстаньнях Касьцюшкі і Каліноўскага.

Сокалаў-Воюш знайшоў сьведчаньні, паводле якіх Фэлікс некаторы час захапляўся беларускім нацыяналізмам, у дзяцінстве марыў стаць ксяндзом. Сястра ўспамінала, што ягонай любімай гульнёй была «біць маскаля». Па-расейску Дзяржынскі ўсё жыцьцё гаварыў з акцэнтам, а ў аўтабіяграфіі называў радзіму «Рускай Польшчай».

Кажуць, што ён нібыта застрэліў сваю сястру Ванду. Гэта адбылося, калі Фэлікс гуляўся са стрэльбай, і бацькі хавалі гэты факт, каб не нанесьці маральнай траўмы малому. Паводле іншай вэрсіі, сястру забіў іншы брат.

Цяпер сядзіба Дзяржынскіх у Дзяржынаве аднаўляецца. У ёй будзе пашырана экспазыцыя пра сям'ю і шляхецкі побыт. А пакуль што ў Дзяржынаве ўсе рыхтуюцца да прыезду гасьцей. У кастрычніку там чакаюць сустрэчу ў рамках СНД з магчымым удзелам А.Лукашэнкі. Радзіма Дзяржынскага ня першы раз робіцца месцам правядзеньня такіх сустрэч. Пашанцавала жыхарам вуліцы 1 Мая ў Івянцы: платы пафарбавалі, а некаторым нават цалкам памянялі.

**Вераніка Дзядок.**
**Фота аўтаркі.**

Рэдакцыя дзякуе за дапамогу ў падрыхтоўцы матэрыялу Вінцэсю Солтану і Вінцуку Вячорку.



> «Адны ім захапляюцца, іншыя лічаць яго злодзеем. А нашы людзі кажуць, хаця б асфальт дзеля яго праклалі».

**Дырэктар музэю Алег Раманоўскі найбольш увагі ў экспазыцыі надае шляхецкаму побыту.**

## Фэлікс і клоны

Дзяржынскі — наркам шляхоў зносінаў СССР, кіраўнік народнай гаспадаркі, сябра таварыства па вывучэньні праблем міжплянэтных зносінаў, адзін з стваральнікаў таварыства «Дынама», стваральнік і старшыня Таварыства сяброў савецкага кіно, выратавальнік музычных інструмэнтаў ад рук прыватных калекцыянэраў.

## Фэлікс і нэкрафілія

Менавіта Дзяржынскі кіраваў арганізацыяй пахаваньня Леніна, зь яго ініцыятывы Ленін быў забальзамаваны, пад яго кіраўніцтвам у самыя кароткія тэрміны пабудаваны Маўзалей.

## З савецкай міталёгіі

Дзяржынскі мог без ваганьняў аддаць свой пашпарт і грошы таварышу па катарзе, каб той зьбег першы. Сьціплы ў побыце, ён амаль ня спаў. Ён кіраваўся правілам «лепш аддаць, чым узяць», да канца жыцьця сам чысьціў сабе абутак і раскладаў ложак, а аднойчы ў турме ўсё лета выносіў на сьпіне на прагулку сукамэрніка, які ня мог хадзіць.

## Зь ліста да сястры

«Я застаўся такім жа, як быў, хаця для многіх няма імені страшнейшага за маё. І сёньня, апрача ідэй, апрача імкненьня да справядлівасьці, нішто не вызначае маіх дзеяньняў».



**Кіраўнік мясцовай суполкі БНФ Вінцэсь Солтан у сьвяты ўздымае ў двары бел-чырвона-белы сьцяг.**

## Фэлікс Дзяржынскі

Стваральнік Надзвычайнай камісіі па барацьбе з контррэвалюцыяй і сабатажам (ЧК, з 1922 — ГПУ) і савецкай выведкі яшчэ ў гімназіі стаў сябрам сацыял-дэмакратычнага гуртка і на гары Гедыміна ў Вільні даў клятву прысьвяціць жыцьцё барацьбе зь несправядлівасьцю.

Ніхто з савецкіх дзеячоў не правёў у няволі больш часу за Дзяржынскага. Фэлікс адсядзеў у турмах і высылках 11 гадоў, з высылкі двойчы зьбягаў. У савецкай міталёгіі Дзяржынскі — «жалезны Фэлікс», «рыцар рэвалюцыі», самы чалавечны чалавек і найвялікшы сябра дзяцей. Узначальваў камісію УЦВК па паляпшэньні жыцьця дзяцей, кіраваў ліквідацыяй дзіцячай беспрытульнасьці, ужываючы пра гэтым карныя мэтады, ствараючы дзіцячыя дамы і працоўныя камуны, але не забываючыся звозіць туды «панскую» маёмасьць.

Фэлікс меў адзінага сына — Яна, які нарадзіўся ў Варшаўскай турме ў 1911 г. Жонка Фэлікса — таксама прафэсійная рэвалюцыянэрка. Ян пабачыў бацьку толькі ў сямігадовым веку, калі той зьбег і прыехаў у Швайцарыю, пазьней стаў савецкім партыйным дзеячом.

Фэлікс памёр ад сардэчнага прыступу падчас партыйнага паседжаньня, дзе выступаў супраць адхіленьня ад ленінскай палітыкі ў партыі. Паводле некаторых здагадак, атручаны Сталіным. У жніўні 1991 г. масквічы зьнесьлі помнік Дзяржынскаму на Лубянцы.

Мянушкі Дзяржынскага: Яцак, Астраном, Франак, Юзэф.

# Менскі матэматык вырашыў праблему Гольдбаха-Эйлера

**Менскі матэматык Віктар Карпаў вырашыў праблему Гольдбаха—Эйлера — задачу, над якой біліся найлепшыя сусьветныя навукоўцы 262 гады.**

Над адной з самых вядомых матэматычных задач кандыдат фізыка-матэматычных навук Віктар Карпаў задумаўся пры канцы 50-х, калі вучыўся ў Ленінградзе, а шчыльна ўзяўся ў 90-х, пасьля выхаду на пэнсію.

Праблема Гольдбаха належыць да ліку так званых «спартовых» задач (сярод такіх — тэарэма Фэрма, праблема Рымана ды інш.). Сфармуляваная некалькі стагодзьдзяў таму, яна нарадзілася як гульня абстрактнага розуму. У 1742 г. Хрысьтыян Гольдбах паспрабаваў прадставіць кожны няцотны лік у выглядзе сумы трох простых лікаў (тых, якія дзеляцца выключна на саміх сабе і на адзінку, — як 3, 5, 7, 11, 13, 17 і г.д.), склаў невялічкае і, падавалася, даволі простае раўнаньне, але рашыць яго ня здолеў і даслаў свайму сябру — Леанарду Эйлеру. Знакаміты матэматык заўважыў на гэта, што задачу лёгка вырашыць, калі прадставіць кожны цотны лік у выглядзе сумы двух простых лікаў, але шляхоў да вырашэньня не знайшоў. Таму, хто бярэцца за гэтае раўнаньне, здаецца, што рашэньне недзе блізка, але на працягу двух стагодзьдзяў ніхто ня здолеў вырашыць гэтай праблемы.

Бліжэй за ўсіх да вырашэньня быў расейскі акадэмік Іван Вінаградаў, які давёў, што для вельмі вялікіх лікаў няцотны лік можна прадставіць у выглядзе трох простых лікаў (для маленькіх лікаў — няма рашэньня). Аднак ён ня здолеў знайсьці рашэньня для цотных. Акадэмік Вінаградаў абраў даволі цяжкі шлях, бо намагаўся падысьці да рашэньня простага раўнаньня з дапамогай складаных трыганамэтрычных радоў.

У 90-х гадах XX ст. праблемай Гольдбаха шчыльна заняўся Апосталас Даксіядыс — грэцкі пісьменьнік


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

і навуковец, прадстаўнік школы «літаратурнага касмапалітызму». Празь некалькі год бясплённага змаганьня зь лічбамі ён прызнаў, што пакрысе пачынае вар'яцець. Даксіядыс напісаў раман пад назвай «Дзядзька Пэтрас і праблема Гольдбаха», з дапамогай якога набыў сусьветную славу. Паводле сюжэту, галоўны герой усё жыцьцё б'ецца над прынцыпова невырашальнай навуковай праблемай і пры канцы траціць розум.

У 2000 г. ангельскі кнігавыдавец і сябар пісьменьніка Тоні Фэйбэр паабяцаў таму, хто вырашыць праблему Гольдбаха, зрабіць прэзэнт са сваёй кішэні ў выглядзе 1 млн даляраў.

> В.Карпаў кажа, што гэтай задачай ён заняўся не таму, што захацеў зарабіць мільён. «Мной заўсёды кіравала прага ісьціны, а ня прага нажывы».

У сп.Карпава атрымалася ня толькі захаваць розум, шчыруючы бяссоннымі начамі перад кампутарам, але і знайсьці рашэньне, якому ўжо цяпер можна надаваць эпітэт «элегантнае».

Дзірак у яго доказах няма, ён апрацаваў усе рашэньні ад 3 да 100000500. Далей рашаць не дазваляла абмежаваная разраднасьць кампутара. Аднак ён узяў на ўзбраеньне сьцьверджаньне Эўкліда наконт таго, што ў мностве простых лікаў няма найбольшага ліку, і прыстасаваў яго да праблемы Гольдбаха—Эйлера. Тым самым матэматык зь Менску давёў, што рашэньняў раўнаньня існуе бясконцая колькасьць (для кожнага састаўнога ліку можна ж знайсьці просты лік, які быў бы большы за гэты састаўны). Лягічная і прыгожая выснова.

В.Карпаў кажа, што гэтай задачай ён заняўся не таму, што захацеў зарабіць мільён. Ды, зрэшты, і не разьлічвае ён атрымаць гэты мітычны прэзэнт, хоць і абсалютна ўпэўнены ў правільным рашэньні раўнаньня. «Мной заўсёды кіравала прага ісьціны, а ня прага нажывы», — кажа матэматык.

Ён заняўся рашэньнем мудрагелістага ўраўненьня ў цяжкі пэрыяд свайго жыцьця. Давялося пахаваць сына Сяргея, а празь нейкі час — і жонку Веру. Ім, а таксама сваёй маці Таццяне навуковец і прысьвяціў сваю працу.

Сутнасьць задачы сама па сабе даволі простая, такое раўнаньне можна ўспрымаць як навуковую забаўку. Але ж матэматыкі кажуць, што ў іх навуцы няма нічога бескарыснага. Пацьвярджэньняў таму шмат. Так, амаль 105 год назад дзякуючы «бескарыснаму» ўраўненьню Макса Планка зарадзілася квантавая фізыка. Хто ведае, можа, і раўнаньне Гольдбаха—Эйлера з рашэньнем матэматыка Карпава зь Менску прыдасца да вырашэньня сур'ёзнай навуковай задачы.

**Сяргей Будкін**

### Праблема Гольдбаха—Эйлера. Рашэньне Віктара Карпава.

**Раўнаньне Эйлера:**

Трэба даказаць, што кожны цотны лік, большы за 2, можна прадставіць у выглядзе сумы двух простых лікаў $x$, $y$, дзе $x$ большае альбо роўнае $y$, а $2n$ — цотны лік, роўны $x + y$. $2n = x + y$ ёсьць раўнаньнем Эйлера (фармулёўка гіпотэзы Эйлера).

Існуюць дзьве магчымасьці рашэньня раўнаньня: ці ёсьць канцавая колькасьць рашэньняў, ці такіх рашэньняў — бясконцасьць. Меркаваньне, што колькасьць рашэньняў раўнаньня канцавая, вядзе да супярэчнасьці. Мэтадам ітэрацыі, калі з кожнага папярэдняга рашэньня вынікае наступнае, былі атрыманы ўсе рашэньні раўнаньня Эйлера для $n$ ад 3 да 100000500, аднак ітэрацыйны працэс патэнцыйна можна ажыцьцяўляць для ўсіх натуральных лікаў ад 3. Меркаваньне, што ітэрацыйная пасьлядоўнасьць мае канец, супярэчыць сьцьверджаньню пра бясконцасьць рашэньняў раўнаньня Эйлера для простых лікаў. Сапраўды, калі з канцавой лічбы ітэрацыі вынікае, што $n$ большае за $\underline{n}$, дзе $\underline{n}$ — нумар апошняй ітэрацыі, то рашэньня раўнаньня Эйлера не існуе, але з існаваньня простага ліку, большага за нумар апошняй ітэрацыі, вынікае, што такое рашэньне існуе. Іншымі словамі, *існуе бясконцая колькасьць рашэньняў раўнаньня Эйлера.*

Прыклады рашэньняў раўнаньня Эйлера $2n = x + y$, дзе $x$, $y$ – простыя лічбы, дзе $x$ большае альбо роўнае $y$, а $2n$ – цотны лік:

6 = 3 + 3, 8 = 5 + 3, 10 = 5 + 5, 12 = 7 + 5, ...24 = 13 + 11, 26 = 13 + 13, ...100001494 = 50000747 + 50000747, 100001496 = 50000813 + 50000683...

**Раўнаньне Гольдбаха:**

Трэба даказаць, што кожны натуральны лік $n$, большы за 5, можна прадставіць у выглядзе сумы трох простых лікаў $x$, $y$, $z$ (фармулёўка гіпотэзы Гольдбаха). $n = x + y + z$ ёсьць раўнаньнем Гольдбаха.

Доказ: да кожнага разьбіцьця цотнага ліку на два простыя лікі далучым у якасьці трэцяга складніка спачатку 2, а потым 3 і атрымаем, напрыклад:

$2 + 2 + \mathbf{2} = 6$, $2 + 2 + \mathbf{3} = 7$, $3 + 3 + \mathbf{2} = 8$, $3 + 3 + \mathbf{3} = 9$, ...$11 + 5 + \mathbf{2} = 18$, $11 + 5 + \mathbf{3} = 19$, $11 + 7 + \mathbf{2} = 20$ і г.д.

# Саюз мовы і кілбасы




«Спадчына», №2-3 за 2003.

**Чарговы нумар «Спадчыны», выхад якой усё яшчэ балюча адстае ад графіку, прысьвечаны тэме «Спажывецкая культура».**

Большасьць матэрыялаў нумару спрабуюць рэканструяваць штодзённую культуру нашых продкаў, амаль дашчэнту зьнішчаную двума стагодзьдзямі расейскай і савецкай уніфікацыі.

У нас амаль адсутнічаюць высокія стэрэатыпы спажываньня, традыцыйныя прадукты, якія б культываваліся і ўдасканальваліся з пакаленьня ў пакаленьне, якія б годна рэпрэзэнтавалі краіну, фармавалі яе аблічча. Няма больш «смаргонскіх абаранкаў», урэцкага ды налібоцкага шкла, «літоўскага» сыру, дзісенскага масла, сьвержанскага фаянсу, слуцкіх ды гарадзенскіх паясоў. Што, апроч дранікаў і мачанкі, можна прапанаваць у якасьці нацыянальных страў? Ці вычэрпваецца вырабамі з саломкі магчымасьць аформіць хатні інтэр'ер «у нацыянальным стылі»?

Нізкі ўзровень культуры ў Беларусі — як «духоўнай», так і «матэрыяльнай» — выяўляецца ў неразборлівасьці, непатрабавальнасьці да якасьці жыцьця, калі чалавеку (спажыўцу) усё роўна, у якім доме ён жыве, якую кілбасу-сыр-бульбу есьць, якое віно-піва п'е, якія відовішчы глядзіць, дзе вучацца ягоныя дзеці і г.д. Новыя тэхналёгіі апрацоўкі мазгоў праз mass media не спрыяюць выхаваньню разборлівасьці (высокай культуры) — у гэтым сэнсе яны дзейнічаюць інстынктыўна-салідарна з ідэалягічным апаратам таталітарнай дзяржавы — ва ўсім сьвеце, ня толькі ў Беларусі.

Рост дабрабыту, які апошнім часам назіраецца ў краіне, зусім не абавязкова вядзе да беларусізацыі, да росту масавай увагі да нацыянальнай культуры. Аднак сёньня менавіта спажывецкі рынак — найбольш пэрспэктыўная пляцоўка для рэалізацыі сапраўды жыцьцяздольных беларускіх культурных праектаў. Культура, не ўвасобленая ў спажывецкіх шаблёнах, ня можа быць здольнай да самастойнага існаваньня і непазьбежна расчыняецца ў суседніх, не абавязкова больш дасканалых, культурах. Ад таго, ці здолее беларушчына сфармуляваць уцямны message для масавага спажыўца, залежаць яе шанцы на выжываньне. «Мова» і «кілбаса» мусяць нарэшце спыніць варажнечу, заключыўшы, паводле Ю.Дракахруста, «Жэнэўскую канвэнцыю».

**Алесь Белы**

**У нумары:**

Павал Шпілеўскі **Ніжні рынак у Менску.** Аляксей Шаланда, Алесь Белы **Добрымі былі часы, калі за паўтарак былі дзьве каўбасы.** Зьміцер Дзядзенка **Дзедка сьвіньку ўбіў.** Алесь Доўнар **Масты ў паўтара пруты.** Іван Сінчук **Як грошы носяць і даўней насілі.** Ды іншыя артыкулы.

# Рэфэрэндум дадаў напругі

Працяг са старонкі 1.

Але аддзяліць ад яго выбарчую кампанію немагчыма. Ініцыятыўныя групы маюць праводзіць агітацыю «ад дзьвярэй да дзьвярэй». «Іншага выйсьця ў нас няма, бо ў беларускія СМІ нас не пускаюць, а ў расейскіх свая палітыка», — кажа А.Лябедзька. Апрача таго, падчас выбарчай кампаніі, магчыма, пройдзе чарговы Кангрэс дэмакратычных сіл.

Партыя БНФ таксама арыентуецца на сустрэчы з выбарцамі. Патэнцыйныя кандыдаты ад яе ўжо цяпер падаюць заяўкі і на пікеты ў акругах. Намесьнік старшыні ПБНФ Віктар Івашкевіч лічыць, што ўлады будуць вымушаны дазволіць пікеты ня толькі ў «рэзэрвацыях». Сур’ёзна партыя паставілася да тэле- і радыёвыступаў кандыдатаў: усе патэнцыйныя прэтэндэнты прайшлі трэнінг у народнай артысткі Беларусі Зінаіды Бандарэнкі й рэжысэра Валер’я Мазынскага. Апрача таго, ПБНФ мае выставіць на выбары дзьве тысячы назіральнікаў.

На 10 кастрычніка «пяцёрка» пляную агульнабеларускую вулічную акцыю, на якую ўжо падаюцца заяўкі. А.Лябедзька лічыць, што гэта будзе «пратэставая хваля». Другая вялікая акцыя адбудзецца ў Менску 18 кастрычніка — падвядзеньне вынікаў.

Лідэр Народнай Грамады Мікалай Статкевіч падтрымлівае акцыю 18 кастрычніка, але сумняецца ў эфэкце акцыі 10-га: «Калі нас будзе мала, гэта будзе нагода для афіцыйнай прапаганды. Калі ж нас будзе многа, дык могуць быць разнастайныя правакацыі. І тады прапаганда будзе казаць, што апазыцыя імкнецца да беспарадкаў. Лукашэнку для перамогі заўжды трэба спарынгпартнэр. Дык цяпер трэба пакінуць яго сам-насам, каб яму не было з кім змагацца». Вялікі спадзеў Статкевіч ускладае на назіраньне, лічыць яго галоўным у гэтай кампаніі: «Рашэньне Лукашэнкі правесьці рэфэрэндум цяпер — яго памылка».

У масавых фальсыфікацыях падчас рэфэрэндуму не сумняюцца «зуброўцы». Прэс-сакратар «Зубра» кажа, што сябры арганізацыі выйдуць на вуліцу 18 кастрычніка.

Антырэфэрэндумная кампанія з падачы «Пяцёркі+» ужо набыла дэвіз — «Скажам Лукашэнку НЕ!» У нэце нават зьявіўся сайт (http://skazhem.net).

Адзіная партыя, якая пасьлядоўна выступае за байкот рэфэрэндуму і выбараў, — КХП-БНФ. Паводле інфармацыі «НН», яе сябры рыхтуюць групы, якія будуць хадзіць па кватэрах і агітаваць людзей не ісьці на галасаваньне.

Сваім прыярытэтам назвала рэфэрэндум і грамадзянская ініцыятыва «Партнэрства». На яе структуры мае абапірацца пры грамадзкім назіраньні грамадзкі аргкамітэт «За справядлівыя выбары», узначалены на мінулым тыдні акадэмікам Аляксандрам Вайтовічам.

Тым часам намесьнік старшыні АГП Яраслаў Раманчук зьняў сваю кандыдатуру ў 108-й акрузе Менску на карысьць намесьніка старшыні ПБНФ Юр’я Хадыкі й лідэра БСДП (НГ) Мікалая Статкевіча. У Горадні кіраўнік мясцовай філіі АГП Уладзімер Чырвоненка саступіў акругу №51 актывісту ПБНФ Сяргею Антусевічу.

Праўда, пакуль кандыдаты-дэмакраты зазнаюць перашкоды ў перадвыбарнай гонцы. Паводле інфармацыі кандыдата ад АГП Яўгена Лабановіча, рыхтуецца масавая нерэгістрацыя кандыдатаў ад дэмпартый, каб не даваць ім эфіру перад выбарамі. Вынікі рэгістрацыі стануць вядомыя ў чацьвер.

**Аркадзь Шанскі**

## Пра рэфэрэндум

Адбылося тое, чаго даўно чакалі. І ня трэба, як сп.Оргіш у «Народнай волі», крычаць, што «Аляксандар Лукашэнка нарэшце пераступіў тую нябачную мяжу, якая ўсё ж аддзяляла яго «ад азіяцкіх правадыроў, Фідэля Кастра, Муамара Кадафі». Нічога падобнага ў нас ня будзе. І мэнталітэт ня той, і маштаб першых асоб не супадае. А будзе наш звыклы палітычны Чарнобыль зь яго трыма кітамі — хамствам, хлусьнёй, халуйствам.

Нехта скажа: галоўнае, што ўсё ў нас спакойна, стабільна. А прыйдзе нехта новы — прынясе новыя праблемы. Усё так. Але ці ёсьць у нас гэтая стабільнасьць? Ці можа яна быць, калі сам прэзыдэнт ня можа вызначыцца з уласнай палітычнай лініяй — гаворыць то пра незалежнасьць, то пра саюзную дзяржаву. А той «саюзьнік» не хавае сваіх намераў нас праглынуць, як у маленькіх адбірае газавую «цукерку». А «бацька» нічога ня можа зрабіць, бо іншыя шляхі ён сам адрэзаў. Яму застаецца плакаць сьлязьмі халопа, якога пан «барын» б’е за верную службу, і адыгрывацца на падначаленых. На нас.

**Вацлаў Шаблінскі, Менск**

## Якія заслугі расейскага разьведчыка перад Беларусяй?

Раман Якаўлеўскі



Галоўнай прычынай уручэньня ордэна Скарыны Вячаславу Трубнікаву стаў ягоны 60-гадовы юбілей. Аднак юбілей быў у красавіку, а Лукашэнка ўзнагародзіў расейскага генэрала толькі пасьля таго, як 3 жніўня Трубнікава вызвалілі ад пасады першага намесьніка замежных спраў Расеі і назначылі пасломм у Індыі. Відаць, узнагарода знайшла свайго героя за нейкія мінулыя заслугі.

10 студзеня 1996 г. Трубнікаў быў назначаны дырэктарам Службы замежнай разьведкі РФ, зьмяніўшы Яўгена Прымакова. Трубнікаў заўсёды лічыўся і лічыцца членам каманды Прымакова. У студзені 1998 г. ён стаў генэралам арміі. Дагэтуль ніводзін з кіраўнікоў расейскай разьведкі не ўдастойваўся такога высокага воінскага званьня. Цікава, што дагэтуль цыркулюе няясная інфармацыя пра тое, што ў 1999 г. Трубнікаву было нададзена званьне Героя Расеі.

З прыходам Пуціна ў Крэмль у 2000-м Трубнікаў аказаўся на пасадзе першага намесьніка міністра замежных спраў, курыруючы справы СНД.

Што мог ён зрабіць карыснага для Лукашэнкі? За гады работы дырэктарам СЗР — шчодра дзяліцца замежнай інфармацыяй. Асабліва той, што датычыла суседзяў Беларусі, якія зрабіліся членамі NATO. Бо рэшткі савецкай агентуры за мяжой, як і ўласнасьць былога СССР, перайшлі да РФ. Ну, а стаўшы ў МЗС куратарам СНД, — дзейсна прыкрываць Лукашэнку ў міжнародных структурах. Бо СНД таксама ж лічыцца адной з такіх структур.

Ня выключана, што ўзнагарода магла быць уручана ня толькі за мінулае. Вядома, што Індыя зьяўляецца адным з найбуйнейшых пакупнікоў вайсковай тэхнікі. У Беларусі з Расеяй ёсьць цэлыя праграмы сумеснага абароннага заказу. І роля расейскага пасла ў Дэлі (Трубнікаў у 80-х гадах кіраваў рэзыдэнтурай савецкай разьведкі ў Індыі пад прыкрыцьцём журналіста) уяўляецца значнай.

Узнагародзіўшы новага расейскага пасла, Лукашэнка можа разьлічваць на далейшае цеснае супрацоўніцтва з так званай камандай Прымакова. Дарэчы, кажуць, што патрыярх расейскай палітыкі Прымакоў рэгулярна дзеліцца з Пуціным сваімі прагнозамі адносна разьвіцьця сытуацыі ў Беларусі.

# Пуцін запаволенага дзеяньня

Працяг са старонкі 1.

Радыюс пагрозы непасрэдна залежыць ад колькасьці наяўных, якія патэнцыйныя нападнікі здольныя заплаціць на блёк-пасту. Нават пры Ельцыну столькі цывільных асоб за дзесяць дзён у Расеі (па-за Чачнёй) ня гінула.

Аднак адкрыта сказаць, што вайна ў Чачэніі і курс на «жорсткую руку» ўнутры Расеі зьяўляюцца непасрэднымі чыньнікамі як усплёску тэрарызму, так і бездапаможнасьці перад ім — значыць расьпісацца ва ўласным банкруцтве, прычым як Пуціну, так і расейскаму грамадзтву, што паставіла на яго. Таму чарговая кампанія па закручваньні гаек і ўзмацненьні аўтарытарнага характару дзяржаўнай улады ў Расеі выглядае як лягічны працяг палітыкі калектыўнага самападману. Перавод стрэлак — асноўная частка такой палітыкі.

Апошнія ініцыятывы Пуціна (пераход да практыкі прызначэньня губэрнатараў і выбараў выключна па партыйных сьпісах) прымушаюць думаць, што ў Крамлі вырашылі «прызначыць» вінаватымі губэрнатараў і дэпутатаў.

Цікава, што гэта адбываецца на фоне дэманстратыўнай адмовы ад публічнага расьсьледаваньня бэсланскай разьні. Відавочна, што вынішчаюцца апошнія падмуркі незалежнай, несанкцыянаванай Крамлём публічнай палітычнай дзейнасьці.

У выпадку з губэрнатарамі ўсё зразумела, зьмена выбарчай сыстэмы патрабуе крыху больш камэнтароў. Вядома, напрыклад, што беларускія дэмакраты сьпяць і мараць аб тым часе, калі нарэшце будзе ўведзена прапарцыйная сыстэма. Аднак, як гаворыць досьвед той жа Расеі, ва ўмовах аўтарытарна-бюракратычнай сыстэмы і манаполіі на агульнанацыянальныя СМІ кіраваць ёю нават прасьцей, чым аднамандатнымі акругамі (не забывайце, што прахадны бар’ер у Расеі таксама хутка павысяць). Шанцы прарвацца для нязгодных, такіх, напрыклад, як Уладзімер Рыжкоў, застаюцца толькі па акругах. Навошта, здавалася б, выбары пад кантролем? Але расейская ўлада, відаць, ужо дайшла да таго ж стану, што і беларуская, — калі нават адзін-два нямоцныя галасы пратэсту «ў сыстэме» ўспрымаюцца як пагроза. Такім чынам, без блаславеньня Крамля ў расейскую палітыку больш не ўвайсьці ні па вэртыкалі, ні па гарызанталі. Крытыкаў стане менш. Бездапаможнай уладзе будзе лягчэй быць безадказнай.

Якія, аднак, могуць быць вынікі гэтых крокаў? Сярод шматлікіх аспэктаў і нюансаў вылучу два.

Па-першае, апроч разбурэньня апошніх атрыбутаў нават фармальнай, дэкаратыўнай і «кіраванай» дэмакратыі, Расея губляе свой фэдэратыўны характар. У монанацыянальнай краіне гэта можна было б назваць стварэньнем унітарнай дзяржавы, у шматнацыянальнай і поліканфэсійнай Расеі — гэта фактычна паварот да імпэрскага ладу палітычнага жыцьця. Шматлікія нацыянальныя меншасьці могуць неўзабаве страціць сваіх прадстаўнікоў у цэнтральнай уладзе (дагэтуль кожны рэгіён абіраў мінімум аднаго дэпутата ў Думу, цяпер гэта неабавязкова. Безумоўна, Крэмль будзе ціснуць на партыі, каб у іх сьпісах зьяўляліся татары, калмыкі і чачэнцы, але гэта будуць іншыя, прызначаныя Масквой, а ня выбраныя народам прадстаўнікі). А на месцах улада можа канчаткова перайсьці да піцерскіх гэбістаў і іншых сілавікоў самага рознага гатунку. Рэзка ўзрастае небясьпека таго, што ў сьвядомасьці «нацменаў» будзе праведзена тлустая рыса паміж імі самімі і «расейскай» уладай (асабліва калі паводле ўкаранёнай традыцыі гэбэшнікі-губэрнатары будуць паводзіць сабе як тыя мядзьведзі на ваяводзтве). Чым гэта можа пагражаць Расеі з пункту гледжаньня бясьпекі і тэрарыстычнай сытуацыі — мяркуйце самі.

Па-другое, на Пуціна ўскладаецца дадатковы цяжар кадравай палітыкі. Пры гэтым любыя промахі і памылкі новых рэгіянальных уладаў будуць аўтаматычна сьпісвацца на Крэмль, гэта значыць на самога расейскага прэзыдэнта. Паралельна з гэтым павялічваецца і яго залежнасьць ад найбліжэйшага атачэньня, якое будзе «дапамагаць» гэтую палітыку праводзіць. Як вынік, адбываецца чарговае ўзмацненьне сілавікоў, але на гэты раз, як ні парадаксальна, за кошт самога Пуціна. Вядома, што пры такой унутранай архітэктуры ўлады ніякіх публічных расьсьледаваньняў новых тэрактаў ня будзе. У сілавікоў канчаткова разьвязваюцца рукі, а ў грамадзтва — затыкаюцца раты. Стаўка робіцца на тых, хто «мочыць у сарціры», прамаргаўшы пры гэтым Бэслан, чэрвеньскую разьню ў Інгушэціі, на тых, хто да апошняга адмаўляўся прызнаць жнівеньскія авіякатастрофы тэрактамі…

Пры найгоршым варыянце разьвіцьця падзей (а яго ня варта сьпісваць з рахунку, зважаючы на тое, як дагэтуль «стабілізавалі сытуацыю» і «перамагалі тэрарызм») пуцінскія ініцыятывы могуць закласьці міну запаволенага дзеяньня калі не пад усю Расею, дык пад Паўночны Каўказ. Але паколькі рэформа ўлады фактычна адбудзецца ў 2006—2007 г. (дзейным губэрнатарам і дэпутатам дазволяць дасядзець іх тэрміны), «расхлёбваць» наступствы давядзецца ўжо пераемніку. Хаця чаму пераемніку? Калі Пуцін штосьці так грунтоўна рэфармуе, магчыма, ён гэта робіць «пад сябе»? Тады ня дзіва, што Масква паглядзела скрозь пальцы на тое, што здарылася ў Беларусі 7 верасьня. Можна лічыць, Лукашэнку зноў пашанцавала: пры такіх стаханаўскіх тэмпах пабудовы дыктатуры ў Расеі хто зьверне ўвагу на ягоны рэфэрэндум?

## ВОДГУКІ

### Пра Лявона-прэзыдэнта

Ня першы раз чытаю артыкул, дзе дарослыя дзядзькі правакацыйна выстаўляюць Л.Вольскага прэзыдэнтам. Гэта ня можа не абурацьсваёй нелягічнасьцю. Варта ж гэта аднаму чалавеку знайсьці сваё месца, уладкавацца — і ўсе будуць ім у думках затыкаць усе бочкі без затычак! Хопіць! Лявон — Юпітэр ці проста Пярун, але ў сваім коле. І там ягонае месца. І застаецца толькі паціснуць плячыма, калі замест таго, каб выставіць годнага кандыдата, дарослыя дзядзькі толькі ўздыхаюць: «Ой, вось бы нам такога прэзыдэнта!» Гэта не Лявона трэба цягаць сюды-сюды, а палітыкам паводзіць сябе па-лідэрску.

**Ганна Шыраканава, yahoo.co.uk**

### Не адзін, ня два, ня тры...

Зьдзівіў цыганскі праваабаронца Мікола Калінін, які ў №33 казаў пра «стопрацэнтную інтэграцыю, стопрацэнтную асыміляцыю» габрэяў. Па-першае, названыя паняцьці ў сацыялёгіі абазначаюць зусім нятоесныя зьявы: асыміляцыя — зьліцьцё зь іншым этнасам, інтэграцыя — частковае засваеньне чужынскіх культурных нормаў пры захаваньні ўласных каштоўнасьцей. Па-другое, беларускія яўрэі не асыміляваныя, аб чым сьведчыць сам сп.Калінін: «Ніхто зь іх сябе габрэем лічыць не перастаў». Калі група мае саманазву й самасьвядомасьць, аб якім стопрацэнтным зьліцьці зь іншай групай можа йсьці гаворка? Хоць, безумоўна, мелася вялікая доля праўды ў словах ідышысцкага паэта Гірша Рэлеса, сказаных у «Анахну кан»: «Яўрэі цяпер моцна асыміляваныя і схіляюцца да поўнай асыміляцыі». Аднак жа мову ідыш мы захавалі, хай і не ў такой ступені, як цыганы цыганскую або палякі польскую. Дарэчы, у жніўні ў выдавецтве «Логвінаў» выйшла першая ў Беларусі за 50 зь лішнім гадоў кніжка на ідыш — мэмуары Рэлеса аб яўрэйскіх пісьменьніках мінуўшчыны.

У артыкуле С.Носава «Як зьлічыць габрэяў?» нямала неправераных зьвестак. Той, хто дакажа блізкаўсходнім чыноўнікам, што яго дзед — яўрэй, бязь цяжкасьцей набывае грамадзянства ў Ізраілі, для гэтага нікому не абавязкова рабіць абразаньне. Разыходжаньні ў лічбах сапраўды ёсьць: ня толькі ў Беларусі, а і ў сьвеце ня ведаюць ліку яўрэйскага насельніцтва. Мо яшчэ й таму, што старажытная традыцыя забараняе ўголас падлічваць яўрэяў, каб не наклікаць ліха. Прыняты хіба такі мэтад падліку: «Не адзін, ня два, ня тры…»

**Вольф Р., Менск**

# На Маскоўскім фронце нічога новага

## Суб’ектыўныя нататкі з канфэрэнцыі, дзе гаварылася пра Беларусь

Пётра Садоўскі

Не было пытаньня — ехаць ці не ехаць, хаця летась беларускіх удзельнікаў падобнай канфэрэнцыі наша тэлебачаньне заклеймавала як паклёпнікаў, а КХП БНФ — як маскоўскіх калябарантаў.

Натуральна, што ілюзій наконт нейкіх карэнных зьменаў не было: геапалітыка не мяняецца за год. Аднак хацелася пачуць нешта зь першых рук. Кулюары сочынскай сустрэчы Пуціна і Лукашэнкі, Бесланская трагедыя, чаканьне пуцінскіх адміністрацыйных навацый, 3-я гадавіна тэракту ў ЗША, лёсаносныя выбары на Ўкраіне, жаданьне Лукашэнкі ісьці на трэці тэрмін, заява наконт гэтага расейскага МЗС — усё гэта складала пэўную інтрыгу.

Сьвідравала сумленьне няёмкасьць за тое, што «саюзная» Беларусь у асобе свайго прэзыдэнта прадэманстравала цынізм, выкарыстаўшы публічна трагічны для Расеі момант для вырашэньня сваіх амбіцыйных праектаў.

Першыя ўражаньні камфорту і гармоніі — фірмовы цягнік, ветлівая сустрэча, пераезд чысцюткім аўтобусам у прыстойны гатэль з канфэрэнцзаляй — зьмяняюцца знаёмым пачуцьцём беларускай прыкрасьці і мэлянхоліі. Разам з матэрыяламі канфэрэнцыі атрымліваем копію артыкулу сп.Караганава з «Российской газеты» за 9 верасьня, дзе аўтар гаворыць, што «Расея ня будзе ўмешвацца на ўнутраныя справы Беларусі, пакуль там усё праходзіць легітымным шляхам», ды цешыць загалоўкам, што «пастанова пра рэфэрэндум — гэта яшчэ ня выбары». Я добра памятаю «легітымныя элегантныя» прэзыдэнцкія выбары 2001 г., з вынікам якіх Пуцін віншаваў Лукашэнку. На ўчастку ў школе на вул.Гвардзейскай, дзе я быў назіральнікам і арганізаваў прысутнасьць замежных журналістаў пры падліку галасоў, Лукашэнка прайграў Ганчарыку 41:46, а назаўтра намесьнік Ярмошынай сп.Лазавік па радыё заявіў, што ў Менску такога не было.

Калі ж Расея сплаціць доўг за ўмяшальніцтва і за падтрымку канстытуцыйнага перавароту ў лістападзе 1996 году?

З прэзэнтаванай літаратуры адразу выбіраю часопіс сьвежых аналітычных матэрыялаў «Вестник аналитики» (№3 за 2004 г.), які пачынаецца рэфлексіямі Аляксандра Цыпка (галоўны навуковы супрацоўнік Інстытуту міжнародных дасьледаваньняў РАН) «Развагі аб прыродзе і прычынах краху постсавецкага лібэралізму». Пакуль ідзе рытуальны пачатак канфэрэнцыі, пасьпяваю прачытаць на старонцы 9 і пра «магчымае дзяржаўнае аб’яднаньне Расейскай Фэдэрацыі зь Беларусьсю»: «Што дрэннага ў аднаўленьні натуральных… нацыянальных, канфэсіянальных межаў на Захадзе, шматвекавой мяжы ў Берасьці… калі б дзесяць мільёнаў адукаваных, працалюбівай Беларусі, сярод насельніцтва якой больш за чвэрць расейцаў, зьлілося ў адзіную дзяржаву? Нічога!» Сапраўды, для Расеі зусім нічога дрэннага. Прыгадаўся адразу гістарычны кур’ёз, калі Ельцын медзьведзявата-хамавата перад паездкай у Віскулі, выступаючы ў Вярхоўным Савеце XII скліканьня, падараваў беларусам гістарычную карціну «Ўзяцьце расейскімі войскамі Смаленску». Тады на маё абуранае зьдзіўленьне міністар замежных справаў Козыраў адрэагаваў так: «Але ж мы вас тады ад літоўцаў вызвалілі…»

### «Выратуе сумленны намэнклятуршчык»

Усе расейскія выступоўцы, за выключэньнем хіба намесьніка старшыні камісіі Дзярждумы ў замежных справах сп.Юлія Квіцынскага ды сп. А.Падбярозкіна (цяпер дзяржслужбовец Падлікова палаты РФ), гаварылі аб браку дэмакратыі беларускага прэзыдэнта і яго магчымым сыходзе.

Дыскусію распачаў галоўны рэдактар незалежнага інтэрнэт-дайджэсту «Putin.ru» І.Царык, які па-пазытыўістычку альгарытмічна-структуравана выклаў сваё бачаньне пэрспэктываў сацыяльна-палітычнага разьвіцьця ў Беларусі пасьля кастрычніцкіх выбараў, падмацаваўшы ўсё прыгожымі схемамі. З магчымых 4 камбінацый складу парлямэнту і галасаваньня за нядобрага Лукашэнку, паводле сп.Царыка, нас не чакае нічога добрага. Асабліва небясьпечныя спробы карэннай зьмены элітаў. Тады — катастрофа.

І адсюль выснова: больш пэрспэктыўны варыянт — з прэзыдэнтам намэнклятурнага тыпу, але прагрэсіста «з чалавечым тварам». Гэта прыблізна тое, што даводзіў прэзыдэнт Кучма сваім землякам на Дзень незалежнасьці.

І расейскі бок, і нашы прысутныя лібэральныя аналітыкі, спасылаючыся на досьвед постсавецкага кіраваньня ў СНД, без энтузіязму ўспрынялі канцэпцыю пошукаў лідэраў зь ліку ненамэнклятурнай новай генэрацыі палітыкаў, якія праз працяглую базавую працу набылі досьвед і аўтарытэт у няўрадавых структурах грамадзянскай супольнасьці. У прыватнасьці, прыводзіўся прыклад Віктара Карніенкі з Гомелю, які лёгка сабраў 12 000 подпісаў выбарчыкаў.

На мой погляд — пра што я спрабаваў давесьці ў час дыскусіі — «пазытывісцкая» канстатацыя непазьбежнасьці выхаду на палітычную авансцэну новых прадстаўнікоў з калянамэнклятурнай абоймы вядзе да насаджэньня духу пэсымізму і замбуе грамадзян нявер’ем у перамены.



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**Пётра Садоўскі, былы пасол Беларусі ў Нямеччыне (1992—1994)**

«Відаць, надышла пара закрываць гэтую шахрайскую крамку пад назвай «Саюзная дзяржава» і пераходзіць да простых двухбаковых дагавораў»

**Тэма:** стан і пэрспэктывы расейска-беларускіх узаемадачыненьняў.

**Арганізатар:** расейская НА «Рада замежнай і абароннай палітыкі« (старшыня Прэзыдыюму Рады — Сяргей Караганаў).

**Месца:** гатэль «Арбат» (належыць адміністрацыі Прэзыдэнта РФ).

**Фармат:** 29 расейскіх і 15 беларускіх удзельнікаў. Аналітыкі, прэса, прадстаўнікі партый, дэпутаты. Праводзіцца ў межах праекту «Расея—Беларусь». Існуюць яшчэ падобныя праграмы з Украінай, Балтыяй, Японіяй і г.д. Рада ладзіць таксама сустрэчы і кансультацыі з афіцыйнымі асобамі.

На гэты раз адбылася сустрэча з упаўнаважаным у правах чалавека пры прэзыдэнту РФ Уладзімерам Лукіным.

### «З заходнікамі нам не па дарозе...»

Так ляпідарна выказаўся дзяржаўнік Ю.Квіцынскі, дэпутат Дзярждумы і былы дыплямат-германіст. «Не чакайце ад нас падтрымкі, тым, хто глядзіць на Захад. Такіх будзем выцясьняць з палітычнага поля нашых адносінаў…» Гэта была рэакцыя на выступ беларускага праваабаронцы, які яшчэ падкрэсьліў, што ён каталік і, назіраючы за моладзьдзю, бачыць, што вырастае новая генэрацыя, якая хоча жыць у адкрытым грамадстве.

Былі й мэсіянскія рэфлексіі наконт агульных глябальных задач саюзу Беларусі і Расеі (ужо згаданы сп.Падбярозкін), на што прагучаў выдатна аргумэнтаваны эканамічны статыстыкай, бязь ценю палітызаванасьці пасаж нашага аналітыка Леаніда Заікі, які гаварыў пра неабходнасьць дывэрсыфікацыі беларускага экспарту і крыніцаў атрымыньня энэрганосьбітаў.

Параўноўвалася практыка бюракратычных рагатак «саюзнай дзяржавы» і простых узаемадачыненьняў з суседкай Украінай. Выходзіла, што простаму чалавеку зь Беларусі лягчэй вырашаць практычныя пытаньні ва Ўкраіне, чым, напрыклад, у сталіцы «саюзнай дзяржавы». Уражаны мадэратар пасяджэньня з расейскага боку падсумаваў пачутае так: «Відаць, надышла пара закрываць гэтую шахрайскую крамку пад назвай «Саюзная дзяржава» і пераходзіць да простых двухбаковых дагавораў».

### «Мы — краіна ў стане вайны»

Трывожным і калючым, як восеньская Масква, быў выступ прадстаўніка ТАА «Расейскі алюміній» А.Фёдарава. Мне асабіста пачуліся ноткі трывогі з поля расейскіх багатых людзей, «роўна- і няроўнааддаленых» ад улады. Гаварылася: пакуль экономіка трымаецца ў росьце, у Пуціна ёсьць году паўтара на замежную палітыку. Пакуль больш наўдач. Можам страціць Украіну. Няма моцнай структуры ўлады. Калі б Пуцін заўтра памёр, усё б адразу абвалілася. «Адзіная Расея» — хімэра. Яна б развалілася на другі дзень. Там кожны глядзіць толькі свой інтэрас. За Пуціным толькі тыя структуры, зь якіх ён выйшаў, але і там цяпер няма адзінства. Расея — кволы хрусталь, які няможна пасунуць ні на мілімэтр управа ці ўлева. Хутка пойдуць цэлай плынью лісты да Пуціна з просьбай ісьці на трэці тэрмін. У яго няма выйсьця. Ён і ўсе мы будзем глядзець, што выйдзе ў Беларусі. Лукашэнка — у пэўным сэнсе ледакол для Пуціна…

Што да Беларусі, то Захад «ня хоча займацца вамі сваімі рукамі. Ім лепш рабіць усё нашымі рукамі. Магу меркаваць па маіх нямецкіх уплывовых знаёмых».

Шмат праўды ў гэтых словах — адразу думаеш, якую сьцежку выбіраць. Хаця ёсьць доля патрыятычнага і карпаратыўнага замбаваньня.

### «Выключыце, калі ласка, дыктафон»

Гэта была просьба расейскага амбудсмэна Лукіна падчас спэцыяльна арганізаванай сустрэчы. Лібэралдзяржаўнік як заўжды тонка жартаваў, тройчы цытаваў паэтычныя максымы тыпу афарызмаў Шэксьпіра ды Амара Хаяма. Уступная прамова была прасякнута трывогай за магчымае ўсыханьне расейскай дэмакратыі пасьля тэрактаў. Як станоўчы прыклад ён прыводзіў ЗША ды Гішпанію, дзе дэмакратычныя інстытуты засталіся недатыкальныя, а ўсе зьмены закранулі толькі арганізацыйныя структуры.

Калі ж пачаліся пытаньні зь беларускага боку наконт ягонага стаўленьня да захаваньня правоў чалавека ў Беларусі як часткі «саюзнай дзяржавы», да асобы нашага прэзыдэнта, сп.Лукін папрасіў выключыць дыктафон. Матыў: геапалітыка — цынічная рэч, і ня ўсё можна гаварыць услых. Беларускі прэзыдэнт яму асабіста не падабаецца, ён нават аднойчы рэзка крытыкаваў палітыка Лукіна за ягоныя лібэральныя выказваньні. Але ж беларусы не прапаноўваюць нікога лепшага. Гэты — нядобры таварыш, але ж наш расейскі сябар. (Лексыка была з крылатых выразаў вядомых палітыкаў.) Уласна кажучы, нічога новага…

Масква ўвосень шэрая і непрыветная. У мэтро раз-пораз нагадваюць пра небясьпеку тэрарыстычных актаў. У краіне грамадзянская вайна. Не хочацца ў «саюз» з такім суседам. Перад Воршай раніцай зь цягніка я ўбачыў сьветлае неба…

## ХРОНІКА СУПРАЦІВУ

20 жніўня Мінінфармацы прыпыніла выхад **«Предпринимательской газеты»**: маўляў, тая зьмяніла тэматыку і пэрыядычнасьць выхаду, не паведаміўшы ў міністэрства. 24 жніўня міністэрства прыпыніла выданьне газэты **«Время»** на 3 месяцы (маўляў, праблемы зь юрыдычным адрасам). 31 жніўня Менскі абласны суд адхіліў скаргу актывісткі АГП **Людмілы Шчарбовіч** з Жодзіна на дзеяньні аблвыканкаму і аблсавету пры фармаваньні акруговых камісій. Актывіст АГП зь вёскі Чысьць Маладачанскага раёну **Ўладзімер Зьвернік** 31 жніўня быў звольнены з працы, пасьля таго як вырашыў балятавацца ў дэпутаты. З 1 верасьня ў Жодзіне ліквідавалі адзіную ў горадзе трэцюю **беларускамоўную клясу**. У Гомелі **Беларуска-славянская гімназія імя Івана Мележа** (адзіная беларускамоўная школа) перайшла зь верасьня на выкладаньне прыродазнаўчых дысцыплін па-расейску. Юрыст міжрэгіянальнай незарэгістраванай праваабарончай арганізацыі «Вясна Паазер’я» **Аляксей Лукашэвіч** 2 верасьня аштрафаваны на 3 б.в. за ўдзел 3 ліпеня ў грамадзкім галасаваньні наконт трэцяга прэзыдэнцкага тэрміну. 2 верасьня Крычаўскі суд аштрафаваў сябра БСДГ, патэнцыйнага кандыдата ў дэпутаты **Мікалая Гердзія** за абразу сакратаркі выбарчай камісіі на 1 б.в. Мінюст 3 верасьня зноў адмовіў у рэгістрацыі **Партыі свабоды і прагрэсу**, прычына — «парушэньне парадку стварэньня партыі». Ад старшыні Лагойскай суполкі ПБНФ **Зьмітра Шэвеля** чыноўнікі Лагойскага райвыканкаму 3 верасьня запатрабавалі звольніцца з працы альбо зьняць сваю кандыдатуру з выбараў. Цэнтральны суд Менску 6 верасьня не задаволіў скаргі адвакаткі **Веры Страмкоўскай**, якая прасіла прызнаць далейшае ўтрыманьне **Міхаіла Марыніча** пад вартай незаконным, Страмкоўская зьвярнулася са скаргай у Вярхоўны суд. 7 верасьня патэнцыйны кандыдат у дэпутаты **Зьміцер Бародка** атрымаў у пашпарце штамп, які дазваляе выезд за мяжу, але 13 верасьня яго змусілі звольніцца з працы. Вярхоўны суд 7 верасьня пакінуў правамоцным папярэджаньне, вынесенае Мінюстам на адрас **ПКБ** за ўдзел у кааліцыі «5+». Актывіст «Маладога фронту» **Зьміцер Дашкевіч** быў асуджаны на 10 сутак арышту за тое, што 7 верасьня на мітынгу на Кастрычніцкай плошчы скандаваў «Ганьба!» падчас абвяшчэньня рэфэрэндуму. Кватэру актывіста АГП, намесьніка дырэктара выдавецкага дому «Время» **Аляксандра Цынкевіча** 7 верасьня тройчы наведалі супрацоўнікі міліцыі. Пры распаўсюджваньні газэты «Зубр» у Менску былі затрыманыя актывісты аднайменнай арганізацыі **Максім Н.**, **Алена М.** і **Аляксей С.** Прафсаюз **РЭПАМ** 7 верасьня зьвярнуўся ў Вярхоўны суд са скаргай на рашэньне Мінюсту аб адмове ў рэгістрацыі зьмен і дадаткаў у статут арганізацыі. Прэтэндэнтцы ў кандыдаты ад БСДП (НГ) **Вользе Карач** Віцебская акруговая камісія №19 вынесла папярэджаньне. У Воршы 8 верасьня кіраўніцтва гарадзкога цэнтру культуры забараніла менскай суполцы **«Пагоня»** і аршанскаму клюбу **«Рэнэсанс»** праводзіць раней узгодненую мастацкую выставу да 490-х угодкаў Аршанскай бітвы. Праваабаронца **Валер Шчукін** быў зьбіты 8 верасьня ў Менску невядомымі, якія не забралі ў яго ніякіх рэчаў. Акруговая камісія Глыбоцкай акругі 9 верасьня адмяніла папярэджаньне прэтэндэнту ад ПБНФ **Яраславу Берніковічу**. За распаўсюд газэты «Зубр» 9 верасьня затрыманы актывісты аднайменнай арганізацыі **Аляксей Шыдлоўскі**, **Аляксандар Атрошчанкаў**, **Надзея Халадзінская**, **Марына Лебедзева**, **Максім Громаў**, **Дар’я Малдаванава**, **Аляксандар Ушко**, **Аляксей Ляўковіч**, на ўсіх склалі пратаколы. Ляўковіча затрымалі паўторна 11 верасьня і аштрафавалі на 30 б.в. У Гомелі 11 супрацоўнікаў КДБ і міліцыі сарвалі **сэмінар маладых сацыял-дэмакратаў**, прысьвечаны рэфэрэндуму і парлямэнцкім выбарам. Асабліва цікавіліся сацыял-дэмакратам са Швэцыі **Альбэнам Даленам**, якога завялі ў асобны кабінэт, пыталі пра мэту візыту ў Беларусь, здымалі на відэакамэру. 11 верасьня супрацоўнікі міліцыі й абласной управы юстыцыі, спасылаючыся на тэракты ў Маскве, правялі праверку **гарадзенскай сядзібы БНФ «Адраджэньне»** падчас сустрэчы актывістаў арганізацыі з прадстаўніком ГА «Партнэрства». Падчас пасяджэньня сойму **ПБНФ** 11 верасьня міліцыянты акружылі сядзібу партыі, затрымлівалі й абшуквалі тых, хто зь яе выходзіў. Старшыня Вярхоўнага суду Валянцін Сукала 14 верасьня адхіліў скаргу кіраўніка **Беларускай партыі працы** Аляксандра Бухвостава на рашэньне ВС пра ліквідацыю партыі. Па 20 б.в. штрафу атрымалі 14 верасьня **Яўген Валадзько**, **Сяргей Ададураў** і **Вячаслаў Сінгараў** за несанкцыяваны пікет у Салігорску супраць трэцяга прэзыдэнцкага тэрміну.

**АШ**



AN. ANGELICO ДЛЯ ЧАСОПІСУ «СТУДЭНЦКАЯ ДУМКА»

**Менская паэтка Вальжына Морт атрымала прыз на Міжнародным літаратурным фэстывалі «Віленіца-2004», які праходзіць у Славеніі. Форум сабраў 150 паэтаў з 29 краінаў. Штогод на фэсьце прысуджаюцца дзьве ўзнагароды. Адной ганаруюць прызнанага эўрапейскага аўтара, а другую — «Крышталь Віленіцы» — атрымлівае па выніках чытаньня малады творца. На памяць пра Віленіцу — пячору, у якой адбываецца закрыцьцё фэстывалю, — паэту дораць кавалак горнага крышталю-сталяктыту адтуль. Дораны камень мае форму перакручанай літары «Т» — ён складаецца нібыта з двух зьлепленых камянёў. Крохкая Вальжына падымае падарунак зь цяжкасьцю й пакуль ня ведае, пад што яго прыстасаваць. Вальжына Морт (Мартынава) — выкладае ў Лінгвістычным унівэрсытэце. Цягам восені мае выйсьці яе кніжка «Я тоненькая, як тvae вейкі». «НН» зьмяшчала творы Вальжыны Морт у №18'2003.**

# Крышталь для Вальжыны

## Арлоў здымае фільм

«Айчынны шоў-бізнэс цяпер знаходзіцца ў стане чаканьня, калі папросту неабходна зрабіць такі прадукт, які б штурхануў наперад гэты самы шоў-бізнэс», — мяркуе вядомы музыкант і прадусар Раман Арлоў. І такі прадукт ён абяцае выпусьціць у наступным годзе.

Раман Арлоў задумаў зьняць паўнавартасны мастацкі фільм. Напісаны сцэнар (аўтары — Раман і Багдан Арловы, сыны пісьменьніка Ўладзімера Арлова) і праведзены тэставыя здымкі на ВДНГ. Дзея фільму пад працоўнай назвай «Наша музыка» будзе адбывацца ў Беларусі ў 2006 г. Здымкі пройдуць у Менску, але і ў Берасьці, Наваполацку, Салігорску.

Жанр стужкі Арлоў акрэсьліў як «дынамічны псыхалягічны дэтэктыў». У цэнтры — гісторыя музыкаў, якія займаюцца сваёй улюбёнай справай толькі ўвечары, а ўдзень бяруцца за любую працу, абы зарабіць грошы. Адсюль — крымінальныя пэрыпэтыі. Абяцаецца вялікая колькасьць аўтапагоняў, грошы і каханьне.

Аўтары фільму вырашылі падкрэсьліць сучасную моўную сытуацыю, таму фільм будзе дзьвюхмоўны — нехта з герояў будзе размаўляць па-беларуску, нехта — па-расейску.

Што да бюджэту стужкі, то Арлоў пляне ўкласьціся ў 30 000 у.а. Цяпер вядзецца пошук спонсараў. Ужо існуюць папярэднія дамоўленасьці з тэкспаркам «007» і адным з футбольных клюбаў. Для параўнаньня: на «Настасьсю Слуцкую» пайшло пад 1 млн у.а., а Андрэй Кудзіненка зьняў «Акупацыю. Містэрыі» за 20 000 у.а.

**Сяргей Будкін**

ПРАЦЯГ ТЭМЫ

## Незаўважаны міленіюм




Брак густу й схільнасьць да халтуры — звычайныя рэчы ў культурным жыцьці цяперашняе беларускае дзяржавы. Можна, вядома, пераканаць публіку ў тым, што пачварны і з эстэтычнага, і з этычнага, і з экалягічнага пунктаў гледжаньня будаваны паркінг на Нямізе — гэта хораша. Можна нават паўдня круціць па тэлеканале «Лад» расейскую «Культуру», дадаваць «Euronews» ды прылепліваць нафталінавага індыйскага кіно і таксама выдаваць гэта за культурнае дасягненьне. Але калі культуртрэгеры ад лукавага пачынаюць гуляцца з нацыянальнымі сьвятынямі — баліць. Баліць ад таго цывілізацыйнага заняпаду, які пачаўся ў Беларусі дзесяцігодзьдзе таму.

Вось, здаецца, добрая была ініцыятыва выдавецтва «Беларуская энцыкляпэдыя» — шырэй пазнаёміць беларусаў з унікальным помнікам нашага пісьменства, якому тысяча гадоў, — Тураўскім Эвангельлем. Выдалі. Кнігу «Тураў. Тураўскае Эвангельле». І выйшла нязграбная халтура за глянцавым эрзацам. Ну хай бы выдаўцы і тыя, хто рэклямаваў гэтую новую кніжку, глянулі, што выдавалася да іх. Дазволю сабе прывесьці тут кароценькую бібліяграфію: Туровское Евангелие одиннадцатого века. — СПб., 1868 (хромалітаграфія); Туровское Евангелие одиннадцатого века / рэд. текста і объяснения П.А.Гильтенбандта. — Вильна, 1869; Сводный каталог славяно-русских рукописных книг, хранящихся в СССР. XI—XIII вв. — Москва, 1984. — С.50—52; Гісторыя беларускага мастацтва. Т.1. — Менск, 1987. — С. 90—91; Нікалаеў М. Палата кнігапісная. — Менск, 1993; Ілюмінацыя Тураўскага Эвангельля XI ст. // Беларускі гістарычны агляд. 1994. Т.5, сш. 1(8).

Каб жа ж укладальнікі кнігі зьмясьцілі хоць бы якія спасылкі на папярэднікаў! Ды дзе там… Іншыя правілы паводзін. Іншая мараль. Напрыклад, ужо надрукаваўшы кнігу, выдавецтва зьвярнулася да правапераемнікаў спадчыны Міхася Раманюка, якога ўжо даўна няма сярод жывых, з просьбаю пра дазвол надрукаваць ягоны стары артыкул з фота. Балазе, паловы аўтараў тэкстаў, напісаных у мінулым і нават у пазамінулым стагодзьдзях, няма ў жывых. Выявы ж аркушаў Тураўскага Эвангельля былі рэпрадукаваныя з ксэракопіяў (!) з факсымільнага (!) выданьня XIX ст. Паглядзець сьвятую кнігу, якая цяпер знаходзіцца ў бібліятэцы Акадэміі навук Літвы, асабіста з выдаўцоў ніхто не парупіўся. Нават у Вільню, дзе яна ашчадна зьберагаецца, ніхто не пад'ехаў! А таму й уляпілі 20 старонак кепскага каляровага друку ў краязнаўчы фаліянт немаведамага прызначэньня. Хіба што вэртыкальшчыкам на прээнты…

Ну, а ўжо БЕЛТА зьдзівіла па поўнай праграме. Як вынікае зь іхнага сумбурнага паведамленьня, Тураўскае Эвангельле, што зьберагалася ў «бібліятэцы Віленскага ўнівэрсітэту» (?!)… «было перададзена ў нашу краіну » (?!), а «экзэмпляры зьберагаюцца ў Тураве, Гомелі (?!)» і г.д. Далейшыя камэнтары тут залішнія.

Патрэба ў выданьні якаснай копіі Тураўскага Эвагельля асобнай дыхтоўнай кнігаю застаецца, як і патрэба ў далейшым яго дасьледаваньні.

**Сяргей Харэўскі**

МУЗЫКА

## «P.L.A.N.» сьпеўся з «Харошкамі»



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

У міжнародны год блюзу (2003) зьдзівіў менскі гурт «P.L.A.N.», выдаўшы два поўнафарматныя альбомы — «Blues у канцы тунэлю» і «Вам слова, Джон Ячмень». У 2004 г. у многіх хіт-парадах Беларусі зьяўляліся новыя хіты гурту. Гэта вылілася ў чарговы поўнафарматны альбом з саркастычнай назвай «Вялікае калі ласка!». Самая прыгожая песьня з альбому — «Blues ад самоты». Для яе выкананьня А.Плясанаў запрасіў у дуэт вакалістку гурту «Харошкі» Юлію Гібкоўскую (на здымку).

**Вінцук Гуненка**

## «Ляпісы» ў Літве

Група «Ляпіс Трубяцкой» выступіла на буйным фэсьце альтэрнатыўнай музыкі «Хлеў культуры» пад Вільняй. У першы дзень хедлайнэрамі была растаманская група з Харкава «5'nizza», у другі — беларусы. Міхалок адмовіўся ад выкананьня «Аў» і «Сочы» і засярodзіўся на апошніх песьнях калектыву, у тым ліку беларускамоўных. Новы «Ляпіс» літоўцам спадабаўся. Прадусар калектыву Яўген Калмыкоў кажа, што цяпер вядуцца перамовы наконт выданьня дыску «Залатыя яйцы» ў Літве.



АРХІЎ С. МІХАЛКА

Тым часам «Ляпіс» узяў удзел адразу ў двух расейскіх праектах. Песьня «Красівая» ўвайшла ў рэгі-складанку пад назвай «Антыфабрыка», «Ляпісаў» таксама запрасілі запісаць песьню для трыб'юту амэрыканскай панк-легенды «Ramones». Міхалок з радасьцю пагадзіўся, тым больш што творчасьць гэтай каманды натхніла яго на напісаньне самай пасьпяховай беларускамоўнай песьні «Ляпісаў» пад назвай «Рамонкі».

Дарэчы, на гэтым тыдні на афіцыйным сайце каманды (www. lyapis.com) зьявіцца MP3-запіс канцэрту групы ў студыі маскоўскай FM-станцыі «Наша радыё».

**СБ**

НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

**Говар В. Калі равуць быкі:** Аповесьць; **Кола:** Раман-апокрыф. — Менск: Бел. выд. т-ва «Хата», 2004. — 360 с.: іл. 500 ас.

Выданьне ілюстраванае малюнкамі аўтара й сямейнымі здымкамі.

**Кірычэнка В. Менск: Гісторыя пасьляваеннага аднаўленьня. 1944—1952 г.** — Менск: Беларусь, 2004. — 283 с.: іл. 2000 ас.

Прысьвечаная 60-годзьдзю вызваленьня Беларусі, кніга магла б стаць чарговым непрыхаваным хваласьпевам «савецкім» людзям, якія — на гэты раз ужо ў нішчымныя пасьляваенныя гады — праявілі сваю выключную мужнасьць, узьняўшы разбураны Менск з руін. Аднак падаецца, што дасьледаваньне не перайшло небясьпечнай мяжы й захавала вытрыманасьць ды дастатковую аб'ектыўнасьць. Багатая колькасьць фактаў пра энтузіязм менчукоў у аднаўленьні сталіцы мяжуе ў кнізе з інфармацыяй пра зьнішчэньне старадаўніх храмаў, якія хоць і перажылі вайну, але, паводле ўяўленьняў горадабудаўнікоў, ня мелі права суседнічаць з помнікам Сталіну — урэшце, так і не ўсталяваным. Закранаецца й тэма ўдзелу ў аднаўленчых работах ваеннапалонных немцаў. Выданьне, напісанае на аснове архіўных дакумэнтаў і матэрыялаў тагачаснага друку, дазволіць даведацца пра генэральны плян адбудовы Менску, спраўджаныя й няспраўджаныя праекты архітэктараў, гісторыю асобных будынкаў, узьвядзеньне заводаў-гігантаў. У кнізе зьмешчана мноства рэдкіх ды ўнікальных фатаздымкаў, што робіць яе сапраўды цікаваю крыніцаю ведаў у найноўшай гісторыі Менску. Цана 13860 руб.

**Край:** Фатапогляд Вадзіма Грудзька. — Рыфтур, 2004.

240 фатаздымкаў гэтага альбому — спроба аўтара адчуць і зразумець «свой» край. Сьвятло, колеры, краявіды, людзі — знаёмая й заўжды непаўторная Беларусь паўстае на здымках бяз фотамантажу і ўпрыгожаньняў. Якасьць паліграфіі — выдатная. Цана ў «Акадэмкнізе» 41070 руб.

**Пяткевіч Ч. Рэчыцкае Палесьсе** / Уклад., прадм. У.Васілевіча; Пер. з польск. Л.Салавей і У.Васілевіча. — Менск: Беларускі кнігазбор, 2004. — 672 с.: іл. — (Беларускі кнігазбор. Сэрыя 2. Гіст.-літ. помнікі). 1200 ас.

29-ты том «Залатой бібліятэкі Беларусі».

**Рэлес Г. Яўрэйскія савецкія пісьменьнікі Беларусі: Мэмуары.** – Менск: Логвінаў, 2004. – 272 с. (на ідыш).

Кніга-помнік больш як 30 ідышысцкім літаратарам, а таксама дзеячам мастацтва, што жылі і працавалі ў Беларусі ў XX ст. З усімі аўтар быў знаёмы асабіста, успамінае і сур'ёзнае, і сьмешнае.

**Тураў. Тураўскае Эвангельле** / Рэд. М.Нікіцін. — Менск: Беларуская Энцыкляпэдыя, 2004. — 336 с.: іл. 1000 ас.

Нагодаю для выхаду гэтае кнігі стаўся з размахам адзначаны нядаўна ў старажытным Тураве Дзень беларускага пісьменства. Выданьне зьмяшчае ўсяго патроху: тут і прамовы чыноўнікаў ды сьвятароў, і навуковыя й навукова-папулярныя тэксты з гісторыі й культуры Тураўскае зямлі (у пераважнай большасьці передрукаваныя зь іншых выданьняў), і замалёўкі-нататкі пра хараство тутэйшае прыроды, і вершы, і ўласна факсыміле найстаражытнейшага рукапісу, знойдзенага на тэрыторыі Беларусі, — Тураўскага Эвангельля (XI ст.).

**Быков В. Знак беды. Карьер:** Повести / Сост. Л.Быков. — Екатеринбург: У-Фактория, 2004. — 608 с. 10000 ас.

**Быков В. Сотников. Дожить до рассвета. Его батальон:** Повести / Сост. Л.Быков. — Екатеринбург: У-Фактория, 2004. — 512 с. 10000 ас.

**Русілка В. Ажыны:** Вершы. — Менск: Мастацкая літаратура, 2004. — 70 с. 1000 ас.

Паэтычны зборнік загадчыцы катэдры беларускай філялёгіі Віцебскага ўнівэрсытэту.

**Традыцыйная мастацкая культура беларусаў:** У 6 т. Т. 2. Віцебскае Падзьвіньне / Склад. Т.Варфаламеева. — Менск: Беларуская навука, 2004 — 910 с. 1200 ас.

Другі том сэрыі цалкам прысьвечаны Паазер'ю. Паводле вынікаў трохгадовага (1996—1998) дасьледаваньня аўтары выданьня ахарактарызавалі ўсе асноўныя віды й жанры мастацкай культуры гэтага рэгіёну Беларусі. Цана 25000 руб.

**Ципис Н. Иду и возвращаюсь:** Повести. — Минск: Мастацкая літаратура, 2003. — 358 с.

Аповесьць «Іду й вяртаюся» — роздумныя ўспаміны аўтара пра роднае Замосьце й Віньніцу, ваеннае й паваеннае жыцьцё, сяброў і родных. Другая частка кнігі — жорсткія дакумэнтальныя занатоўкі настаўніка пра навучэнцаў і выкладчыкаў «хабзы».

**Тацяна Вабішчэвіч, ВР**




## Тэатры

### Тэатар імя Янкі Купалы

**16** (чц), **17** (пт) — «Эрык XIV».
**19** (ндз) —«Каханьне ў стылі барока».
**20** (пн) — «Кім».
**22** (ср) — «С.В.».
**23** (чц) — «Згублены рай».
**24** (пт) — «Я не пакіну цябе...».
**25** (сб) —«Дзіўная місыс Сэвідж».
**26** (ндз) — «Чорная панна Нясьвіжу».

**Малая сцэна**

**18** (сб), **23** (чц) — «Баляда пра каханьне».
**19** (ндз) — «Беларусь у фантастычных апавяданьнях».
**24** (пт) — «Муж для паэтэсы».

**Ранішнія спэктаклі (пачатак у 13.30)**

**19** (ндз) — «Ажаніцца — не журыцца».

**Дзённыя спэктаклі (пачатак а 15-й)**

**26** (ндз) — «Чорная панна Нясьвіжу».

### Балет

**17** (пт) — «Карсар».
**19** (ндз) — «Дон Кіхот». Пачатак у 11.30.

### Моладзевы тэатар

**21** (аўт) — «Акадэмія сьмеху».
**22** (ср) — «Пігмаліён».
**23** (чц) — «Шалёны дзень, або Вясельле Фігаро».
**24** (пт) — «Позьняе каханьне».
**25** (сб) — «Страсьці ў Віндзоры».
**26** (ндз) — «На вачох у жаночай берагавой аховы».

### Тэатар імя Горкага

**16** (чц) — «Дзівакі».
**17** (пт), **25** (сб) — «Суцяшальнік удоў».
**18** (сб), **23** (чц) — «Дэтэктар хлусьні».
**19** (ндз) — «Амфітрыён».
**21** (аўт) — «Адзіны спадкаемца».
**22** (ср) — «Калігула».
**24** (пт) — «Вольны шлюб».
**26** (ндз) — «Ад'ютант-Ша Яго Сьветласьці».

### Сучасны мастацкі тэатар

(вул.Кастрычніцкая, 5, т.289-15-71, 206-66-38, 608-9-608)

**25** (сб), **26** (ндз) — «Мяшчанскае вясельле».

### Тэатар эстрады

**16** (чц) — «Эстрадны express кактэйль».
**22** (ср) — «Белы голуб».
**23** (чц) — «Данс-гумар-шоў».

### Тэатар беларускай драматургіі

**22** (ср) — «П'емонцкі зьвер».
**23** (чц) — «Адвечная песьня».
**24** (пт) — «Містэр розыгрыш».
**25** (сб) — «Адэль».

## Для дзяцей

### Тэатар юнага гледача

**Дзённыя спэктаклі**

**22** (ср) — «Паліяна».
**23** (чц) — «Каліф-Шавец».
**24** (пт) — «Дзень нараджэньня ката Леапольда» .
**25** (сб) — «Сястра мая Русалачка».

**Вечаровыя спэктаклі**

**21** (аўт) — «Палачанка».
**28** (аўт) — «Рыцар Ордэну Сонца».

**Экспэрымэнтальная сцэна**

**20** (пн) — «Гісторыя каханьня Паласатага Ката і сеньярыты Ластаўкі».
**22** (ср), **23** (чц) — «Апошняя дуэль».

### Моладзевы тэатар

**26** (ндз) — «Брыдкае качаня».

### Тэатар беларускай драматургіі.

**25** (сб), **26** (ндз) — «Хрустальны туфлік».

### Сучасны мастацкі тэатар

Ранішнія спэктаклі (пачатак а 12-й)
**25** (сб) — «Малыш і Карлсан».
**26** (ндз) — «Усе хлопчыкі — дурні».

## Выставы

### Сар'ян і Рушчыц у Мастацкім музэі

**З 20 верасьня да 20 лістапада** — выстава «Зямля і людзі» Мартырос Сар'ян.

**З 22 верасьня да 20 лістапада** — фотавыстава «Беларускія стыхіі Фэрдынанда Рушчыца».

### Музэй сучаснага выяўленчага мастацтва

**Да 1 кастрычніка** працуе выстава фінскай мастачкі Мар'е Леўлін «Дом успамінаў і роздумаў». Гэта інсталяцыі з жывапісу, фатаздымкаў і вышыўкі, створаныя на мужчынскіх насоўках.

### Антыалькагольны праект

У **Палацы мастацтваў** працуе выстава «Гарэлка, хвост і селядцы».

### Пра піва і піваварaў

**У Музэі гісторыі і культуры Беларусі** да 1 кастрычніка працуе выстава «Пра піва і піваварaў. Традыцыйны промысел і прамысловасьць Беларусі».

### Паляваньне і рыбалоўства

**З 23 да 26 верасьня** ў выставачным павільёне «Белэкспа» адбудзецца кірмаш «Паляваньне і рыбалоўства». На выставе будуць экспанавацца рэчы, неабходныя для падводнага плаваньня (дайвінгу), кожны ахвотны зможа выпрабаваць свае сілы ў стральбе, таксама адбудзецца «Выстава краявідаў» мастака Юр'я Акудовіча і шмат іншага. Выстава працуе з 10-й да 18-й гадзіны.

### Гаспадарчыя выставы

**З 20 да 23 верасьня** ў выставачным павільёне на Машэрава, 14 адбудзецца міжнародная спэцыялізаваная выстава жыльлёва-камунальнай гаспадаркі і дарожнага будаўніцтва. Гэтымі ж днямі там можна наведаць і спэцыялізаваную выставу **«Аўтабелсэрвіс-2004. Белтранссэрвіс-2004»** ды міжнародную канфэрэнцыю па бясьпецы руху.

### Тэрыторыя колеру

У галерэі «Nova» (вул.Веры Харужай, 16) **да 8 кастрычніка** працуе выстава фатаздымкаў Алега Пятрова (Горадня) «Тэрыторыя колеру».

## Менская кінаафіша з 17 да 19 верасьня

**«Аўрора»** (253-33-60)
«Эўратур»*** (прэм'ера): **17** (пт) 17.00 (іл), 19.00, 21.00; **18, 19** (сб, ндз) 15.00, 17.00, 19.00, 21.00.
«Зачараваная Эла»: **17—19** (пт—ндз) 14.20.
«Гары Потэр і вязень Азкабану»: **17—19** (пт—ндз) 16.30.
«Дзень добры, ноч»*** («Кінафармат 4х4»): **17** (пт) 19.10, 21.10.
«Эфэкт матылька»*** («Кінафармат 4х4»): **18** (сб) 19.10, 21.10.
«Рамасанта: Паляваньне на ваўкалака»*** («Кінафармат 4х4»): **19** (ндз) 19.10, 21.10.
**«Берасьце»** (272-87-91)
«Стэпвардзкія жонкі»: **17** (пт) 14.00, 16.30, 18.50, 21.00; **18, 19** (сб, ндз) 14.00 (іл), 16.30, 18.50, 21.00.
**«Дружба»** (240-90-13)
«Дзяўчына з Джэрсы»: **17** (пт) 18.00 (іл), 20.00; **18** (сб) 18.00, 20.00; **19** (ндз) 18.00, 20.00 (іл).
**«Кастрычнік»** (232-93-25)
«Шрэк-2» (прэм'ера): **17** (пт) 15.00, 19.00; **18, 19** (сб, ндз) 15.00 (іл), 19.00.
«Эўратур»*** (прэм'ера): **17—19** (пт—ндз) 17.00, 21.00.
**«Масква»** (223-27-10)
«Шрэк-2» (прэм'ера): **17** (пт) 15.00 (іл), 17.00, 19.00; **18, 19** (сб, ндз) 15.00 (іл), 17.00.
«Наталі»*** (прэм'ера): **17** (пт) 21.00; **18, 19** (сб, ндз) 19.00, 21.00.
**«Мір»** (284-37-71)
«Модная мамачка»: **17** (пт) 18.10, 20.30; **18, 19** (сб, ндз) 15.30 (іл), 18.10, 20.30.
«Рамасанта: Паляваньне на ваўкалака»*** («Кінафармат 4х4»): **17** (пт) 17.00, 19.00, 21.00.
«Дзень добры, ноч»*** («Кінафармат 4х4»): **18** (сб) 17.00, 19.00, 21.00.
«Толькі ня ў губы»*** («Кінафармат 4х4»): **19** (ндз) 17.00, 19.00, 21.00.
**«Перамога»** (223-77-66)
«Стэпфардзкія жонкі»: **17—19** (пт—ндз) 15.00.
«Эфэкт матылька»*** («Кінафармат 4х4»): **17** (пт) 16.50, 19.00, 21.10.
«Толькі ня ў губы»*** («Кінафармат 4х4»): **18** (сб) 16.50 (іл), 19.00, 21.10.
«Дзень добры, ноч»*** («Кінафармат 4х4»): **19** (ндз) 16.50 (іл), 19.00, 21.10.
**«Піянер»** (227-64-87)
«Чалавек-павук-2»: **17—19** (пт—ндз) 14.00, 16.20, 21.00.
«Кармэн» **17—19** (пт—ндз) 18.40.
**«Цэнтральны»** (220-34-16)
«Модная мамачка»: **17** (пт) 11.00, 13.20, 15.40; **18** (сб) 11.00 (іл), 13.30, 16.00; **19** (ндз) 11.00 (іл), 13.20, 15.40.
«Толькі ня ў губы»*** («Кінафармат 4х4»): **17** (пт) 18.00, 20.30.
«Рамасанта: Паляваньне на ваўкалака»*** («Кінафармат 4х4»): **18** (сб) 19.00, 21.00.
«Эфэкт матылька»*** («Кінафармат 4х4»): **18** (ндз) 18.00, 20.30.

(іл) — ільготны сэанс (скідка 50% для ўсіх гледачоў)
Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 год не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 год.

## Юнаму гледачу:

**«Берасьце»**
«Ералаш»: **18, 19** (сб, ндз) 12.00.
**«Дружба»**
«Палёт навігатара»: **17** (пт) 12.00, 14.00; **18, 19** (сб, ндз) 11.00, 13.00.
**«Піянер»**
«Лебядзінае возера»: **17** (пт) 12.00; **18, 19** (сб, ндз) 10.20.
«Гуляй як Бэкхем»: **18, 19** (сб, ндз) 12.00.

## Клюбнае жыцьцё

### Графіці (671-58-65)

**21** (аўт), 20.00 — праект «Нашы сябры» з удзелам гурту «Крама».
**22** (ср), 20.00 — «Вечар джазавай музыкі».
**24** (пт), 20.00 — вечар растаманскіх казак ад Зьмітра Гайдука з удзелам «Хайле Тумс».

### Bronx (288-10-61)

**16** (чц), 22.00 — «Клюбны FUNK-чацьвер»: dj Laurel.
**17** (пт), 22.00 — dj-bar with dj Bergamo.

### Гудвін (226-13-06)

**16** (чц), 21.00 — жывая музыка.
**17** (пт), 21.00 — жывая музыка.
**18** (сб), 21.00 — жывая музыка.

### Бліндаж (219-00-10, 671-58-65)

**16** (чц), 23.00 — dj Egor.
**17** (пт), 23.00 — dj Джэры (Прага), Go-Go, стрып-шоў.
**18** (сб), 23.00 — dj Юлі Мяцельскі.
**19** (ндз), 23.00 — dj Egor.

### Ямайка (252-07-26)

**17** (пт), 2.00 — «The Aferparty Relaunch Autumn-Winter 04/05»: dj Зоркін (Масква), dj Noche, dj Dasha Pushkina, dj Paliony, dj Top. Strict facecontrol by «Pretty Party».
**18** (сб), 2.00 — «The Afterparty»: dj Top, dj Bergamo.

### X-Ray (223-93-55)

**18** (сб), 22.00 — dj Сапуноў (Масква), dj Arsenti Tchouprina.

КАІСА

## Восень караля

Інфармацыйныя агенцтвы адно за адным рэтрансьлююць пэрыпэтыі з жыцьця адзінаццатага чэмпіёна сьвету па шахматах, затрыманага ў Японіі. Яго чакае экстрадыцыя на радзіму — у ЗША, дзе, найхутчэй, за матч з Барысам Спаскім, праведзены ў 1992 г., 61-гадовага Робэрта Джэймса Фішэра зьняволяць усур'ёз і надоўга. Ён парушыў міжнароднае заканадаўства, згуляўшы ў мяцежнай Сэрбіі ды не заплаціўшы падаткаў з выйграных грошай. З таго часу гойсаў па азіяцкіх краінах, час ад часу пасылаючы вэрбальныя праклёны Амэрыцы.

Што нам да Фішэра? Фішэр не завітваў у Беларусь, нават у час свайго росквіту не сустракаўся зь беларускімі шахматыстамі (ці лічыць выключэньнем расейца Лява Палугаеўскага, ураджэнца Магілёва-на-Дняпры?). Аднак дзесяціразовы чэмпіён Беларусі Вячаслаў Дыдышка пабудаваў свой зіхатлівы падручнік «Лёгіка сучасных шахмат» на партыях і ідэях Фішэра. У час адкрытага моладзевага чэмпіянату Галяндыі, выйгранага Андрэем Жыгалкам у жніўні 2004 г., беларускія майстры разам зь іншымі паўдзельнічалі ў наіўнай акцыі ў абарону Фішэра, начапіўшы майкі зь ягонай выявай...

На парозе 1970-х Фішэр зьдзейсьніў рэвалюцыю, вылучыўшы на першы плян спартовы кампанэнт гульні. Да яго шахматыстам недаплачвалі, затое іх камбінацыямі захапляліся мільёны. Пасьля раптоўнага адыходу Фішэра ў цень 30 гадоў таму ў пралом, прабіты геніяльным амэрыканцам, павалілі сотні пасрэднасьцей, якіх вабілі ганарары эліты. Званьне грасмайстра дэвальвавалася, і сёньня шахматы як такія ўжо не прыцягваюць увагі публікі. Скандальны матч 1992 г. быў, напэўна, абумоўлены шчырым жаданьнем партнэраў аддаць належнае Шахматам, але відавочна прыпазьніўся.

Бобі Фішэр трапіў ва ўласную пастку. Ні ад салідарнасьці гульцоў з розных краін, у тым ліку ад заявы Спаскага, які папрасіў Буша пасадзіць яго ў адну камэру зь Фішэрам і даць ім шахматы (!), ні ад адчайных «хадоў канём» (спроба затрыманага ажаніцца з прэзыдэнткай японскай шахматнай фэдэрацыі ці атрымаць палітычны прытулак у Нямеччыне) толку няма й ня будзе. Амэрыканская Фэміда чакае доўга, але б'е балюча. Багіня шахмат ёй не суперніца.

**ВР**

## Як бы Вы згулялі?

**Фішэр — Шакрон, Мар-дэль-Плата, 1959.**
**Ход белых. Як ратаваць зьвязаную туру?**



Адказ: 1. Сd7!! і пасьля 1...Фd7 2. Тg6+ белыя выйграюць фэрзя. Чорныя здаліся.

КІНО Ў МЕНСКУ

# Цырк зь веліканам, катом і аслом

**«Шрэк-2»** (**«Shrek-2»**)

ЗША, 2004, каляровы, 92 хв.

**Жанр:** Анімацыйная камэдыя-казка

**Адзнака:** 8 (з 10)

Зялёнага велікана Шрэка і ягоную жонку Фіёну запрашаюць у госьці бацькі Фіёны — кароль і каралева трыдзявятага каралеўства. Але выбар прынцэсы выклікае, так бы мовіць, некаторую аслупянеласьць. Асабліва нездаволены зяцем кароль, які прылюдна сварыцца зь ім і ўсяляк дапякае за кепскае выхаваньне.

Але галоўную пагрозу для сямейнага шчасьця ўяўляе Хросная фэя, якая марыць пасадзіць на сталец свайго манернага сына. У фэі цэлая індустрыя па вытворчасьці чароўных зёлак, і яна зьбіраецца ўзмацніць свае пазыцыі.

Шрэку і Фіёне прыйдзецца прайсьці праз выпрабаваньне прыгажосьцю, падступствы і нават арышт, каб зноў аднавіць парушаны лад. Галоўным кампаньёнам Шрэка на гэты раз становіцца рудое кацяня ў ботах, у свой час нанятае цесьцем для забойства велікана. Але кілер і ахвяра пасябравалі, што выклікае пякучую рэўнасьць асла, «галоўнай гаваркой зануды».

Колькасьць жартаў, абсьмяяных казак і фільмаў у карціне зашкальвае, але асабліва ўдалымі падаюцца пароды на баевікі — калі Шрэк на заводзе крадзе зёлкі альбо калі вязьняў вызваляе спэцназ у складзе сьляпых мышак, Пінокіё і бісквітнага чалавечка. Колікі выкліча і пародыя на паліцэйскую тэлехроніку, калі Шрэка, ката і асла арыштоўвае паветраная брыгада рыцараў-копаў.

Апошняя сцэна пяе гімн усім зялёным і тоўстым парам, бо галоўнае — душа, і намякае, што калі хто і не здаволены, той сам схаваная жаба.

Хаця звычайна працягі фільмаў саступаюць арыгіналу, «Шрэк-2» па сьмеху пераўзыходзіць свайго папярэдніка.

**Андрэй Расінскі**

# Пляшка — уся ідэалёгія

На дварэ — красавік. На календары — 8-га. Сёньня чарговая гадавіна сьмерці майго дзеда Яўгена. Кажуць, сьпірытычнай сувязі не існуе. Цяжка пагадзіцца, калі твой родны дзед паміраe ў ноч твайго нараджэньня. Сьвяточны дзень даўно ўжо перастаў быць такім. Памяць заўжды выціскае сьвята. Меней чым праз два тыдні — Радаўніца. Едзем да дзеда на Койданаўшчыну. На Машчонаўскіх могілках, што павольна раскінуліся на лясістым узгорку, шматлюдна. Там — прыбіраюць, тут — памінаюць. Час — за поўдзень. Выпіваюць і закусваюць усё часьцей. Здаецца, гэтая дзея будзе цягнуцца вечна. Вось і першыя «ахвяры» памінальнага рытуалу: два яшчэ нестарыя мужчыны старанна выпісваюць васьмёркі на сьцежцы, што лучыць вёску ды могілкі. Робіцца млосна: сьветлая памяць пра блізкага чалавека й гарэлка ніяк ня могуць ужыцца у маёй сьвядомасьці.

## «Шанец» у жыцьці

Пасьля могілак рушым да сваякоў. Гасьцей не чакалі. Брат Павал вызываецца пайсьці ў краму па хлеб. Да «мага́зыну» (як заўжды казаў наш дзед, націскаючы на другі склад) сьцягваюцца мужыкі. Збор грошай у сьвяточны дзень ідзе вельмі ажыўлена. Набыўшы два боханы «Фармавога», Павал зь цікавасьцю дасьледуе вясковы «асартымэнт» напояў. Гарэлка «Новы век», другараднае малдаўскае віно за тры тысячы й «Шанец» за паўтары (па-нашаму — «чарніла») — вось, бадай, і ўвесь выбар. Нарэшце зьяўляецца «дэлегат» ад мужыкоў:

— Здароў, Зіна! Пляшачку нашага любімага…

Не пасьпеў «дэлегат» пераступіць парог крамы, а бутэлька ў ягоных руках ужо адкаркаваная й вясковец з асалодай пацягвае любімы напой з рыла. За рогам з «Шанцам» канчаткова распраўляюцца астатнія сябры таварыства аматараў чарніла. І ўсё пачынаецца спачатку. Зборы, крама, «Шанец», кіслая асалода… І гэтак да самага вечару, ажно пакуль на вуліцы ня зьявіцца чыя-небудзь разьятраная жонка, прыкмеціўшы ў талацэ свайго чалавека.

Хутка з адыходам першага разбрыдаюцца па дамох і астатнія.

## Як пілі, так і п’юць

Імкненьне да таннага ў нашых людзей у крыві. Якая розьніца, якой якасьці. Галоўнае, каб ня дорага абышлося. Сёньняшні «Шанец» у вясковай краме па-свойму перагукваецца з тым, што адбывалася на пачатку мінулага стагодзьдзя, а наша нацыянальная традыцыя найлепшым чынам укладаецца ў канву шырока разрэклямаванага слогану: «У два разы болей — за тыя ж грошы!»

94 гады таму «Наша Ніва» паведамляла: «С.Хоміна. Магіл. губ. Гор.п. Дажыліся нашы суседзі да таго, што аж стыдна прызнацца! Шмат па якіх вёсках таргуюць гарэліцай як жыды, так і самі сяляне. Напрыклад, у суседняй вёсцы адзін селянін купляе той сьпірытус, каторы ўжываецца заместа газы, і, разбавіўшы вадой, прадае заместа гарэлкі. Адзін ласун ад такой прыправы ўжо выправіўся на той сьвет; другога чуць адратавалі. Найбольш ліецца гарэлка на вясельлях; і там, каб таньней абышлося, ужываюць, разьвёўшы вадой, таго сьпірытусу, каторы толькі згодны замест газы, а для людзей — атрута».

Вяртаемся ў сёньня. «Вёска п’е не прасыхаючы, — дзеліцца ўражаньнямі пасьля вандроўкі на родную Талачыншчыну мой сябар Сяржук. — Колькі сябе помню, аніколі такога не было. Вядома ж, пілі заўсёды, але каб так — з ранку да ранку, старыя і маладыя, мужчыны й жанчыны! У бабулі на канікулах праляцела ўсё дзяцінства, і, ведаеш, усе тыя, з кім мы разам на рыбу хадзілі, у футбол ды хованкі гулялі і хто пасьля ў вёсцы застаўся, усе яны сьпіліся ўшчэнт. Цяпер і на людзей амаль не падобныя, істоты нейкія».

Абу-аль-Фарадж, навуковец высокага Сярэднявечча, вылучыў чатырохкампанэнтную «тэорыю» ап’яненьня: «Віно паведамляе кожнаму, хто яго п’е, чатыры якасьці. Перш за ўсё чалавек становіцца падобным да паўліна — ён надзімаецца, яго рухі плаўныя й велічныя. Затым ён набывае характар малпы й пачынае з усімі жартаваць і падлашчвацца. Пасьля ён прыпадабняецца да льва і робіцца самаздзейным, ганарлівым, упэўненым у сваёй моцы. Але напрыканцы ён ператвараецца ў сьвіньню і, падобна да яе, коўзаецца ў брудзе».

Па некалькі разоў на год за масавым разгортваньнем усіх гэтых стадый можна паназіраць падчас ладжаньня ў краіне буйных дзяржаўных сьвятаў. Прычым адметная рыса сьвяткаваньняў — нагода ў іх не самамэта, а толькі сродак.

## Завошта п’ём?

Пытаньне «Завошта п’ём?» на абсягах Беларусі мае ня меншае значэньне, чым «To be or not to be?» для ўсяго астатняга чалавецтва. Сапраўды так, бо менавіта ў пошуках прычыны й палягае ці не галоўны складнік самога працэсу. Напэўна, калі б у сьвеце існавала гэткая камісія, у абавязкі якой уваходзіла б ацэнка алькагольнага вынаходніцтва, дык Беларусь у яе рэйтынгу займала б адно зь першых месцаў. Вядома, толькі пасьля Расеі.

…Падчас маіх заняткаў лёгкай атлетыкай без гарэлкі не абыходзіўся аніводны трэніровачны збор. А на выязных юнацкіх спаборніцтвах рэспубліканскага маштабу некаторыя ўдзельнікі проста ўпіваліся. Назаўтра ж, нібыта нічога не было, яны выходзілі на старт і змагаліся за ўзнагароды.

…Летась Юры Г. зьехаў на працу ў Маскву па запрашэньні аднаго буйнога выдавецтва. Дагэтуль найлепшым чынам зарэкамэндаваў сябе ў Беларусі, пішучы кнігі на кампутарную тэматыку. «Аніводнае больш-менш сур’ёзнае бізнэс-пагадненьне немагчыма падпісаць бяз «чаркі ды шкваркі». Дзякуючы душэўнай размове за пляшачкай каньяку ці гарэлкі ўдаецца зрабіць тое, што не пад сілу найлепшаму дыплямату ці мэнэджэру», — апавядае ён.

Алькаголь настолькі трывала ўвайшоў у нашу рэчаіснасьць, што безь яго дозы немагчыма сабе ўявіць дня нараджэньня, вясельля ці памінак. Выбіраючыся ў госьці — да суседзяў ці за мяжу, — мы абавязкова маем прыхапіць з сабой пляшачку гарэлкі, якая ўжо сталася галоўнай беларускай традыцыяй і самабытнасьцю. Калі б наша гарэлка ўтрымлівала хоць сотую, нават тысячную кроплі мудрасьці, беларусы, мабыць, у сваёй нацыянальнай сьвядомасьці ня надта б саступалі ірляндцам, а па ўзроўні тэхнічнага разьвіцьця ўжо дакладна апярэджвалі б дасканалых японцаў.

**Кастусь Лашкевіч**



АГ

Калі б у сьвеце існавала гэткая камісія, у абавязкі якой уваходзіла б ацэнка алькагольнага вынаходніцтва, дык Беларусь у яе рэйтынгу займала б адно зь першых месцаў.

# «Бумэр», сьлёзкі і русіфікацыя

Сяргей Балахонаў

Неаднакроць даводзілася чытаць у афіцыйных мэдыях нараканьні на крымналізаванасьць некаторай часткі беларускае моладзі. Наракальнікі — аўтары шырокага кругагляду і вузкай нацыянальнай сьвядомасьці — у разважаньнях аб прычынах гэтага заганнага зьявішча сучаснасьці заканамерна прыплываюць да праблемы ўплыву на маладое пакаленьне прадукцыі масавай культуры. Часта імі называюцца фільмы, што цягам апошніх дзесяці гадоў стварылі рамантызаваны вобраз бандыта і бандыцкага жыцьця. Аднак, пералічваючы ўсе гэныя «Бумэры», «Брыгады», «Братоў», афіцыёзныя аўтары забываюць адну надта істотную акалічнасьць — кіно ж расейскае!

Крыміналізацыя сьвядомасьці юных беларускіх грамадзян ёсьць адным з вынікаў павальнай русіфікацыі інфармацыйна-культурнага поля ў нашай краіне. Аднак жа нельга казаць, што ва ўсім вінаваты толькі «клятыя маскалі». Зразумела, што расейцы праводзяць актыўную інфармацыйна-культурную экспансію ў былыя савецкія рэспублікі. Але сяк-так некаторыя імкнуцца ад яе адбараніцца. Беларусь доўгі час і не спрабавала гэтага рабіць. Вось цяпер апамяталіся і наракаем. Казытлівая сытуацыя выходзіць: немаўлятку замест малака падсоўвалі партвэйн, а цяперака абураемся, чаму дзіця сталася алькаголікам.

Кідаецца ў вочы разьняволенасьць, незашоранасьць цяперашніх падлеткаў. Але часьцяком за гэтым няма ніякага пазытыўнага напаўненьня. Падлеткі найчасьцей не валодаюць пачуцьцем іроніі. Іхны ж гумар вельмі своеасаблівы — грубы, на ўзаемных абразах. Карані гэтай эмацыйнай беднасьці — таксама ў тых бясконцых расейскіх і амэрыканскіх (у расейскім перакладзе) баевіках і камэдыях, якія дзеці глядзяць з маленства. З экрану бяруцца гатовыя ўзоры паводзін. А што ж літаратура? Якая літаратура, калі многія беларускія школьнікі пад канец базавай школы як сьлед чытаць ня ўмеюць!

Калі зьявіўся фільм «Бумэр», у адной афіцыёзнай беларускай газэце з захапленьнем напісалі, што фільм добры, бо бандыцкае жыцьцё паказанае без прыхарошваньня і будзе дзейнічаць на гледача як своеасаблівая пігулка супраць сындрому «Брата-2». Насамрэч ніякага лекавага эфэкту зь яго ня выйшла. Палова маладое Беларусі носіць у сваіх мабільніках дурацкую мэлёдыйку з гэнага фільму. Яшчэ якаясь яе частка ўжывае ідыяматычныя выразы і фразэмы «бумэраўскіх» герояў («Не буруй!», «Чего мычишь, бледина?» et cetera). Ня ўся маладая публіка ў стане зразумець антыкрымінальныя пасылы, якія гучаць прыхавана. Фільм можа быць шматслаёвым, прэтэндаваць на постмадэрновасьць («Брат-2», «Антыкілер»), але масавы глядач бачыць толькі верхні слой і ўсё ўспрымае літаральна. Каб адчуваць чужую іронію, трэба мець сваю. А дзе яе ўзяць? Каб зразумець схаваныя цытаты, трэба быць абазнаным ня толькі ў Гары Потэры і Каменскай.

Крыміналізаваная сьвядомасьць, трэба ўсё ж удакладніць, не вядзе адразу да злачынства. Неабавязкова, што чалавек з такой сьвядомасьцю будзе бандытам. Але, трапляючы ў спэцыфічнае асяродзьдзе (дваровыя групоўкі, былыя зьняволеныя), ён можа праявіць сябе як злачынец. Паддаецца статкаваму інстынкту. Дзяржава спрабуе адарваць падлетка ад гэткіх кампаній за кошт патрыятычнага выхаваньня. Вось толькі сыстэме адукацыі гэта будзе зусім не пад сілу, пакуль моду на паводзіны будзе дыктаваць сваімі «інфармацыйна-культурнымі шэдэўрамі» Расея, а Беларусь — маўчуком з такім становішчам зграджацца.

*Гомель*

Карані эмацыйнай беднасьці падлеткаў — у бясконцых расейскіх і амэрыканскіх (у расейскім перакладзе) баевіках і камэдыях. З экрану бяруцца гатовыя ўзоры паводзін.

PHOTO.BYMEDIA.NET



# На абароце часу

Навум Цыпіс

Скончыўшы гэтыя нататкі, высьветліў: пісаў іх на зваротным баку насьценнага календара даўно мінулага году. Папера ў Нямеччыне дарагая, вось і захаваўся каляндар для чарнавікоў. І выйшла — пісаў пра Валодзю Караткевіча на абароце часу… І ўзьніклі асацыяцыі пра вечнасьць, вяртаньне, містыку, якая суправаджала яго ўсё жывое жыцьцё. Вось і цяпер — на абароце часу…

Па сутнасьці, уся літаратура — на абароце часу, уся яна — успамін пра жыцьцё і толькі яго адлюстраваньне. А магчымасьць зразумець, якое вялікае гэтае «толькі», даюць такія людзі, як Караткевіч. Ужо на кароткім аддаленьні відаць, якога ён быў росту. Думаецца, што з часам будзе рабіцца вышэйшы і ў поўны рост устане, калі зямля яго «пад белымі крыламі» стане зямлёй людзей, якія жывуць годна. Ён марыў пра гэта. Ці не таму так жорстка і… лірычна ставіўся да рэчаіснасьці. Усё, што ён рабіў у мастацтве, было напружанай і непаказной любоўю да Беларусі.

Неўспамінальнае адступленьне. Я паўсюль называю Караткевіча па імені. Гэта не паляпваньне клясыка па плячы і не жаданьне прысесьці на падножку ягонай славы. У жыцьці я ніяк і ніколі іначай яго ня зваў, і цяпер ня выйшла. Хаця і спрабаваў — крыўлянства і ламаньне, вось што выходзіла. Як пра іншага чалавека. І яшчэ. «Любая падрабязнасьць з жыцьця вялікага чалавека каштоўная», — сказаў А.Пушкін.

Да ягоных сяброў прылічыць сябе не магу, але, скажам так, напэўна, быў яму неабыякавы. У нас было адно кола знаёмых, мы хадзілі аднымі рэдакцыйнымі, выдавецкімі, а часам і рэстараннымі калідорамі і займаліся адной справай. Нешта ўбачыў ён у маёй шматпакутнай першай кнізе, добрых слоў нагаварыў, каля якіх я доўга грэўся, ведаючы ягоную жорсткасьць і бесстаронасьць у ацэнках. «Чытаў… Бачыў сваё…» — сказаў ён, абняўшы мяне. Гэта было і нечакана, і кранальна. Помніцца і да гэтага часу — цеплыня.

## Людзі і танкі

Заходжу неяк. Сядзіць на падлозе. Увесь абстаўлены стосамі кніг. «Чышчу бібліятэку. Адбіраю, што можна аддаць у сельскія школы». — «Яны прыязджаюць забіраць?» — «Ага!.. Як набяру на два стосы, каб ня вельмі цяжка, сядаю ў электрычку і вязу ў сьвет. Ты ж ведаеш, як слаба гэтыя школы нармальнымі кнігамі забясьпечаны». Што ён убачыў у маім паглядзе, ня ведаю, але сказаў, гледзячы на мяне: «Што чалавек бяз кнігі?.. Настаўнікі дзякуй кажуць. Мо калі й пацаны скажуць».

На сэкцыі прозы давалі справаздачу пісьменьнікі вайсковай тэмы. Гучалі спалучэньні «гарадзкая проза», «вяскоўцы», «вайсковая проза»… Валодзя ня часта быў у Саюзе — не выступаў і ня ўдзельнічаў. Я гэта разумеў так: ён шмат працаваў і не жадаў «злазіць з каня», лічыў такія «вячоркі» малапрадукцыйнымі і нават шкоднымі. Адным словам, пісьменьнік павінен пісаць. А тут вось надарылася яму трапіць на пасяджэньне. Гаварыў горача, слухалі яго ўдумліва. Рэдка ён сябе ў такіх выступах праяўляў. Сутнасьць ягонай рэплікі — няма вайсковай, вясковай ці інтэлектуальнай прозы. Ёсьць проза. Ёсьць літаратура. І ўся яна — толькі пра адно: пра чалавека. Не пра трактары і камбайны, самалёты і танкі, не пра вышынны, няхай і вельмі прыгожы, дом. Яна пра камбайнёра і трактарыста, лётчыка ці танкіста, архітэктара дому ці яго жыхара. «Мне мала цікава, як зладжана ракета, мне вельмі цікава, як «зладжаны» Каралёў і Гагарын. Я ня буду чытаць аповесьці няхай нават пра вельмі складаную і разумную машыну альбо звышурадлівы чарназём, але абавязкова прачытаю пра чалавека зь любой сфэры дзейнасьці, пра ягонае каханьне, ягоную асабістую трагедыю, пакуты творчасьці ці пра злачынства — чаму яно зьдзейснена? Я нават пра асэнізатара прачытаю, калі, вядома, напісана пра чалавечае жыцьцё». Падзел пісьменьнікаў на вайсковых і ўсялякіх іншых мне незразумелы. Ён ня толькі ўмоўны, але і, па-мойму, шкодны, як любая надуманасьць і штучнасьць. А добры танк — гэта добра. Але ўсё ж добры трактар — лепш». Скончыў Валодзя цытатай з Паскаля, што чалавеку цікавы толькі чалавек. І дадаў: «А пісьменьніку — тым больш».

Спалучэньне, вядома, рэдкае, каб Бог даў усяго столькі і ў такой гармоніі… Можа быць, «Каласы…», «Хрыста…» і тую ж акварэльную «Чазенію» мог напісаць і іншы чалавек. Можа. Але тады, мне так здаецца, гэта былі б «хронікі» і мэлядрамы — там не было б душы, сэрца, крыві, жарсьцяў Караткевіча, сьмеху яго і ягонага болю, і каб усё гэта, як ён умее, успрымалася намі як сваё… І калі б ня ён, то і не расплюшчыліся б шырока вочы тысяч людзей і не было б захопленатрагічнага выдыху: «Дык вось мы хто — беларусы! Дык вось адкуль! І вось куды нам трэба ісьці!..»

Разглядаючы яго ўнікальную бібліятэку, я ня ў першы раз зьвярнуў увагу на «імянную» паліцу мэтры са два ў шырыню, на якой стаялі Валодзевы кнігі на мовах народаў СССР і Эўропы. «Нішто сабе…» — сказалася ўслых. У адказ пачуў: «Паглядзі лепш сюды. Бачыш гэты фатаздымак? Гэта я. (Малады, прыгожы, белазубы Валодзя глядзеў на сьвет сьветлымі вачыма і ўсьміхаўся. Увесь такі праменісты! — **Аўт.**) Вось такім я быў, калі пісаў «Замак…» А цяпер на мяне зірні. Бачыш? Куды ўсё падзелася? Вось у гэтыя кнігі, якія ты разглядаеш. Усё туды сышло. Я ж стаў развалінай… А быў здаровым і прыгожым… Так што не зайздросьць…» Каб пераламіць тэму гутаркі — цяжка было бачыць яго такім, — спытаў: «Калі ж, выходзіць, напісаў «Замак…»?» — «А ў 19 гадоў на сенавале ў дзядзькі ў Рагачове на летніх вакацыях, на трэцім курсе. За тры тыдні напісаў». Па маім выглядзе зразумеў, што я ня веру. Сьмяецца цяпер ужо весела, раскаціста, закінуўшы галаў. Спадабалася, што ўразіў. Любіў перамагаць. У адзін момант стаў ізноў тым Караткевічам, якога я звык бачыць: сьветлым, жыцьцярадасным. Такім ён мне часьцей за ўсё і прыгадваецца.

## Хочаш сотню?

Дробязь гэта, дробязь. Тым больш што вядзецца пра грошы. Іду па Ленінскім праспэкце і на мосьце цераз Сьвіслач сустракаю Караткевіча. Вясёлы, рукі шырока раскінуў, абняліся. Мне заўсёды радасна сустрэць яго: такая адкрытасьць і сьветліня былі ў ягонай усьмешцы, жэстах… «Слухай, я тут ганарар з УААПу атрымаў: «Каласы…» ў Чэхаславакіі выйшлі. Дык, можа, табе грошы патрэбны? Сотню магу. (Мой месячны аклад быў сто рублёў. — **Аўт.**) Бяры сёньня — заўтра ня будзе. Раздам!» — «А колькі табе заплацілі?» — «Дзесьці чатыры сотні». — «Колькі?!» — «А ты думаў? Піраты. Я ж ня з кніг жыву, а з кіно».

Вось так яму плацілі за эпахальную кнігу, за беларускую «Вайну і мір».

Прачытаў у кнізе старога «Нёману» ўспаміны Барадуліна — нібыта зноў праседзеў з Валодзем… Барадулінскі загаловак — «І коскі зь месца не скрану…». «Гэта ня фраза на публіку і не афарызм. Гэта штрых да аблічча вялікага творцы, які сабой працягнуў векавы шлях беларускай думкі, беларускага слова, беларускага роду», — так пісаў Барадулін пра сябра свайго. А мне прыгадаўся выпадак. Можа быць, недзе на пачатку 70-х гэта было. З рэдакцыі прозы «Мастацкай літаратуры» дзьверы адчыніліся, як выстралілі. Шырока і рэзка выйшаў Караткевіч. Твар белы, вочы шалёныя… Маўчыць. Прайшлі на лесьвічную пляцоўку, запалілі. Пасьля пары зацяжак сказаў: «Прымушае радок прыбраць… А то не падпіша…» (Ня памятаю, пра якую Валодзеву працу вялося. Памятаю рэдактарку — Галіна Нужкова.) «Ну і прыбяры, — кажу. — Кніжка на кану. Што вырашае адзін радок?» — «Стары, кожны радок вырашае кніжку. Дай я табе толькі адно вуха іншым зраблю, а? І ты ўжо будзеш ня ты. А мы ж усе непаўторныя. Кніжка павінна выйсьці такой, якой я яе напісаў».

Канец гэтай гісторыі мне невядомы, калі думаю, што той радок застаўся на сваім месцы. Памятаю толькі белы твар Валодзі і сваю думку: «Хто каго правіць!» — і ягонае: кожны чалавек непаўторны.



Уладзімер Караткевіч любіў Беларусь напружанай і непаказной любоўю.



«Бачыш гэты фатаздымак? Вось такім я быў, калі пісаў «Замак...» А цяпер на мяне зірні. Куды ўсё падзелася? Вось у гэтыя кнігі... Так што не зайздросьць...»

Валодзя хварэў пасьля знаёмства з кепскай кнігай. Ён моршчыўся, як ад зубнога болю, і часта паўтараў: «У нас жа дзьве трацціны Саюзу пісьменьнікаў — не пісьменьнікі».

Чытаў шмат. Каля яго нельга было «праскочыць» нават у газэце. Пасьля нашага знаёмства мне стала цяжэй пісаць: імавернасьць таго, што ён прачытае, была вялікай. Ягоная прысутнасьць у літаратурным жыцьці Беларусі міжволі дысцыплінавала тых, хто пісаў.

## Караткевіч і Бог

Калі я пазнаёміўся з Валодзем, ён ужо быў вядомым празаікам. Я яго так і лічыў за гэтым ведамствам. Выпадкова і са зьдзіўленьнем даведаўся, што прымалі яго ў Саюз пісьменьнікаў як паэта. Прозу сваю ён мне дарыў, а да вершаў я спазьніўся. Аднойчы ён прачытаў мне такія вершы:

Край сагнуўся у сьпіне,
Край баіцца размовы,
Край згубіў сваю мову
І матчынай песьні напеў.
Нельга верыць у бога,
Калі ён такое дазволіў.
Цяжка верыць у люд свой,
Калі ён такое сьцярпеў.

Чыталася гэта на пачатку 60-х. Агаломшаны, спытаў: «Хто гэта напісаў?» — «Я, стары, я…» — «Як жа ж цябе ў Саюз прынялі?» — «Памыліліся. Цяпер шкадуюць, але позна». Даведаўся: Валодзя пісаў гэта ў дваццаць восем. Як тут не задацца пытаньнем: ці можна палюбіць свой народ і сваю зямлю больш, чым паэт, які напісаў такія радкі?! Слова, створанае Богам, «паўстала» супраць самога Бога!.. Ён не пабаяўся самога Творцы, бо жыў паводле ягоных законаў. Ці ж яму было баяцца зямнога начальства!

Бясстрашнасьць Караткевіча-чалавека не магла ня стаць бясстрашнасьцю Караткевіча-пісьменьніка. А мог жа ён стаць поўным улюбёнцам улады. Ня раз прапаноўвалася. Усё, што трэба было, — пасіўна прыняць і быць нэўтральным. І — жыцьцё безь берагоў (якраз пад ягоны характар!). Але — у іншай кампаніі. Ён сьвядома не падаў уладзе рукі і адным зь нешматлікіх пісьменьнікаў цалкам выканаў сваё наканаваньне на зямлі: літаратура была для яго ня толькі спосабам самавыяўленьня і вобразнага мысьленьня і нават ня споведзьдзю. Яна стала ягоным служэньнем Беларусі.

І ўсе гэтыя высокія словы ня толькі словы, калі яны пра яго, пра Ўладзімера Караткевіча.

Скончылася жыцьцё Валодзі — пачалося жыцьцё Ўладзімера Караткевіча. І тут стала відавочным: дзякуючы таму, што жыў ён у нашым сьвеце, нам было цяплей і сьвятлей.

Мой сусед па менскім доме, навуковец-фальклярыст, найтанчэйшы знаўца беларускай мовы і літаратуры Яўген Адамовіч у адно зь сядзеньняў на ягонай гасьціннай кухні сказаў: «Ёсьць пісьменьнікі, літаратурная гісторыя якіх зь іх сыходам скончаецца. Ёсьць такія, значэньне якіх слабне і паступова сыходзіць на нішто. Караткевіч з часам толькі набірацць будзе. Пакуль яшчэ ён і на малую частку не ацэнены. Ён яшчэ, як добрае віно, ня выстаяў сваіх гадоў».

**Брэмэн (Нямеччына)**

ЛЕВЫМ ВОКАМ

# Сам ты сасуд!



Фальсыфікацый выбараў ня трэба. Дваццаць пяты кадар выступу прэзыдэнта забясьпечвае яму масавую падтрымку і, як вынік, чарговую элегантную перамогу.

Каму як, а мне з маналёгу Яго Вялікасьці ад 7 верасьня больш за іншае запала ў памяць асацыяцыя краіны з сасудам: «Я ўсе гэтыя гады ашчадна і з хваляваньнем нясу перад сабой на сваіх руках гэты сьветлы хрустальны сасуд, імя якому Беларусь. Нясу, баючыся яго ўпусьціць, таму што вельмі ўжо ён крохкі і ўразьлівы».

Запала таму, што ніхто ў гісторыі, наколькі, прынамсі, я ведаю, не параўноўваў сваёй краіны з сасудам. Увогуле з посудам — начнымі гаршкамі, піўнымі куфлямі, газоннымі вазамі, плястыкавымі бутэлькамі і г.д.

Гістарычна склалася, што візуальны шэраг нацыянальных брэндаў вельмі прымітыўны — жывёла (сымбаль мужнасьці), дзяўчына (эратызм і прыгажосьць), маці або бацька (традыцыя і род), прадукт галоўнай галіны гаспадаркі (крыніца выжываньня).

Адпаведна, у Беларусі гэты гербарый выглядае наступным чынам: зубр, сінявокая Алеся, партызанская мадонна і бульба.

І раптам — сасуд. Пры гэтым відавочна, што сасудная тэма не была імправізацыяй накшталт «перапраху парлямэнту». Працуючы над тэкстам бацькаўскага прагону, сьпічмэйкер наўмысна ўключыў яе ў тэкст. Наўмысна, таму што яго прафэсійнай задачай — як усякага піяршчыка — было пазыцыянаваньне кліента ў станоўчым сьвятле шляхам стварэньня сымбалічнай сувязі з пазытыўнымі рэчамі і зьявамі.

Чаму ў такім разе ня зубр, ня бульба, а сасуд?

Адказ на гэтае пытаньне лёгка атрымаць, правёўшы над сабой экспэрымэнт. Якую першасную рэакцыю выклікаюць у вас словы «сасуд», «несьці», «уразьлівы»? Магчыма, я памыляюся, аднак мяркую, што шмат у каго акт транспартаваньня ў руках уразьлівага прадукту са шкла выклікае ў памяці толькі адзін момант жыцьця. Момант, калі мы нясём дахаты запаветнія паўлітра. Кожны, каму выпадала разьбіць па дарозе дарагую бутэльку, можа сапраўды адчуць адказнасьць гэтага працэсу.

Асоба чалавека, які здольны ашчадна і з хваляваньнем, ды яшчэ нягледзячы на хцівыя позіркі, прынесьці флякон, адразу выклікае прыліў павагі. Інстынктыўна хочацца даверыць яму нешта большае за пару тон (сярэдні кошт чарніла).

Ні ў якім разе не сьцьвярджаю, што тут і была ідэфікс дзяржаўных піяршыкаў. Але што да мяне, то, прызнаюся, сапраўды, тэма сасуда торкнула. Ня можна не прызнаць таленту яе аўтара і веданьня ім штодзённасьці. Вось такія таленты б апазыцыі!

Між тым, такія якасьці, як крохкасьць і ўразьлівасьць, перададзеныя бацькам праз гештальт сасуда, паступова робіцца галоўным брэндам беларусаў. Мы ўсе — сасуды!

**Лёлік Ушкін**

## Майстэрня straw-дызайну

**запрашае на заняткі**
дзяцей, падлеткаў, моладзь.
**У праграме:**
1) клясычнае **саломапляценьне**;
2) «экспэрымэнтальнае» (**ляндшафтныя формы, сцэнаграфія**);
3) **маляваньне** (на тканіне, на шкле).
Расклад: пн.: 14.00—20.00; пт.: 14.00—20.00; сб: 12.00—18.00.
Адрас: вул.Кірава, 14, аўд. 308.
Т.: 250-98-67, 690-98-67.

## 17–20 верасьня

**запрашаем у вандроўку**

**«Золота Підкова Львоўшчыны»**

Менск—Жоўква—Крэхіў—Львоў—Алеск—Падгорцы—Золачыў—Сьвірж—Менск
Кошт вандроўкі: для дарослых 45 у.а. + 15 000 руб., для школьнікаў і студэнтаў — 40 у.а. + 15000 руб.
Кошт уключае: праезд аўтобусам, начоўку ў гатэлі «Львоў», экскурсійнае абслугоўваньне без уваходных квіткоў (квіткі ў замкі каштуюць 0,1—0,5 у.а.).
Неабходныя дакумэнты: пашпарт, для непаўналетніх — натарыяльна пацьверджаны дазвол на выезд за мяжу ад абаіх бацькоў.
Т.: 8-029-755-03-70, 222-88-76



## 19 верасьня

**запрашаем у вандроўку**

**«Аўгустоўскі канал»**

**Наўмовічы:** фартыфікацыйнае збудаваньне часоў I і II сусьветных войнаў, помнік ахвярам II сусьветнай вайны;
**Сьвяцак:** палацава-паркавы комплекс XVIII ст. магнатаў Валовічаў;
**Сапоцкін:** касьцёл Язафата Кунцэвіча, мясцовыя могілкі з капліцамі-пахаваньнямі XIX ст., пахаваньні польскіх жаўнераў 1919 і 1939 г.;
**Сонічы:** крыж загінулым паўстанцам 1863 г., помнік воінам-памежнікам заставы Сівачова;
**Нямнова** — адзіны на канале трохмерны шлюз.
Кошт вандроўкі: 25000 рублёў.
Т.: 222-88-76, 551-30-75

**Запрашаем на падарожжы**
**19 верасьня** (нядзеля) па маршруце:
**Менск—Беніца—Крэва—Баруны—Гальшаны—Вішнева—Дзясятнікі—Валожын—Менск.**
**26 верасьня:**
**Ішкалдзь—Вольна—Паланэчка—Сталовічы—Завосьсе—Новая Мыш—Крошын.**
Т.: 232-54-58, 622-57-20 (Зьміцер)
264-12-38, 776-24-35 (Павал)




АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## 26 верасьня запрашаем у вандроўку

**«Таямнічая Поўнач»**



**Будслаў:** касьцёл XVI—XVIII ст. з абразом Маці Божай;
**Глыбокае:** царква і касьцёл, краязнаўчы музэй, старыя могілкі з калёнаю, дэндра-парк;
**Удзела:** касьцёл XVIII ст, музычная фэерыя;
**Мосар:** касьцёл XVIII ст., батанічны сад духоўнасьці, кальварыя на могілках.
Кошт вандроўкі — 25000 рублёў.
Т.: 222-88-76, 551-30-75

«Наша Ніва» дзякуе Ўладзімеру Аніскевічу (Баранавічы), Пятрусю Баравіку (Навалуком'е), Юшкевічу П., спадару N, спадару N (усе зь Віцебску), Аўгену Філіповічу (Бабруйск), Алене Каранчук, Анатолю Васілеўскаму зь Менску за ўчасную дапамогу. Лазовік Сяргей падпісаў на «Нашу Ніву» 14 чалавек. І яму вялікі дзякуй!

## НЯ РЭЖЦЕ ГАЗЭТУ!

Увага! Цяпер прыватную абвестку ў «НН» (ня больш за 15 словаў) можна падаць звычайным лістом (а/с 537, 220050, Менск), а таксама электроннай поштай на адрас nn@promedia.by або разьмясьціўшы на форуме сайту www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### СЫНХРОННАЕ ПЛАВАНЬНЕ

**Дзіцячая спартовая школа** алімпійскага рэзэрву па сынхронным плаваньні запрашае дзяўчынак 6—9 гадоў у групы русалачак-алімпійскіх. Трэнэрка спн.Юля Санфірава. Т.: 236-80-14. Тэлефанаваць ранкам з 8 да 10, увечары з 20 да 22

### ЮРЫСТАМ І ПАЛІТОЛЯГАМ

**Рэдакцыя он-лайн-часопісу** юрыстаў і палітолягаў «Праўнік» прымае да публікацыі тэксты зь юрыдычнай аналітыкі, паліталёгіі і сумежных дысцыплін (мовы — беларуская, ангельская). Запрашаем да супрацы ўсіх ахвотных! Электронны адрас: praunik@yahoo.com. Т.: 8-029-626-82-69 (Тацяна), 8-029-678-33-38 (Уладзь), 8-029-793-01-05 (Марына)

### КАШУЛІ

**Шыем, вышываем кашулі**: паўсядзенныя, сьвяточныя, жаночыя, мужчынскія. Т.: 8-029-606-38-11 (Уліта), 8-029-748-61-41 (Росіца)

### ЛЁС

**Спадарства**, калі вы прачыталі выпісаную альбо набытую вамі газэту, то не выкідайце яе ў сьметніцу. Вазьміце з сабой у дарогу і пакіньце ў грамадзкім транспарце, быццам бы забылі. Можа, гэта дапаможа камусьці. Зоран

### ВІТАНЬНІ

**Вельмі ўдзячны** за маральную, матэрыяльную ці фізычную дапамогу Ўладзімеру Арлову, сп.Ігару і сп.Алесю зь Менску, Андрусю Мельнікаву, Юрку Копціку, Ягораву Алесю, Фонду Філона Кміты, радыё «Свабода», а таксама ЎСІМ удзельнікам Аршанскага фэсту 2004. Беларус з-пад Воршы

**Ліду, Вадзіма й Адама Карцавых** віншуем з нараджэньнем дачкі і сястрычкі Паўлінкі! Сябры

**Вітаю Рому Цыбульскага** зь менскага skarb'у! Пайшлі на кіпелава! Ці толькі sky-punk? Хімік з Бабруйску

**Пані Жанну** віншуем з пачаткам выкладаў ва ўнівэрсытэце. Трываньня ў мітускі з дасьціпнасьцю! Вашы дзеткі: БУ, па-Ганка, Ляксандзяр і Мары

**Vinšuju redakcyju** sa Śviatam! Chaj žyvie Biełaruś i Biełaruski! Tady nie źviaducca i Biełarusy. Vinšuju Biełarusaŭ ź Śviatam Biełaruskaj Vajskovaj Sławy. Budźma Abaroncami, ale nie hledačami! Uład

### КАНТАКТЫ

**Просты малады** чалавек 31/165 пазнаёміцца з добрай беларусачкай (ліцьвінкай) 25—33 год. Т.: 271-32-94. Зьміцер

**Зьбіраем** усіх прыхільнікаў кожны чацьвер каля Купалаўскага тэатру ў 19.00. Змагайся за Беларусь! Т.: 755-69-90, 708-02-99

**Уладзь Гарбацкі**, атрымаў Ваш ліст. Чакаю тэлефанаваньня. Т.: 254-58-00. Аляксей

**18 верасьня** а 12.00 у рамках адкрыцьця пункту беларускай музыкі пры клюбе філяфаністаў у ДК МТЗ (ст.м. «Трактарны завод») адбудзецца сустрэча зь Пітам Паўлавым. Штосуботу з 11.00 да 15.00 — знаёмствы з аднадумцамі, музычныя навінкі, прадукцыя па самых нізкіх цэнах, квіткі на канцэрты

**Ствараецца фан-клюб** беларускай музыкі. Шукаем прыватных распаўсюднікаў беларускай музыкі. Далучайся: т. — 649-08-88, 766-24-25, 400-67-74; электронны адрас — w1979@tut.by; вэб-старонка — www.bma.home.by

**Пачалося галасаваньне** — адбор удзельнікаў на складанку цяжкай музыкі «Hard Life — Heavy Music-3»: www.bma.tam.by

### КНІГІ, МУЗЫКА

**Кнігі — поштай.** Замаўляйце каталёг: поштай — а/с 333, 220050, Менск; электронны адрас — exlibris@tut.by; вэб-старонка — http://knihi.net. Т.: 8-029-643-57-33

**Кнігі — поштай. Новае**: Арнольд Макмілін «Літаратура беларускай дыяспары», Васіль Іванішын «Жрацы імпрэзы», Сяржук Сокалаў-Воюш «Крывавы памол». Т.: 8-029-643-57-33, exlibris@tut.by

**Кнігі — поштай. Новыя CD**: «Камэлёт» — «У Краіне Талераў», «Indiga» — «Dni», «Госьціца» — «Пералёт-трава», «Zet» — «З Новым годам!», «Троіца» — «Сем», «Троіца» — «Журавы». Т.: 8-029-643-57-33, exlibris@tut.by

**Куплю** Беларускую энцыклапэдыю, тт. 1—3, 6, 7. Алесь. Т.: 613-70-85

**Шукаю кнігі** на польскай мове (гісторыя, мастацкая літаратура, крыміналы). Т.: 243-98-10. Натальля

**Беларускі кнігазбор**. Часлаў Пяткевіч «Рэчыцкае Палесьсе» — 29-я кніга праекту. 672 старонкі. Больш за 200 ілюстрацый. Упершыню на беларускай мове. Ужо ў продажы

**Сяржук Сокалаў-Воюш**. «Крывавы памол». Трылер. Першая кніга прозы слыннага беларускага барда пад рэдакцыяй Вінцука Вячоркі выйшла ў «Беларускім кнігазборы»

**Прадам** кнігі: В.Ластоўскі «Творы» («Беларускі кнігазбор»), А.Смоліч «Геаграфія Беларусі» (факсымільнае выданьне), энцыклапэдыя гісторыі Беларусі (т. 4, 5), энцыклапэдыя этнаграфіі Беларусі і інш. Т.: 236-02-15

**Прадам** кнігі: «Старабеларускі лексыкон», аўт. М.Прыгодзіч, збор твораў В.Быкава ў 6 тамах, кнігі па беларускім народным танцы, творы Б.Тарашкевіча, Замоціна, Каратынскага і інш., БНТ. Т.: 236-02-15

**Энцыклапэдыі** па гісторыі, археалёгіі ды нумізматыцы Беларусі, лексычны атляс беларускіх народных гаворак, даведнік «Мысьліцелі і асьветнікі Беларусі», «Анталёгія сучаснага беларускага мысьленьня», іншыя кнігі, слоўнікі, а таксама відэа, аўдыё-CD, календары, майкі з «Пагоняй» на сядзібе ТБМ (Румянцава, 13). Панядзелак — пятніца (12.30—18.30). Т.: 8-029-707-40-01

«**Нацыяналізм у XX ст**.», «Уводзіны ў палітыку», «Уводзіны ў псыхалінгвстыку», «Выбух камунікацыяў», «Дапаможнік для журналістаў...», «Русіфікацыя беларускай мовы...», іншыя кнігі, відэа, аўдыё, CD (у т.л. «Песьняры»), майкі з нацыянальнай сымболікай на сядзібе ТБМ (Румянцава, 13). Панядзелак — пятніца (12.30 — 18.30). Т.: 8-029-707-40-01

**Прадаю квіткі на канцэрты**: 1.10. Л.Вольскі запрашае: «Крамбамбуля», «Рэактар»; 7.10. Канцэрт К.Камоцкай і В.Кораня, Дом літаратара; 22.10. «Нэйра Дзюбель» — 15 гадоў; 13.11. «Ulis» —15 гадоў. Спэц. госьць — «Троіца». К/з Мінск. Даведкі, замовы квіткоў, дыскаў зь беларускай музыкай: т. 649-08-88, 766-24-25, 400-67-74, w1979@tut.by, www.BMA.home.by

### ПРАЦА

**Ангельская і швэдзкая мовы** зь беларускамоўнай рэпэтытаркай! Вопыт выкладаньня, замежныя стажаваньні. Т.: 202-97-20. Наста

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры і мове. Зьвяртацца загадзя пасьля 17.00. Т.: 235-18-72. Юры

### ЛІЧЫЦЬ НЕСАПРАЎДНЫМІ

Дыплёмы Шапавалавай В.Б. аб заканчэньні юрыдычнага тэхнікуму, Акадэміі кіраваньня лічыць несапраўднымі

**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| фота-рэдактар | Арцём Лява |
| карэктарка | Галіна Рабянкова |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| тэхнічны рэдактар | Андрэй Чык |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.
Наклад 3392. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 21.00 15.09.2004.
Замова № 5698.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а